Лишь в выходные дни город оживает благодаря концертам: вокзал наполняется толпами приезжих: *В Павловск, как в некий Элизий, стремился весь Петербург*, – вспоминает поэт[26]. Олицетворением жизни города и страны становится для Мандельштама Павловский вокзал: *Смена дирижёров за высоким пультом [...] казалась мне сменой династий*[27]. Один из музыкальных критиков той эпохи образно выразился, что смена дирижеров напоминает приношение в жертву кумиру – павловской публике – тельцов, чтобы этот кумир был благосклоннее. В воскресные дни весь вокзал оживляется свистками паровозов, железнодорожными звонками, сливающимися со звуками торжественной увертюры. В тексте стирается иерархия между звуками божественными, космическими и хаотическими, профаническими, природными, земными, и искусственными, летящими с небес.

В знаменитом *Концерте на вокзале* запечатлён иной облик Павловска[28]. Прежде всего, поэтический текст воспроизводит мир гораздо более трагично, чем прозаический. Здесь уже нет надежды на смену веков: «последний раз нам музыка звучит». Поэт оплакивает безвозвратно ушедшее прошлое, которое воплощает мир культуры, в данном случае – стихия музыки, вне которой Мандельштам не мыслил ни жизни, ни творчества. Начальные строки стихотворения кажутся вписанными в уже знакомый читателю образ города: вводится концепт «духоты», «темноты» и «немоты». Огромное пространство стеклянного вокзала – музыкальная бездна – наполняется летящей с небес музыкой, разрывается звуками, которые кажутся «запредельными», и посему, несущими гармонию. Музыка, обретшая плоть, уносит ввысь, кажется, что ещё миг, и она преобразится в «музыку сфер», порождая жизнетворящую энергию. Однако, звуки музыки, доносящиеся с высот, долетая до земли, оказываясь в буднично-прозаическом мире, утрачивают свою «небесную» сущность. Вместе с ними «я» из дневного мира города с его аполлоническими звучаниями, переносится в мир ночной, природный с его дисгармоничными, хаотическими звуками[29]. Навязчиво повторяемые эпитеты «скрипичный», «стеклянный» заставляют

---

[26] О. Мандельштам, *Шум времени*, (в:) *Миры*, Тула 1994, т. 2, с. 7.

[27] Там же.

[28] Не ставя своей задачей интерпретацию текста, уже проанализированного лучшими исследователями творчества поэта, кратко отметим лишь интересующий нас аспект.

[29] Здесь нельзя не отметить, кажется, ещё никем из исследователей не подмеченной отсылки к тексту *Северной Симфонии* А. Белого: мотивы сна-бреда, шара, горячего пара, испарений.

задуматься о холоде, скрипе и хаосе[30]. Этой музыке, её ночной стихии, не суждено ни утешить, ни спасти, ни исцелить.

Не менее известный текст Ахматовой (*«Всё мне видится Павловск холмистый...»*[31]) после текста Мандельштама кажется связанным совсем с иной сферой – миром гармонии и совершенства, правда, оказывающихся лишь мнимыми[32]. Сама лирическая героиня попадает в пространство Павловска, перейдя некую границу, не столько реальную («ворота чугунные»), сколько внутреннюю, настроившись на определённую волну, предавшись воспоминаниям. Вначале в памяти возникают визуальные образы, воссоздающие облик Павловска как единственного и лучшего, никогда не забываемого места. Именно поэтому здесь «не живёшь, а ликуешь и бредишь», т.е. пребываешь в высшем измерении, за гранью повседневного, в которое можно перенестись посредством воображения, сна, бреда, воспоминаний[33]. Это онейрическое пространство, с его «сублимированной атмосферой», одушевляемое звуками «милого голоса». Именно этот гипнотический голос воплощает в тексте гармоническое, творческое начало. Адресат, будучи поэтом, «высвобождает» слово, наделяя его своим голосом[34]. Учитывая личность адресата стихотворения – В. Недоброво – можно в контексте всего корпуса текстов, обращённых к нему, говорить и о концепте «любовного молчания», невысказанных слов.

Как и Мандельштам, автор *Поэмы без героя* запечатлела Павловск и в стихах, и в прозе, правда, со свойственным ей лаконизмом. У обоих

---

[30] А. Пурин, *Превращение бабочки. О русской поэзии XX века*. http://wwwnewkamera.de/purin/purin_o_08.html.

[31] Текст Ахматовой написан раньше – осенью 1915 года, и его следовало бы рассмотреть перед *Концертом на вокзале*, но в данной статье в силу логики развития мысли хронология нарушена.

[32] Типично «павловское» настроение передают образы «неживой воды» и густых «чёрных ёлок». Об этом же вспоминает А. Бенуа, отмечая двойственность облика Павловска: особенно в сумерки здесь испытываешь «смешанные чувства», то охватывает мрачное настроение, то радуют уютность и приветливость места. «Эта кошмарная жуть, этот сказочный ужас особенно манили и пленили меня». См.: А. Бенуа, *Жизнь художника. Книга 1. Царское Село и Павловск*. http://www.ipmce.su/~tsvet/WIN/silverage/painter/benua/zhud103.html.

[33] Е. Фарино, *Семантические аспекты поэзии о живописи*, «Russian Literature» VII–I. Amsterdam 1979, p. 72–73.

[34] Ср. в *Поэме без героя* «лирическое отступление», обращённое к Недоброво:

Разве ты мне не скажешь снова
Победившее смерть слово
И разгадку жизни моей?

См.: А. Ахматова, *Сочинения*, т. 2, с. 287.

поэтов образ города связан с миром детства, который всплывает в памяти: «Весной и осенью в Павловске на музыке – Вокзал...»[35]. Однако воспоминания их разные. Ахматова нередко основывает свои наблюдения на сопоставлении, в данном случае – с Царским Селом, которое «всегда будни, потому что дома, а Павловск – всегда праздник, потому, что надо куда-то ехать, потому что далеко от дома»[36]. Так напишет Ахматова в автобиографических заметках много лет спустя. Даже запахи города припоминаются поэтам разные: у Ахматовой «прохлада в духоте» – это резеда и розы, причём первой названа именно бесхитростная, похожая на траву, резеда. К ним примешивается аромат земляники, особой – «павловской», и запахи вокзала: «дыма от допотопного паровозика» и сигары, и для равновесия (совсем женское наблюдение) «запах жирной пищи из ресторана», явно резкий, отталкивающий.

Именно одновременное воскрешение в памяти «немых» чувств-восприятий вызывают у поэта ассоциации с этим незабываемым местом[37]. Ахматова помнила эти запахи всю жизнь, именно они ассоциировались для неё с атмосферой Павловска.

Прежде всего визуально запечатлён лик города у младшего современника Ахматовой и Мандельштама – Г. Иванова в стихотворении *Павловск*. Автор сразу вводит читателя в наэлектризованную атмосферу железнодорожной станции, где сливаются мир рафинированной культуры (мир музыки) и будничный мир суеты, толкотни перронов и вокзала. От их излишнего шума и блеска уходит лирический субъект в таинственный старинный парк, данный как некое призрачное, зыбкое видение, где предметы теряют свои очертания и конкретность. Это характерный для поэта живописный «старомодный пейзаж». Томные позы, поцелуи, беседки, а главное – сочетание любования и иронии, скрытые за безмятежностью, выдают влияние картин К. Сомова. Текст Г. Иванова кажется вторичным, а сам поэт лишь «жадно любящим» то, что любили до него, по его собственному признанию. Горечь, прозрение, ощущение беспомощности искусства, музыки, того,

---

[35] Одно из первых воспоминаний поэта, по её свидетельству, именно павловское. См.: А. Ахматова, *Автобиографическая проза*, с. 242.

[36] А. Ахматова, *Автобиографическая проза...*, с. 242.

[37] Отмеченная Б. Кац и Р. Тименчик устойчивая и, кажется, только у автора *Поэмы без героя*, встречающаяся связь запахов именно с музыкальными впечатлениями, как видим, присуща и Мандельштаму. См.: Б. Кац, Р. Тименчик, *Анна Ахматова и музыка*, Ленинград 1989, с. 175.

«что жизнь» его «сожгла» – всё это было у Иванова впереди. А пока весь его мир кажется эфемерным, декоративным. Это «видимость гармонии», и стремление поэта сохранить её также безнадёжно, как у Мандельштама попытка лирического «я» догнать ушедший из Павловска поезд. И здесь всё дано в «последний раз» – природа, жизнь, страдания, любовь[38].

Подобно Иванову, «тайный парнасец» Б. Лившиц озаглавил своё стихотворение, как отметил М. Гаспаров, словно в путеводителе – *Павловск*. В заглавии разгадка – название объекта, вводящее в реальный план, а под ним загадка – ассоциативный план, в котором возникает образ неназванного прямо первого владельца резиденции – императора Павла. Здесь, как и в *Петербургском цикле*, есть и поэтический индекс места – знаменитый ампирный *Розовый павильон* (*le Pavillion des roses*), где оплакивают убитого «паладина». Он вызывает ассоциации с античными *rosalia*, во время которого могилы украшались розами (отсюда значение цветка как символа похорон и смерти). Павловск всегда был местом воспоминаний, мемориальным заповедным уголком, *par exellence*, отмечает А. Эфрон[39]. Он освящен памятью о том, чьё имя носит город и вокзал. Центральное место занимает в тексте масонская символика, связанная с образом императора-масона: угольник – символ закона и совести, мальтийская звезда – охранный знак, узел – знак единения, корона – у масонов – символ просветления. В этом контексте и павильон, окружённый кустами редких кустов роз, – явная отсылка к масонству, мистический план которого был очевиден в эпоху символизма: посвящение в масонскую степень Розы и Креста происходило в комнате, стены которой покрывали серебряные слёзы. Этот единственный в тексте конкретный памятник Павловска переводит его в иной аспект и придаёт ему, казалось бы, совершенно не связанному с традиционной для резиденции музыкальной тематикой, характерный аккорд: Розовый павильон славился своими необычными эоловыми арфами, установленными после смерти императора, и издававшими мелодические, неземные звуки, когда ветер пробегал по их струнам (природа здесь гармонировала с культурой). Намёк на литературный образ Эоловой арфы содержал одновременно отсылку и к реальной садово-парковой традиции и к оссеаническому мотиву европейской ро-

[38] L. Allain, *«Сады» и «Розы» Георгия Иванова*, «Slavia Orientalis», 1998, tom XLVII, № 2, s. 199.

[39] А. Эфрон, *Мастера разных эпох. Избранные историко-художественные и критические статьи*, Москва 1979, с. 70.

мантической литературы[40]. В ней нашло отражение поверье о вещей арфе, струн которой касается не то ветер, не то пролетающая тень, сообщая живым о смерти. Звук её – «словно надгробная песнь». Арфы, безмолвствующие в пору написания стихотворения, ассоциировались опять-таки с покинувшей этот мир музыкой и темой расставания с ней поэта.

Тема кризиса культуры прослеживается и в стихотворении М. Кузмина *Конец второго тома* 1922 года. Вводится она в том числе и посредством параллели между двумя эпохами – рубежами веков (XVIII и XIX, XIX и XX). Как регулярный парк сменяется пейзажным, пейзажный – парком эпохи модерна, так Павловск-Элизиум, «золотой век» вытесняется образами «железного века», «конца света». Единственными воспроизведёнными звуками в тексте являются звуки, явно сниженные, профанные: ругань и рокот труб в казармах на рассвете, как знак побудки. К ним добавляются какие-то неясные «голоса», слова, звучащие как магическое заклинание, *подражание санскриту*, по предположению В. Топорова, напоминающие абракадабру («Ашанта бутра первенец Первантра»), которые «я» не понимает. Несмотря на усложнённый характер текста Кузмина, в нём можно выделить и образ Павловска, который является тем пространством, где «я» читает книгу, которая, как и сам парк, навеивает грезы и небылицы.

А. Пурин, видевший в тексте Кузмина намёк на предвоенное предапокалиптическое лето 1914 года, строит свой «павловский» цикл на «тематическо-мотивных литературных цитатах» из текстов[41], обращённых к интересующему нас локусу. Павловск кажется картинным, излишне счастливым и искусственным видением в духе К. Лоррена[42]. Это – условная мечта, неправдивая, выявляющая свою сущность в сопоставлении с Царским Селом. Образ Павловска строится на отрицании: «рифмы к нему не липнут», «здесь нет никаких отсылок», в нём нет того, что есть в соседнем месте. Поэтому резиденция Павла кажется «неподлинной», восприятие её излишне литературно, цитатно. Это театр на природе, отдалённо напоминающий о концертах на вокзале, балетах смолянок:

---

[40] В тексте Лившица возникают, таким образом, переклички, прежде всего, со знаменитой балладой Жуковского *Эолова арфа*.

[41] D. Oraić Tolić, *Авангард и постмодерн*, «Russsian Literature», North-Holland, XXXVI (1994), r. 104.

[42] Это отсылка не столько к картинам самого Лоррена, сколько к рецепции их в текстах Ф. Достоевского, цитатная полемика с романом *Идиот*.

Да, такова декорация: парк, вокзал, паровозные свистки, скрипки[43].

Текст – это цепочка метаморфоз: медь осени сменяется слепящим снегом, статуя оборачивается музой, муза – снежинкой-неженкой. Отчасти Пурин использует тот же принцип, что и Кузмин – «монтажа отрывков», который позволяет не только передать динамическую смену впечатлений[44], но и дополнить визуальный континуум звуковым, подводящим к финальным строкам цикла: «Пока ты и видишь и слышишь, что хочешь шепчи – не умрёшь»[45].

Таким образом, поэты увидели и услышали звучащий Павловск, по-разному, создали свой, не менее значимый, чем реальный, его образ: идеализированную модель вселенной, избранное место или в противовес ему – эксцентрический локус, лежащий вне центров цивилизации, на краю земли. Музыкальный Вокзал в большинстве текстов принадлежит к узловым, пограничным местам, где сосредотачиваются культура и природа, отсюда «охранительная» позиция поэта. В противовес рафинированной столичной атмосфере он представляет собой некое «альтернативное пространство», где культура частично освобождалась от условностей, искусство нисходило с Олимпа, встречалось с «улицей». Общим для столь разных поэтов стала «транстекстуальность» (по выражению В.Тюпа), стремление к недостижимому синтезу культурных традиций, всегда открытому в бесконечность.

S T R E S Z C Z E N I E

W artykule podjęto próbę opisu wcześniej nie rozpatrywanego tematu semantyki dźwięku w literaturze XVIII–XX ww. Na przykładzie tekstów poświęconych Pawłowska ukazana jest tendencja zmierzająca od wizualizacji przedstawionego świata do jego udźwiękowienia (umuzykalnienia). Analizowane są utwory W. Żukowskiego, O. Mandelsztama, A. Achmatowej, G. Iwanowa i in.

[43] А. Пурин, Рецензия на книгу «*Форель разбала лёд? М. Кузмин. Стихотворения. Вступительная статья, составление, подготовка текста и примечания Н. А. Богомолова. (Новая библиотека поэта)*», Санкт-Петербург 1996, http://magazines.russ.ru/novyi_mi/1997/2/rezobs03.html.

[44] К примеру, въезд в ворота Павловска, вызывает не только завораживающую «волшебную дрожь», настороженность, но и страх.

[45] А. Пурин, «*Излишне картинный парк напоминает Лоррена...*». http://www.vavilon.ru/texts/prim/purin4-9.html.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Тамара Тарасава
Мінск

Экзістэнцыяльны кампанент беларускай аўтабіяграфічнай прозы (Алесь Адамовіч, "Vixi"; Максім Танк, "Дзённікі"; Сакрат Яновіч, "Не жаль пражытага")

На сённяшнім этапе гістарычнага развіцця ўзрастае роля аўтабіяграфічнай прозы як своеасаблівай *мікрамадэлі культуры* (Н. Ніколіна), якая фіксуе важныя этапы самарэалізацыі асобы. Вобраз жыццёвага шляху, дарогі да самога сябе, адкрыццё ўласнай індывідуальнасці аказваецца аднолькава важным і для дакументальных жанраў, і для мастацкіх тэкстаў.

Аўтабіяграфічная проза, па трапным выказванні Алеся Адамовіча, – гэта ўменне *ў сябе зазіраць, пытаць у сябе і сабе адказваць*[1], гэта *размова з уласным сэрцам*[2]. Біяграфічная проза *адлюстроўвае паслядоўнасць адкрыцця ўласнага "я" праз яго адносіны да другіх і да свету*[3]. Вобраз аўтара, роля асобасных кампанентаў яго культуры, працэс станаўлення ўнутранага свету мастака – цікавы аспект вывучэння індывідуальных своеасаблівасцей пісьменніцкага стылю, аўтарскай філасофіі, творчага патэнцыялу майстра слова.

Аўтабіяграфічны жанр прывабліваe чытача дакладнай інфармаванасцю аўтара аб падзеях, сведкам і ўдзельнікам якіх ён з'яўляецца, максімальнай яго зацікаўленасцю ў фіксацыі знешняга жыцця і асабліва ўнутранага светаадчування, сцвярджэннем сваёй праваты, сваіх

---

[1] Алесь Адамовіч, *Vixi. Тры апошнія аповесці*, Мінск 2002, с. 302.

[2] Там жа, с. 304.

[3] Н. А. Николина, *Поэтика русской автобиографической прозы*: Учебное пособие, Москва 2002, с. 9.

уласных ацэнак і вывадаў. Слушна заўважыў у свой час Мікалай Бердзяеў: *В познании о себе самом человек приобщается к тайнам, неведомым в отношении к другим... Личность человеческая более таинственна, чем мир. Она и есть целый мир. Человек–микрокосмос и заключает в себе все. Но актуализировано и оформлено в его личности лишь индивидуально-особенное*[4].

У аўтабіяграфічнай прозе мы бачым гісторыю індывідуальнага жыцця чалавека, асобы, мастака. Пісьменнік, па трапным выказванні французскага філолага Гюсдорфа, *ствараючы тэкст, ствараецца сам*[5]. Міхаіл Бахцін, распрацоўваючы тэму "Антычная біяграфія і аўтабіяграфія", пісаў, што аўтабіяграфічны тэкст – *это новое отношение к себе самому, к собственному "я", без свидетелей, без предоставления права голоса "третьему", кто бы он ни был. Самосознание одинокого человека ищет здесь опору и высшую судебную инстанцию в себе самом и непосредственно в идейной сфере – в философии*[6].

Аўтар успамінаў, мемуараў, дзённікаў выступае як творца вобраза ўласнага "я", прадстаўляе яго іншым і, як правіла, з'яўляецца станоўчым героем, што і вызначае аўтарытэтнасць яго ацэнак і меркаванняў. Спасціжэнне самога сябе, на думку Бердзяева, *есть творческий акт, совершаемый в мгновении настоящего. Ценность этого акта определяется тем, насколько он возвышается над временем, приобщается ко времени экзистенциальному, т(о) е(сть) к вечности*[7].

Працэс самапазнання не можа адбывацца па-за гістарычным часам. На фарміраванне вобраза ўласнага "я" ў гістарычным часе працуюць вобразы блізкіх да пісьменніка людзей: родзічаў, сяброў, калег па працы. Пісьменніцкая ацэнка гэтых асоб, а таксама гістарычных сітуацый, прачытаных кніг, твораў мастацтва з'яўляецца выразным сродкам самахарактарыстыкі, выяўляе індывідуальныя якасці асобы. Міхаіл Бахцін у трактаце "К философии поступка" пісаў: *Каждая мысль моя с ее содержанием есть индивидуально-ответственный поступок, один из поступков, из которых слагается вся моя единственная жизнь как сплошное поступление;* ***я поступаю всею своею жизнью, каждый отдельный акт и переживание есть момент моей жизни-поступления*** (падкрэслена М. Бах-

[4] Н. А. Бердяев, *Самопознание*, Москва 1991, с. 8.

[5] G. Gusdorf, *Conditions et limites de autoliografie* // Formen der Selbdarstellung, Berlin 1965, P. 13.

[6] М. М. Бахтин, *Эпос и роман*, Санкт-Петербург 2000, с. 73.

[7] Н. А. Бердяев, *Самопознание*, с. 8.

ціным)[8]. Такім чынам, самыя на першы погляд нязначныя пачуцці аўтара, удзел/неўдзел у нейкіх падзеях – гэта цэлая "*сістэма матываў*" (Бахцін).

Мэта аўтабіяграфічнага твора, якімі з'яўляюцца прапанаваныя для разгляду "Дзённікі" Максіма Танка, кнігі ўспамінаў Алеся Адамовіча "Vixi" (з лац. – "Пражыта") і Сакрата Яновіча "Не жаль пражытага", – аб'ектыўна расказаць пра свае сувязі са светам у іх шматаспектнасці, паказаць сябе як асобу, якая асвойвае свет, і як свет адаптуе яе да сябе. Безумоўна, гэты аспект праблемы цікавы для вывучэння, але тут хочацца разгледзець іншы ракурс даследавання аўтабіяграфічнай прозы – экзістэнцыяльны. Гэта значыць вызначыць маштаб і характар трансфармацыі ўнутранага "я" пісьменнікаў і прасачыць за працэсам іх самарэалізацыі ў свеце людзей.

Жанр дзённіка, бадай, самы інтымны жанр з усёй аўтабіяграфічнай прозы: споведзяў, хронік, мемуараў, аўтабіяграфій, запісак, успамінаў, якія ў той ці іншай ступені заўсёды скіраваны да чытача. У сучасных лінгвістычных даследаваннях (працах Н. Арцюнавай, Х. Лінка, У. Эка) існуе думка, што любы тэкст (мастацкі ці дакументальны) мае свайго *абстрактнага альбо імпліцытнага чытача*. Італьянскі філолаг У. Эка піша: *Текст есть не что иное, как семантико-прагматическая продукция своего образцового читателя*[9]. Таму нават такі інтымны жанр як дзённік *предполагает фактор адресата*, хай сабе і ўмоўнага, і гэта абавязвае мастака прытрымлівацца адпаведнага стылю і манеры аповяду.

"Дзённікі" Максіма Танка – гэта гісторыя станаўлення асобы мастака, гісторыя асабістага духоўнага жыцця, гэта дакумент аб сваёй эпосе і сваім часе. Менавіта Танкаўскае адчуванне непаўторнасці, самакаштоўнасці кожнага факта, падзеі, жыццёвай сітуацыі падштурхнула яго да напісання "Дзённікаў". У запісах за 1951 год чытаем: *Дзённік патрэбен мне для маёй працы. Гэта – не магільнік маіх думак і пачуццяў, куды рэдка заглядае і сам пісьменнік, гэта – шлях з верставымі слупамі-паказальнікамі*[10]. 1971 год: *Дзённік мой становіцца нястомным субяседнікам, якога магу разбудзіць у любы час ночы і працягваць бяседу – весці гэтыя хаатычныя запісы*[11]. І калі аўтар

[8] М. М. Бахтин, *К философии поступка*, (в:) *Философия и социология науки и техники. Ежегодник* 1984–1985, Москва 1986, с. 83.

[9] U. Eco, *The role of the reade*, London 1979, p. 3.

[10] Максім Танк, *Дзённік*, "Полымя" 1996, № 9, с. 186.

[11] Максім Танк, *Дзённік*, "Полымя" 1997, № 3, с. 160.

у дзённіку здольны мужна агаліць жахлівую праўду, то твор можа ператварыцца ў магутны дакумент свайго часу, накшталт “Confessions” Жан Жака Русо.

Назва запісаў “Дзённікі” мае як сэнсавую, так і жанравую скіраванасць. Гэта ў першую чаргу аповяд пра самога сябе, пра гісторыю індывідуальнага жыцця, гэта ідэнтычнасць аўтара і апавядальніка. У назве цалкам адсутнічае эмацыянальна-ацэначны кампанент, ён слаба выяўлены і ў запісах сталінска-брэжнеўскага часу. З сярэдзіны 80-х гадоў у “Дзённіках” Максіма Танка адчувальна ўзмацняецца ўвага да свайго ўнутранага жыцця. Побач са станоўчай самаацэнкай і часам нават з пэўнай ідэалізацыяй свайго “я” ў аўтабіяграфічным матэрыяле ў цэлым захоўваецца *прынцып сціпласці* (Н. Ніколіна), які вымагае адмовіцца ад прамога самазахаплення, а значыць абмяжоўвае ўжыванне ў тэксце станоўчых ацэначных выказванняў, якія маюць дачыненне да суб’екта. *Увеличение положительных самооценок и тем более их повторяемость воспринимаются как нарушение некой повествовательной* (дакладней: этычнай – *Т. Т.*) *нормы жанра*[12].

Прынцыпам “шчырых прызнанняў” кіруецца Максім Танк у “Дзённіках” 80–90-х гг., каб не выклікаць у чытача трансфармацыю ўласнага “я” з асобы станоўчай у асобу, схільную да самападману і самаўзвелічэння. Мастак не баіцца прызнавацца ў сваіх адмоўных якасцях, негатыўных ацэнках уласных учынкаў, у іранічным стаўленні да творчых пошукаў.

У “Дзённіках” за 1986 год чытаем: *Засумаваў па добрых вершах, і сам іх развучыўся пісаць*[13]; *За апошнія дні нічога не змог напісаць. Зацягнуўся мой творчы крызіс*[14]. 1987 год: *Узяўся за свае вершы. Сумна. Здаецца ніколі не пісаў так дрэнна*[15]. 1993 год: *А ў мяне зараз адны няўдачы, адны трывогі. Губляю ўсякую ўпэўненасць у неабходнасці свайго жыцця і творчасці*[16]. 1994 год: *Адчуваю, што ўвайшоў у самы цяжкі перыяд свайго жыцця – перыяд паражэнняў творчых, маральных, жыццёвых. Цяпер ужо позна на ўсім ставіць кропку. Застаецца толькі прайсці праз усе пякельныя кругі*[17].

---

[12] Н. А. Николина, *Поэтика...*, с. 251.

[13] Максім Танк, *Дзённік*, “Полымя” 1997, № 9, с. 77.

[14] Там жа, с. 84.

[15] Там жа, с. 93.

[16] Максім Танк, *Дзённікі*, “Полымя” 1997, № 11, с. 144.

[17] Максім Танк, *Дзённікі*, “Полымя” 1997, № 12, с. 117.

Сучасная аўтабіяграфічная проза, якая хоча прыцягнуць увагу чытача, мае ўстойлівую тэндэнцыю да самаагалення. Прынцып шчырага прызнання ў благіх учынках, крамольных думках, глыбінны псіхааналіз як метад спасціжэння ўнутранага свету "я" пазбаўляюць аўтабіяграфію табуіруемых тэм, паступова пашыраюць сферы духоўнага жыцця "я". У "Дзённіках" беларускага пісьменніка Максіма Танка паступова раскрываецца ўся складанасць чалавечага "я"-асобы. Увага да падрабязнасцей душэўных пакут, так уласцівая рускай класічнай традыцыі і лепшым узорам беларускай прозы XX стагоддзя, у запісах Максіма Танка 90-х гг. набывае трагічнае гучанне. *Пры ўсім аптымізме мяне чамусьці не пакідае трагізм існавання*[18]. *Трагізм жыцця ўсё часцей непакоіць мяне*[19].

У канцы 80-х гадоў XX ст. інтанацыі ў "Дзённіках" мяняюцца. Лексічным і фразеалагічным адзінкам становяцца ўласцівы характаралагічныя функцыі: яны характаразуюць асобу, пра якую ідзе гаворка, асяроддзе, час. Балючае адчуванне крызіснасці жыцця, душэўныя пакуты, прадчуванне завершанасці зямнога быцця выклікаюць мінорны настрой, абвостранае ўспрыманне Часу як галоўнага Суддзі, які разважыць, ацэніць, захавае альбо адправіць у нябыт.

Напрыканцы жыцця Максім Танк выразна ўсведамляе, што "жыццё – драма", пра гэта сведчаць і дзённікавыя занатоўкі, і два апошнія зборнікі паэта "Мой каўчэг" і "Errata". У лютым 1994 года мастак пакінуў такі запіс у дзённіку: *Калісьці людзі майго пакалення часы свае называлі часамі пагарды. Зараз мы ўступілі ў часы адчалавечання. І хоць, здавалася б, з нацыянальным адраджэннем, вяртаннем да рэлігіі павінна б было наступіць маральнае і духоўнае аднаўленне, на вялікі жаль, мы гэтага не бачым*[20].

Няспынны пошук цэласнасці асобы, унутранай гармоніі, *пафас пакутлівай барацьбы за выздараўленне, за пабудову недабудаванага "я"*, па словах С. Аверынцава, *противостоит как благодушным иллюзиям наличности искомого, так и нигилизму*[21]. Расказ пісьменніка аб сваім мінулым у 90-я гады XX стагоддзя дапаўняецца споведдзю, у якой мы назіраем павелічэнне, як трапна зазначыў М. Бахцін, *удельного веса*

---

[18] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя" 1996, № 9, с. 201.

[19] Там жа, с. 164.

[20] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя" 1997, № 12, с. 81.

[21] С. Аверинцев, «*Аналитическая психология» К.-Г. Юнга и закономерности творческой фантазии*, «Вопросы литературы» 1971, № 4, с. 132.

событий интимно-личной жизни, (...), *которые при громадном значении в личной жизни данного человека имеют ничтожное значение для других и почти вовсе не имеют социально-политического значения*[22]. Але ў тым і каштоўнасць "Дзённікаў" Максіма Танка, што яны адкрываюць магчымасць спасцігнуць таямніцы экзістэнцыяльнага пісьменніцкага "я" ў свеце.

Талент Сакрата Яновіча развіваўся ў іншых гістарычных абставінах. Пісьменнік вядомы беларускамоўнаму чытачу як аўтар апавяданняў, навел, лірычных мініяцюр, аповесцей, эсэ, як грамадскі дзеяч. Ягоная творчасць – маналіт таленту і працавітасці. У 2002 годзе ў Беластоку выйшла аўтабіяграфічная кніжка мастака "Не жаль пражытага", якая *прадстаўляе сабою няспыннае змаганне аўтара за годнае жыццё і беларушчыну* (Ю. Хмялеўскі).

У жанравых адносінах кніга "Не жаль пражытага" пабудавана па прынцыпу *ўяўнага дзённіка, спалучанага з уласна мемуарным прынцыпам* (Б. Эйхенбаўм). Станаўленне творчай асобы Сакрата Яновіча, пошукі свайго "я" адбываюцца на фоне тыповых з'яў польскай рэчаіснасці XX стагоддзя. Істотныя праявы часу і адметнасць уласнага "я" ў гэтым свеце скрупулёзна даследуюцца аўтарам успамінаў "Не жаль пражытага". Фарміраванне мастакоўскай пазіцыі, выбар жыццёвых каштоўнасцей, пераадоленне ўнутраных супярэчнасцей ператвараецца на старонках кнігі ў дыялог пісьменніка з эпохай, зменлівай, складанай, супярэчлівай.

Прынцып "сціпласці" (замоўчвання) зусім не ўласцівы нататкам Сакрата Яновіча. Ён, як і Максім Танк, хутчэй кіруецца прынцыпам "шчырасці" і смела гаворыць аб сваіх негатыўных якасцях, адмоўных учынках, помыслах. Часам гэта праяўляецца ва ўжыванні бруталь-най лексікі, якая выразна характаразуе адносіны пісьменніка да пэўнай катэгорыі людзей, здарэнняў, гістарычных фактаў. У біяграфічнай кнізе "Не жаль пражытага" выявілася тэндэнцыя да максімальнага самаагалення, самараскрыцця. Мастак свядома пазбягае станоўчых ацэнак асобаснага "я", бо яны прывялі б да стварэння гэткага сусальнага вобраза "ідэальнага героя", схільнага да самаўзвелічэння і самазахаплення.

Вобраз "я" ва ўспамінах Сакрата Яновіча пабудаваны на супярэчнасці "слабасць – сіла". Пераадоленне слабасцей, недахопаў, страхаў, памылак становіцца схаванай унутранай тэмай аповяду і аўтарскага лёсу:

[22] М. М. Бахтин, *Эпос и роман*, с. 73.

> Нашай слабасцю лічу няшчырасць перад самім сабою, выдаванне сябе лепшым панам, калі, тым часам, выводзімся з таго głodu, smrodu, ubóstwa. Зусім не для гідлівасці нагадваю я пра тое, а хутчэй дзеля роздуму аб тым, як моцна змяніўся час, а тое, што я памятаю, унукам маім гэта ўжо чорныя байкі схільнага да мазахізму дзеда. Пакутніцтва колішніх дзяцей прыроды[23].

Працэс самапазнання ў аўтабіяграфічным творы С. Яновіча актыўны: самаінтэрпрэтацыя ўласнага "я" ідзе праз самааналіз, самападман, самаабвінавачванне, самаадчуванне. *Як цяпер разумею, я жыў маніямі*[24]. *Глыбейшага погляду на свет мы не мелі, не маглі мець, выводзячыся з-пад саламяных стрэх*[25]. Важнай задачай пісьменніка ў аўтабіяграфічным творы з'яўляецца яго ўстаноўка на пэўны стыль, спосаб падачы матэрыялу, што ў выніку фарміруе вобразную структуру тэксту, якая ў сваю чаргу мадэлюе імпліцытны вобраз чытача, здольнага актуалізаваць тое, што закладзена ў творы. Сучасны аўтабіяграфічны тэкст наогул мае тэндэнцыю да наяўнасці вялікай колькасці адрасатаў (чытачоў). Гэта патрабуе ад мастака ўзмацнення суб'ектыўнага аўтарскага пачатку (аўтарскі аналіз-каментарый, "*метаречевая" гульня* і *пераказ у квадраце* (У. Эка). Тэндэнцыя сучаснай аўтабіяграфічнай прозы да эксплікацыі множнасці адрасатаў ускладняе структуру аповяду. Адным з элементаў гэтай структуры становяцца метатэкставыя ўключэнні.

> Метатекстовые включения обнажают сам процесс порождения текста, устанавливают исходные координаты "литературной" коммуникации, мотивируют связи между различными фрагментами текста, служат сигналами выделения новой темы (микротемы) или возвращения к прежней, показателями важности для повествователя сообщаемой им информации или значимости выражаемой им оценки[26].

Яны надаюць аўтарскай думцы перарывісты, фрагментарны характар, выклікаюць асацыятыўныя сувязі, па-новаму падсвечваюць дэталі, якія ўзгадвае мастак. Да метатэкставых элементаў адносіцца і аўтарскае тлумачэнне слоў з мэтай знайсці агульны з чытачом код. Пісьменнік павінен улічваць веды чытача пра знешні свет, яго моўную культуру, арыентацыю на літаратурную мову (абмежаваныя

---

[23] Сакрат Яновіч, *Не жаль пражытага*, Беласток 2002, с. 34.

[24] Там жа, с. 48.

[25] Там жа, с. 115.

[26] Н. А. Николина, *Поэтика...*, с. 166–167.

веды дыялектнай мовы, жаргону, прафесіяналізмаў). Аўтарскае тлумачэнне звязана з выяўленнем эстэтычных густаў, светапоглядных пазіцый мастака.

У кнізе Сакрата Яновіча чытаем: *Упалоханы эпілепсіяй, выпрацаваў у самім сабе некалькі, прыдатных пасля стандартных рэагаванняў. "Не біць у хамут", як казалі у Крынках, г. зн. Не кідацца ў залішнюю амбіцыю. "Не крушняваць пад сябе", г. зн. Не шалець ад пярэпалаху. "Жыць як жыццё набяжыць", г. зн. Памяркоўнасць у спадзяваннях. "І без цябе быў свет", г. зн. Не мондрыцца*[27].

Важную ацэначную функцыю нясе метатэкставы элемент у дзіцячых ўспамінах Алеся Адамовіча з кнігі "Vixi":

> "Ня хочаш блінчыкаў з варэньнем?" Г.зн. лупцоўкі. А ўзнік ён так. Мы ўжо выбраліся на казённую, нашу першую заводзкую кватэру – у доўгім доме побач з базарам. Нейкая жанчына пабачыла, як "доктараў сын" паставіў нагу папярок глыбокай пясчанай каляіны і чакае сялянскі абоз, што паволі сунецца на яго. Што за эксперымент я хацеў паставіць, дасюль зразумець не магу. Жанчына адцягнула мяне, вылаяла, неўзабаве я і думаць забыўся на тое, загуляўшыся ў таўханіне базарных павозак зь вісклівымі парсюкамі, спалохана-соннымі курамі, ігрушамі, ягадамі. І раптам чую ласкавы такі мамін голас за нашым частаколам:
>
> – Саша, ты дзе? Хадзі, я табе блінчыкаў з варэньнем дам!
>
> І дала. Рэдка было, але ўжо калі зазлуе па-сапраўднаму, сьвету ня рад будзеш. Не, не рукамі, – больш словам дастане[28].

Аўтарскі каментарый – яскравая самахарактарыстыка асобы Адамовіча-мастака, -псіхолага, яркая дэталь у партрэтную характарыстыку маці, якая (дэталь) сведчыць пра сілу эмацыянальнай памяці творцы.

Важным кампанентам самахарактарыстыкі і самаідэнтыфікацыі асобы ў аўтабіяграфічнай прозе служыць інтэртэкст. У "Дзённіках" беларускага пісьменніка Максіма Танка дамінуюць так званыя прэтэксты – урыўкі з мастацкіх твораў. Крыніцы інтэртэксту ў паэта самыя розныя – гэта творы беларускага і сусветнага фальклору (*Успомніў пагаворку свайго дзеда: "Калі конь не цягне, пугай сцябай не каня, а сябе"*[29]), народная прыказка (*Нічым так справядліва на свеце не надзяліў Бог людзей, як розумам, бо кожны лічыць, што*

[27] Сакрат Яновіч, *Не жаль пражытага*, с. 53.

[28] Алесь Адамовіч, *Vixi. Тры апошнія аповесці*, с. 334–335.

[29] Максім Танк, *Дзённік*, "Полымя", 1997, № 10, с. 145.

ён мае яго досыць[30]), кітайская прымаўка (*Куды цябе запрашаюць – прыходзь рэдка, куды не запрашаюць – не прыходзь зусім*[31]), урыўкі з выказванняў класікаў замежнай літаратуры (Ж.. Ж.. Русо: *Калі не можаце ўратавацца, каб вас не зжэрлі, пастарайцеся хоць, каб вас не пераварылі*[32], А. Споэрль: *Погляд, што мужчына не можа кахаць адну і тую ж кабету, такі ж фальшывы, як погляд, што скрыпач, каб адыграць той самы твор, мусіць мець некалькі інструментаў*[33]). У "Дзённіках" змешчаны накіды ўласных вершаў і вершы сяброў па пяру.

Шмат інтэртэкстуальных уключэнняў мы сустракаем у аўтабіяграфічным творы Алеся Адамовіча "Vixi" (*Японцы маюць рацыю: важна ня як жыў, а як памёр*[34]. *Нічым ня можа валодаць чалавек, пакуль ён баіцца сьмерці (гэта П'ер Бязухаў, а па-сутнасці – Леў Талстой). А хто не баіцца яе, таму належыць усё*[35]. *Сьмерці няма, сказаў мудрэц. Яе няма, пакуль я жыву. А калі яна прыходзіць, няма мяне. Сустрэча зь ёю немагчымая. Калі нішто іншае ўжо ня можа суцешыць, суцяшаюць сябе гэтым. Але ўсе ведаюць: ёсьць. Чужая, як свая, свая, як чужая*[36]).

Цытаты, пераказ зместу, прыгадванне асобных эпізодаў з твораў, выказванняў класікаў сусветнай культуры і сучасных пісьменнікаў ствараюць адчуванне, што *побач з непасрэднымі звесткамі да нас далятаюць яшчэ нейкія галасы здалёк* (Р. Барт), якія ўвасабляюць ідэю ***поліфанізму як сусветнага адзінства*** (падкрэслена мной – *Т.Т.*), сутнасць якога трапна сфармулявала Эльза Трыяле: *Речь уже не идет о том, чтобы познать себя, но о том, чтобы увидеть, понять других, внешнюю драму, без которой ни это время, ни я сам не имею никакого смысла*[37].

Інтэртэксты выяўляюць літаратурныя густы пісьменнікаў, іх калег, знаёмых, ствараюць каларытны вобраз эпохі і служаць спосабам аўтарскай ацэнкі не столькі іншых асоб, як важным складнікам працэсу фарміравання асобы пісьменнікаў, яе самахарактарыстыкі. *Трэба*

---

[30] Там жа, с. 147.

[31] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя", 1997, № 9, с. 77.

[32] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя", 1997, № 10, с. 167.

[33] Там жа, с. 148.

[34] Алесь Адамовіч, *Vixi. Тры апошнія аповесці*, с. 308.

[35] Там жа, с. 440.

[36] Там жа, с. 385.

[37] Цыт. па J. Madole, *A propos de "Blanche ou L'Oubli"*, Europe, N 464, dec. 1967, p. 482.

было б да свята купіць пару бутэлек шампанскага, – піша Максім Танк. *“Што за жыццё, у якім няма віна”, – гаварыў мудрэц Саламон. Праўда, ён зазначыў, што яго піць трэба з пачуццём меры і ў адпаведны час. Толькі хто ў нас ведае гэту меру і гэты час? А ўсе забароны на спіртное пакуль што прыносілі яшчэ большую шкоду і страты і не спынялі п’янства*[38]. Які дакладны, інтанацыйна багаты ўрывак! І які маштаб асацыятыўнага мыслення! Максім Танк тут паўстае перад чытачом як мудрэц-філосаф.

Інтэртэкставыя ўключэнні з класікаў сусветнай культуры дапоўнены цытатамі з Бібліі, яны фарміруюць у тэмпаральнай структуры аўтабіяграфічных твораў план вечнага, які супрацьпастаўлены часоваму, тленнаму, зямному, і аповяд становіцца больш аб’ёмным. Біблейскія ўрыўкі – *формула генерацыі* (Ніколіна) аўтарскіх перажыванняў, ацэнак, эмоцый, аўтарскай філасофіі і нават філасофіі цэлага пакалення.

Зварот да міфалагічных вытокаў абумоўлены не толькі пошукам крыніц вобразнасці, гэта яшчэ і схема, якая мадэлюе самасвядомасць і працэс пазнання чалавекам свету. Для самавыяўлення свайго “я” Алесь Адамовіч, Максім Танк, Сакрат Яновіч шырока ўжываюць ва ўспамінах гістарычныя імёны, літаратурныя вобразы, звароты да гісторыі рода, звесткі пра сям’ю, бацькоў. У дакументальных запісках бачыцца не проста жаданне расказаць пра свой род, жыццёвыя лёсы блізкіх і знаёмых людзей, але і імкненне зразумець жыццё шляхам спасціжэння родавага “я” знутры.

Прэзентацыя свайго індывідуальнага ідзе побач з пошукамі агульнага, тыповага, што надае ўспамінам філасофскую глыбіню. У Сакрата Яновіча чытаем:

> У традыцыйнай, асабліва вясковай, сям’і баба не мела голасу, пра ўсенька вырашаў бацька або галава роду, дзед, калі яшчэ добра трымаўся ён на нагах і ў думанні. Таму Беларускае грамадска-культурнае таварыства не магло пераўтварыцца ў школу грамадзянскага выхавання, будучы папраўдзе вялізнай вёскай, распыленай на горад. Z wiechciem w bucie. Грамадзянскасць стварае выключна горад, у ім магчымае пачуццё супольнасці лёсу, jazdy na tym samym wózku. А ў вёсцы – не, бо гаспадар у ёй мае ўсё сваё: хату, студню, печку на дровы, каня з возам, карову з малаком, кормніка на мяса з салам, курэй, яйкі і г.д. Самагон! Якое ж тады можа быць тое пачуццё супольнасці лёсу паміж незалежнымі ад сябе гаспадарамі? Не большае, чым у малітве з выпадку сушы або пажару. Трохі ў родавым клане, фамільнай мафіі.

[38] Максім Танк, *Дзённікі*, “Полымя”, 1997, № 10, с. 149.

> У гэтым і разгадка нашай нацыянальнай слабасці, Беларускі рух нарадзіўся як сялянскі, а не гарадскі, і гібеў разам з сялянствам[39].

Не сакрэт, што аўтабіяграфічная проза, пабудаваная на ўласных успамінах, насычана вялікай колькасцю бытавых падрабязнасцяў. Эстэтычная трансфармацыя фактаў, дробязяў, выяўленне агульнага ў адзінкавым – найпершасная задача мастака. Яна дасягаецца з дапамогай разгорнутых метафар, цытат, прыказак, афарызмаў, максімаў, прыгадвання імёнаў гістарычных асоб, герояў літаратурных твораў, *далучанасць да свету іншых робіць аўтарытэтнай біяграфічную самааб'ектывацыю жыцця* (М. Бахцін).

Такім чынам, на старонках прыгаданых кніг Алеся Адамовіча, Максіма Танка, Сакрата Яновіча адбываецца самарэпрэзентацыя ўласнага "я" з яго ўнутраным напаўненнем і духоўным багаццем. Узмоцненая мастакоўская ўвага да свайго "я" не вядзе да эгацэнтрызму і індывідуалізму, бо праз уласную памяць пісьменнікі вяртаюць чытача да гістарычнай памяці і тым самым пераадольваюць вузасць і абмежаванасць індывідуальнага быцця.

Сучаснай аўтабіяграфічнай прозе ўласціва свая тыпалогія часавых узаемаадносін, галоўнай прыкметай якой становіцца "кропка адліку", вызначаная аўтарам. За класічным жанрам "дзённікаў" трывала замацавалася летапісная форма аповяду з устойлівай кропкай адліку, яе фактычна прытрымліваецца Максім Танк. Жанр мастацкай аўтабіяграфіі *предполагает отказ* ад жорсткай паслядоўнасці фактаў, падзей і вядзе да *расчленения* ўспамінаў на фрагменты. *Такое членение текста отражает постоянное изменение фокуса изображения, связанное с работой памяти, и выделяет припоминаемую деталь крупным планом, останавливающим время*[40]. Таму ў дакументальна-мастацкім тэксце магчыма прысутнасць устаўных апавяданняў, навел, што мы назіраем у кнізе А.Адамовіча "Vixi" (як мініапавяданні ўспрымаюцца ўспаміны пра смаленне вепрука ў лесе, уяўную сустрэчу Гітлера і Сталіна).

Складанасць пісьменніцкіх "я" праяўляецца праз спалучэнне аповяду пра "я" ў мінулым і "я" ў цяперашнім часе. Так, ва ўсёй тканіне ўспамінаў кнігі "Не жаль пражытага" трывала прысутнічае ацэнка сённяшняга Яновіча, мудрага, вопытнага, разважлівага. Праз прызму

---

[39] Сакрат Яновіч, *Не жаль пражытага*, с. 162–163.

[40] Н. А. Николина, *Поэтика...*, с. 347.

цяперашняга часу глядзіць мастак на даўно мінулыя прыгоды дзяцінства, юнацтва. Важная роля ў тэксце належыць успамінам “я”-апавядальніка ў мінулым, але гэта не прыглушае каштоўнасць фактаў, падзей цяперашняга часу.

Такім чынам, мы можам гаварыць аб *зменлівай апавядальнай перспектыве* (Ніколіна), калі ацэнкі ў мінулым мяняюцца сённяшнімі ацэнкамі аўтара, а потым зноў актуалізуецца мінулае[41]. Гэты прыём значна пашырае сферу самахарактарыстык і самаацэнак, каштоўнасць якіх у кнізе Сакрата Яновіча відавочная. *Быт чалавека трымаецца на хлебе і біялагічнай рэпрадукцыі. Безнадзейная адсталасць народу, значыць, яшчэ і ў тым, што не прыдае важнасці культуры адносінаў між мужчынаю і жанчынаю, пакідаючы тое імпэту інстынктаў. Ад таго бухаюць драмы, тухлее марнацыя жыццёвых шанцаў. Недапасаванасць партнёраў.*

Ці не ад шоку полавай нявыхаванасці робімся вульгарнымі прасякамі з інжынерскімі дыпломамі за пазухаю? Хамутамі на паркетах[42].

Шчырыя прызнанні, смеласць меркаванняў, шырокі спектр праблем для абмеркавання, асацыятыўнасць успамінаў істотна пашыраюць плынь унутранага жыцця мастака. Не з усім у творы чытач можа пагадзіцца, але бясспрэчна адно – пазіцыя Сакрата Яновіча выклікае павагу і скіроўвае на глыбокі роздум.

На старонках кнігі ўспамінаў “Не жаль пражытага” чытач становіцца сведкам таго, як з цягам часу ў пісьменніка мяняюцца інтарэсы, ідэалы, каштоўнасці. Мастак не саромеецца пра гэта гаварыць, кідаючы крытычны позірк сталага чалавека на дзіцячыя і юнацкія ідэалы, захапленні, прызнаючы свае памылкі і недахопы. Гэта мы бачым у шматлікіх самаацэнках. Аўтар не прэтэндуе на паўнату ўласных дзіцячых уражанняў, больш спасылаецца на тое, што казалі іншыя, і падае ўсё тое праз прызму дарослага чалавека:

> Я канчаў пяты гадок і не вельмі паспяваў за матчыным крокам на гасцінцы. Зараз у Айнавых горах, як называлі ў нас пагоркі за старадрэўем двара, закруціўся па-над жытамі нямецкі самалёт. Мы пабеглі ў палынавыя межы. Ён, нізка кіруючыся на нас, страляў і маці накрывала мяне сабою, енчачы! Я не цяміў у існаванні смерці, але заходзіўся ад крыку, бо ўжо ведаў боль. Абоім было неўздагад, што лятуны палявалі на савецкія танкеткі, якія паўзлі праз мястэчка, адступаючы Індурскім шляхам на Гародню. Зразумеў я гэта значна пазней, можа і нядаўна. А мой вопіс

[41] Там жа, с. 245.

[42] Сакрат Яновіч, *Не жаль пражытага*, с. 37.

здарэння цалкам цяперашні, камплектны. У самой жа памяці захаваўся ад таго кіслы пах поту ад тулячай мяне мацеркі, спякотнае сонца над польскімі могілкамі, нявысахлая ўпоранак раса ў зельішчы, і налятаючы ад хутара Рахавік выючы цмок з хісткімі крыламі з крыжамі[43].

Сродкам яркай самахарактарыстыкі служыць ацэнка Сакратам Яновічам учынкаў іншых асоб. Так, напрыклад, эмацыянальна ўзнёсла перадае аўтар успамінаў свае ўражанні ад знаёмстваў з Нілам Гілевічам, Піліпам Пестраком, Янкам Брылём (*...пазнаёміўся я з Нілам Гілевічам, яшчэ студэнтам, але незвычайным, беларускамоўным. Прынцыпова беларускамоўным*[44]. *Незабыўная сустрэча з Піліпам Пестраком; па-акторску прачытаў апавяданне. Жвавіста. Супрацьлегласць яму – Янка Брыль, дастойны, бы граф (падабаўся надзьмутым палякам)*[45]. А колькі каларытных дэталяў ва ўрыўку ўспамінаў пра Алеся Барскага, якія ў першую чаргу ярка характарызуюць самога аўтара.

Трэба не забыцца прыкмеціць, што насталі дні і гады фантастычнай славы Алеся Барскага. Ніхто так, як ён, не ўмеў дэкламаваць сваё, і ўсё па памяці, і з гарманічным каскадам слоў, і з натхнёным выразам твару, і са слязінкай уваччу, і з жэстамі маэстра (пальцы рыхтык піяніста). Яго анёльская прыгажосць з таемным позіркам. Ад якое і не падумалася, што ў маладосць Алесь араў, сеяў, гной вазіў, дровы пілаваў... Словам, дзяўчаты вар'яцелі, бы кошка ад валер'яну! Выезд з Барскім гарантаваў імпрэзу. Жаночая частка аўдыторыі ў экстазе! Ад пачастункаў не было адбою. Вядома, гэткая папулярнасць небяспечная, пагражае дэмабілізацыяй таленту. Адны ўдачы не спрыяюць канцэнтрацыі энергіі.

Іншыя паэты не любілі выступаць з ім, а ён, наадварот, надта – якраз з імі, з тымі, у якіх ні на грош мужчынскай чароўнасці. Другі такі Барскі ў нас потым не аб'явіўся. Слухаеш цяперашніх вершапісцаў і думаеш: а каму яны патрэбны? Бульбаносыя нуднікі[46].

У прыведзеным тэксце гучыць не толькі захапленне чужым уменнем падаць сябе, зацікавіць слухача сваімі творамі. Між радкамі прачытваецца ўнутраны боль з прычыны таго, у якіх няпростых умовах жыве беларускае слова на Беласточчыне, як складана крануць сэрца чытача, а значыць пісьменніку-беларусу важна не толькі добра пісаць, але і ўмець рэкламаваць сваю прадукцыю, каб памножыць колькасць прыхільнікаў беларускага прыгожага пісьменства.

[43] Там жа, с. 8.

[44] Сакрат Яновіч, *Не жаль пражытага*, с. 92.

[45] Там жа, с. 95.

[46] Там жа, с. 107.

Парушэнне часава-прасторавых параметраў, пільная ўвага да мікрадэталяў спрыяюць больш глыбокаму выяўленню пісьменніцкай экзістэнцыі. У дакументальна-мастацкай кнізе Алеся Адамовіча "Vixi" маляўнічыя карціны дзяцінства, адбітак якіх моцна зафіксавала памяць, ствараюць вобраз безабароннага маленькага хлопчыка, дужа цікаўнага, гарэзлівага. Аўтар успамінаў, як і Сакрат Яновіч, таксама не прэтэндуе на паўнату ўражанняў: *Зь якога моманту мы начыста забываем тое, што бачым, што востра перажываем, сьмеючыся і плачучы ў такім вось узросце? Хіба тады мы ня п о м н і л і? Што было ўчора, пазаўчора – помнілі ж. І раптам – як адрэзвае, адсякае! Нешта застаецца ў нас, але запячатанае, у нейкіх сотах. Што наглуха, а што ўдаецца раскалупаць...*[47]. Відавочна, у Адамовіча-мастака няма жадання пераацэньваць сябе ў часе дзяцінства, рабіць сваё аблічча больш прывабным. Уражанні маленства мазаічныя: *Лямпа – зіхоткі металічны шар на чорнай трынозе, шкло з крута разьдзьмутымі шчокамі, падтрыманае зьнізу ўзорыстым венчыкам*[48]; *печка – наша чароўнае царства, да апошняга сантымэтру абжытае, абнюханае, аблізанае*[49]; *відушчыя фатаграфіі*, смаленне кабанчыка ў лесе. Фрагментарнасць *падгля́даў за сподам сваёй натуры*[50] ў кнізе А. Адамовіча становіцца мастацкім сродкам увасаблення новага бачання свету.

У сучаснай аўтабіяграфічнай прозе назіраецца тэндэнцыя да спалучэння лірычнай і філасофскай медытацыі. Па сутнасці, твор становіцца суцэльным унутраным маналогам, у якім сцвярджаецца адзінства суб'ектыўнага і агульначалавечага. Магутны лірычны струмень прысутнічае ў апісаннях прыродных з'яў, дзе, вырваўшыся на паверхню, уражвае сілай памяці аб далёкім мінулым і ўчарашнім. У Сакрата Яновіча мы чытаем:

> Абагаўляў прыроду, зачараваны расуючымі жытамі ў далёкіх палетках; сядзеў на ўскраі лужкоў, назіраючы за гняздуючымі ў кустоўі птушкамі. Лежачы на ўзмежку, заглядаўся на аблокі; у вышынях шыбаваў птах. Мроячы пра ўласны сад, у капанне бульбы звозіў дзічкі з межаў, садзіў на прыгуменні і на новым пляцы, купленым бацькам пад хату на жыдоўскіх пажарысках за кузьняю Лейзара. З таемнай асалодаю паўтараў прырода-апісальныя вершы з матчынай кніжыскі Пушкіна: **Пахнет сеном над**

[47] Алесь Адамовіч, *Vixi. Тры апошнія аповесці*, с. 330.
[48] Там жа, с. 322.
[49] Там жа, с. 323.
[50] Там жа, с. 345.

лугами, сердце, душу веселя... Або: **Буря мглою небо кроет, вихри снежные крутя, То как зверь она завоет, то заплачет как дитя...** (выдзелена С. Яновічам)[51].

Мы, падшпаркі, хадзілі купацца летам да паўразваленых маянтковых сажалак. У іх багонным цемнаводдзі плёхкаліся, бы свінні ў Мухаўцы на выгане, захлынаючыся тою маззю з апалонікамі. Зрэдку трапляўся карасік, жывоцікам уверх ад мулістай удушлівасці. Дзіву даюся, як не выгубіла нас тады нейкая эпідэмія![52]

Знітаванасць мінулага і цяперашняга ў аповядах С. Яновіча стварае высокую канцэнтрацыю думкі, энергіі. Паглыбляе часавую перспектыву кнігі-споведзі прыём, які літаратуразнаўцы называюць "успаміны ва ўспамінах" і які выкарыстаны аўтарам для супастаўлення двух часавых планаў, што надае апавядальнай структуры ўсяго твора шматмернасць, нараджае семантычную множнасць "я"-апавядальніка.

У кнізе "Не жаль пражытага" шмат эмоцый і эмацыянальных станаў: барацьба розных пачуццяў, супярэчлівых эмоцый, канфлікт сэрца і розуму. Характарыстыка эмацыянальнага стану спалучаецца з яго аналізам, дзе аўтар выказвае сваё бачанне з'явы. *Асіміляцыя – раўназначная катастрофе, найперш культурнай, а следам за ёю гаспадарчай, што нарэшце ўцямілі на Захадзе, ратуючы яшчэ жывыя нацыянальныя, этнічныя рэгіёны. Узвышаючы іх мовы да ўзроўню другіх дзяржаўных, лакальна (напр. Фрызійскую ў Каралеўстве Нідэрланды). Нацыя не ёсць фанабэрыяй, але Божай з'явай!*[53]

Узаемадзеянне лірычна-іранічнай экспрэсіі з філасофскай медытацыяй прысутнічае ў "Дзённіках" Максіма Танка. Лірычная экспрэсія скіроўвае чытача на прыхільнасць аўтара да прадмета аповяду альбо ўказвае на сітуацыю, неабыякавую для аўтара, у той час як іранічнае адценне сведчыць аб несупадзенні ацэнак у мінулым і цяперашнім часе. Важнай уласцівасцю аўтабіяграфічнага "Дзённіка" Максіма Танка 90-х гадоў XX ст. з'яўляецца яго адкрытая суб'ектыўнасць і характэрная ёй экспрэсіўная накіраванасць. Пісьменнік не хавае ўласных пачуццяў закінутасці, адчужанасці, неабароненасці перад маштабам сацыяльных зрухаў канца стагоддзя. Будучы чалавекам сацыяльна актыўным, мастак імкнуўся захаваць сябе як творцу. У "Дзённіках"

[51] Сакрат Яновіч, *Не жаль пражытага*, с. 50.

[52] Там жа, с. 34.

[53] Там жа, с. 143.

чытаем: *Засядаю і засядаю. Прападзі ты пропадам такая работа!*[54] *...Выступленні, прыёмы. Мы зусім забылі, што аб нашых поспехах будуць судзіць не па колькасці з'ездаў, пленумаў, вечароў, а па творах. І толькі па творах*[55]. *Амаль усё жыццё прайшло на розных паслугах і дамашняй мітусні*[56]. *...Творчая праца патрабуе часу, часу і часу, адзіноцтва, адзіноцтва і адзіноцтва. А ў мяне на працягу ўсяго жыцця не хапала ні таго, ні другога*[57].

Адзінота – абавязковая ўмова для творчасці. Здольнасць да адзіноты – паказчык самакаштоўнасці асобы, умова захавання яе ўнутранага свету. Праз адзіноту адкрываецца шлях да людзей. Адзінота – не супрацьстаянне асобы і грамадства, *одиночество*, – як зазначае расійскі даследчык Валянціна Заманская, – *это совершенно необходимое условие для самоуглубления личности. Для самопознания, для определения ее ценности: вне одиночества нет поэта. И более того, мера одиночества, как ни парадоксально, способность к самоуглублению через одиночество – порой и показатель самоценности личности поэта, и показатель меры его таланта*[58].

Анталагічнае пачуццё адзіноты ідзе ад вострага адчування Танкам-паэтам неабходнасці правільна суаднесці міг і вечнасць, спасцігнуць кошт імгнення і чалавечага жыцця. "Дзённікі" ёсць матэрыялізаваная ідэя завершанасці кола зямнога быцця, незваротнасці часу і чалавека ў ім.

У кантэксце філасофскіх разважанняў над праблемамі жыцця мастак заўсёды непазбежна сутыкаецца з катэгорыяй смерці, праз якую асэнсоўваецца сэнс зямнога чалавечага існавання. *В процессе экзистенциализации русской литературы она* (смерць – *Т.Т.*) *выходит на первый план. Ее первичность усиливается национальным менталитетом: вечный русский вопрос – о смысле жизни – ставит и вопрос о смерти, через которую уясняется (или не уясняется) смысл человеческого существования*[59].

Тэма смерці, якая ў класічнай рускай літаратуры была прыкметай трагічнага светаадчування і знакам новага мыслення, стала важ-

---

[54] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя", 1996, № 12, с. 200.

[55] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя", 1996, № 11, с. 196.

[56] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя", 1997, № 9, с. 79.

[57] Максім Танк, *Дзённікі*, "Полымя", 1997, № 3, с. 187.

[58] В. В. Заманская, *Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века. Диалоги на границах столетий*, Москва 2002, с. 175.

[59] Там жа, с. 74.

ным аспектам філасофскага асэнсавання Алеся Адамовіча. Жыццё, як прызнаецца пісьменнік, доўга аберагала яго ад уражанняў смерці ў дзяцінстве. *Але я ўбачыў сьмерць, яна ўвайшла ў мой зрок, засталася ў сьвядомасьці (усьвядомленая), калі ўскрывалі ў бальнічным двары цела самазабойцы*[60]. У Адамовіча талстоўская цікавасць да смерці. *Зірнуць на многае (і на самога аўтара раманаў) з такой будучыні, дзе ўжо бачны край жыцьця. А раптам гэта здасца цікавым. Ці хоць бы карысным*[61]. *Выпрабаванне магчымасцяў свайго "я"*[62].

Услед за лепшымі ўзорамі сусветнай класікі Алесь Адамовіч ідзе шляхам псіхалагічнага экзістэнцыялізму, які паступова складаецца ў дакументальна-мастацкім творы "Vixi" ў цэласную і завершаную эстэтычную сістэму. Псіхалагічны аналіз уласнага "я" вылучаецца паслядоўнасцю, лагічнасцю і трывалай сувяззю са знешнімі абставінамі, але паралельна ажыццяўляецца і экзістэнцыяльнае тлумачэнне логікі жыцця: прынцып выпадковасці (яму надаецца важная роля), катэгорыі сна, трызнення, інтуіцыі становяцца трывалымі формамі самавыяўлення ў А. Адамовіча. Праз свае ўзаемаадносіны са светам мастак па-сутнасці "воссоздает себя". "Vixi" – не проста гісторыя жыцця, а душэўная эпапея, дзе часта дамінуе логіка асацыятыўнага мыслення, плынь псіхалагічных імпульсаў, супярэчлівая матывацыя.

Такім чынам, сучасная аўтабіяграфічная проза ў сваёй жанравай і кампазіцыйнай шматстайнасці дае магчымасць ажыццяўляць розныя формы і ўзроўні самааналізу. Ва ўспамінах Сакрата Яновіча і Алеся Адамовіча, у дзённіках Максіма Танка мы маем экзістэнцыяльную інтэрпрэтацыю ўласнага "я" – "я" асобы, якая ведае сваю каштоўнасць ў гэтым свеце і адметнасць свету для яе. Індывідуальны свет пісьменніцкага "я" сёння настолькі прывабна чароўны, што ён здольны стварыць арыгінальную мастацкую цэласнасць. *Жыць – гэта не так проста, гэта быць вяршыняй ... Мы – творы. Творы* (разр. Леклезіё)[63], – канстатуе сучасны французскі пісьменнік Ж.-М.-Г. Леклезіё. Прыватнае жыццё мастакоў з самымі дробнымі дэталямі і падрабязнасцямі паўстае перад чытачом як поўнавартасны мастацкі твор, які здольны выявіць складанейшую сэнсавую множнасць асобы пісьменніка з яе глыбіннымі лірыка-філасофскімі перажываннямі.

---

[60] Алесь Адамовіч, *Vixi. Тры апошнія аповесці*, с. 383.

[61] Там жа, с. 393.

[62] Там жа, с. 440.

[63] Le Clézio J.M.G. L'extase matérielle. Essai, Paris 1992, p. 102.

SUMMARY

The article deals with the existential component of the modern autobiographical prose in the documentary works “Vixi” by A. Adamovitch, “Diaries” by Maxim Tank, “I am not sorry of the past” by Socrates Yanovitch.

Readers and researchers are particularly attracted by the autobiographical prose because of the author’s precise knowledge of events as their witness or participant, his unbiased interest in description of the external life and particularly the internal state, his assertion of personal rightness, evaluations and conclusions. The scale and character of transformation of the internal “self” of such authors as A. Adamovitch, Maxim Tank, S. Yanovitch, their self-realization in the society, forming of their creative position, choice of their life values, overcoming of their internal contradictions display the stable tendency in the modern autobiographical prose towards maximum self-stripping and self-recognition. The documentary prose with its genre and composition variety enables to undertake different forms and levels of the “self” analysis that leads to the complication of the structure of a narration. The main elements of this structure like metatext insertions and intertext display literary preferences of authors, their colleagues, and acquaintances, and create a colorful image of the epoch. These are sooner the basic component of the process of the development of the writers’ personality, than their mode of evaluation of other people. The modern autobiographical prose displays the stable tendency towards the fusion of lyrical and philosophical meditation. Essentially, the author’s work reminds the continuous internal monologue where the unity of subjective and all human is asserted.

The author’s particular attention to his “self” does not lead to egocentrism or individualism for as through the own recollections he opens to a reader pages of historical memory, that helps overcoming narrowness and limit of the individual being.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Анатоль Івашчанка
Мінск

Версэт Алеся Разанава як «паэзія думкі». Сінкрэтызм і статычнасць жанру

Структурны падыход да літаратурнага твора не абмяжоўваецца адно прынцыпамі апісальнай паэтыкі, якая ўяўляе мастацкую пабудову як механічную суму шэрагу "прыёмаў", што існуюць асобна адзін ад аднаго. *Любое пералічэнне прыёмаў нічога нам не дасць (роўна як і разгляд "прыёмаў" наагул, па-за тэкстам як арганічным адзінствам)*, – зазначае адзін з самых уплывовых даследчыкаў у галіне тэорыі верша Юрый Лотман, – *паколькі, уваходзячы ў розныя структуры цэлага, адзін і той жа матэрыяльны элемент тэкста непазбежна набывае розны, часам супрацьлеглы, сэнс*[1]. Таму, акрамя аналізу фармальнага, семіятычнага плану версэтаў А. Разанава, нас будзе цікавіць і ідэйна-тэматычны (семантычны) план, а таксама іншыя эстэтычныя, пазатэкставыя фактары, а менавіта – творчая канцэпцыя як адбітак свядомаснага стану творцы.

Яўген Гарадніцкі ў кнізе "Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучаснай беларускай лірыцы" канстатуе ўзніклыя цяжкасці пры вызначэнні жанравых межаў сучаснай філасофскай лірыкі, што ўзнікаюць у выніку пашырэння жанравай дыфузіі. *Часам пад сумненне бярэцца правамернасць ужывання самога паняцця "філасофская лірыка*[2], – адзначае даследчык. Замест гэтага панятку прапаноўваюцца ін-

[1] Юрий Лотман, *Структура художественного текста*, Санкт-Петербург 1998, с. 101.

[2] Я. А. Гарадніцкі, *Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучаснай беларускай лірыцы*, Мінск 1986, с. 10.

шыя тэрміны, у прыватнасці – «паэзія думкі». Гэтае жанравае вызначэнне падаецца прыдатным і для вызначэння пэўнага пласта творчасці А. Разанава (у кнізе Я. Гарадніцкага, дарэчы, на даследаванне творчых здабыткаў паэта адведзена ўсяго дзве старонкі), які ахоплівае версэты і, у найбольшай ступені, зномы.

Ганна Кісліцына пры разглядзе паэм і версэтаў Разанава выкарыстоўвае паняцце верлібру, удакладняючы, што мае на ўвазе спосаб версіфікацыі. Разгледзім азначэнне верлібра, пададзенае ў "Паэтычным слоўніку" Вячаслава Рагойшы:

> Свабодны верш, або верлібр (франц. vers libre), – дысметрычны верш, у аснове рытму якога – чаргаванне вершаваных радкоў як аднатыпных інтанацыйна-сэнсавых адзінстваў. Надзвычай важнае значэнне набывае ў ім графічная разбіўка верша на радкі, вызначэнне месца міжрадковых паўз. Менавіта вершаваны радок як цэласны інтанацыйна-сінтаксічны і сэнсавы комплекс, выразна выдзелены паўзамі (а на пісьме – яшчэ і графічна), выступае ў В. у якасці асноўнай рытмічнай адзінкі...[3].

Нават фармальнага погляду на графічны выгляд версэту дастаткова, каб убачыць яго неадпаведнасць гэтай фармулёўцы, і найперш – праз адсутнасць рэгулярнай разбіўкі тэкста на радкі. Пры гэтым, можна прыгадаць творы з кнігі А. Разанава "Шлях-360", у якіх гэтая разбіўка робіцца – г. зн. аўтар паралельна ўводзіць у сваю творчасць як верлібры, так і версэты (першыя ўзоры датуюцца 1980-м годам). Такім чынам, размежаванне гэтых паняткаў усё ж выглядае неабходным.

А вось як сам А. Разанаў піша пра сваю новавынайдзеную форму ў аўтарскай анатацыі да першай публікацыі версэтаў у 1983 г.: *Мне ўяўляецца, што такая форма тоіць у сабе багатыя магчымасці: у ёй могуць арганічна спалучацца і лірычнае ўзрушэнне, і фабула, уласцівая апавяданню, і філасофская сентэнцыя, і эксперыментальны свет антыўтопіі і навуковай фантастыкі...*[4].

Гэтая цытата – наўпроставае ўказанне на жанравы сінкрэтызм версэта. Расейскі даследчык Юрый Арліцкі да "памежных" формаў, што ўзнікаюць у выніку ўзаемадачынення вершаванай паэзіі і прозы, адносіць версэ – *страфічную прозу, што складаецца са звышкароткіх абзацаў, якія нагадваюць звышдоўгія вершаваныя радкі*[5]. Дарэчы, як

[3] Вячаслаў Рагойша, *Паэтычны слоўнік*, Мінск 1979, с. 100.

[4] Алесь Разанаў, *Паэзія*, "ЛіМ", 26 жніўня 1983, с. 9.

[5] Юрий Орлицкий, *Стих и проза в русской литературе*, Воронеж 1991, с. 32–33.

адзін з варыянтаў версэ, згодна з іншай транслітэрацыяй, аўтар называе версэт. *Ад вершаў такія творы, – працягвае даследчык, – адрознівае адсутнасць у іх галоўнай фармальнай прыкметы вершаванай мовы – разбіўкі тэкставага маналіту на радкі* (што непазбежна для верлібра – *А. І.*), *а значыць – самой магчымасці "гвалтоўнага" разрыву і пераносу фразы ў наступны радок*[6].

Не залічваючы адназначна версэ ні да верша, ні да прозы, Ю. Арліцкі прапануе наступныя крытэрыі іх размежавання:

> ...калі радок доўжыцца і доўжыцца, пакуль не дойдзе да кропкі, наколькі б доўгім ён пры гэтым ні станавіўся, перад намі – версэ, калі яго прыпыняюць ці могуць прыпыніць паўзы ў канцы радкоў – верш (*у арыгінале – "стихи" – А. І.*). Калі ж за першым сказам ідзе другі, потым трэці і г.д., нарошчваючы радок, – перад намі звычайная, не версэйная, проза[7].

Даследуючы стогадовую гісторыю і эвалюцыю версэ, Ю. Арліцкі нават не разглядае магчымасць змешаных рысаў версэ і верлібру (магчыма, праз адсутнасць адпаведных узораў у рускай паэзіі). Разанаўскі ж версэт, на нашу думку, – прыклад менавіта такога змяшэння. Дзеля ілюстрацыі прывядзём адзін з твораў кнігі "Вастрыё стралы", які называецца "Пасткі" (1985 г.).

Каб не баяцца хадзіць у лес, панастаўлялі аднавяскоўцы ў лесе ўсялякіх пастак: на ліса, на рысь, на ваўка, на дзіка, на мядзведзя...

Пайшоў Сымон паглядзець, што трапілася ў яго самаловы, – трапіў у нейчыя сам,

пайшоў Тарас паглядзець, што трапіла ў яго петлі, – заблытаўся сам у нейчай,

пайшоў Дамінік паглядзець, што трапілася ў яго ямы, – нібы скрозь зямлю праваліўся, кудысьці прапаў...

І пачалі яшчэ горай людзі баяцца лесу:
там водзяцца рысі,
там водзяцца лісы,
мядзведзі,
ваўкі
і – пасткі[8].

---

[6] Тамсама, с. 33.

[7] Тамсама.

[8] Алесь Разанаў, *Вастрыё стралы*, Мінск 1988, с. 38.

Як бачым, і па логіцы аповеду, і графічна (адасоблены чыстым радком) твор падзелены на тры фразы (як і ў выпадку з паэмамі ў прозе, будзем называць іх строфамі). Першая страфа з фармальнага гледзішча ўяўляе чыста версэтавы ўзор. У другой страфе, у якой скарыстоўваецца сінтаксічны паралелізм, ужо маем рысы сінкрэтызму: пры лагічнай цэласнасці аповеду страфа разбіваецца на тры часткі. Гэтая разбіўка прызначана дзеля вылучэння частак сінтаксічнага паралелізму. У трэцяй страфе выкарыстана сінтаксічная анафара (гэтак жа часты для версэтаў прыём, як і паралелізм). З гледзішча рытміка-інтанацыйнай арганізацыі гэта, бясспрэчна, верлібр. Сэнсава трэцяя страфа звязвае першую і другую, з'яўляючыся адначасна іх падсумаваннем.

Прысутнічаюць у разгледжаным версэце, як і ў большасці іншых, відавочныя сюжэтныя складнікі. Так, першую частку можна разглядаць як экспазіцыю, другую – як завязку, трэцюю, да слова "ваўкі", – як кульмінацыю, і апошні радок – як развязку.

Логіка аповеду, яго закончанасць і цэласнасць, што набліжае версэт да міні-апавядання, поруч з выкарыстаннем стылістычных прыёмаў і верлібравых рытміка-інтанацыйных складнікаў сведчаць пра жанравы сінкрэтызм версэта. У анатацыі да кнігі выбранага А. Разанава "Лясная дарога" (2005 г.) знаходзім такое, небескарыснае, міні-азначэнне: *версэты – вершы, што сублімавалі асаблівасці іншых (ці аднаго універсальнага) жанраў.*

Сам А. Разанаў у гутарцы з аўтарам гэтай працы для раскрыцця адной з асноўных уласцівасцяў сваіх твораў вынайшаў новы, аказіянальны, "тэрмін": *Версэт стаўся, прынамсі для мяне, калі не універсальным, то сінтэтычным жанрам. Канцавыя рыфмы традыцыйных вершаў ён развёў па сцежках радкоў і здолеў паказаць, што самыя розныя гукі могуць* суадгукацца *паміж сабою, калі яны ўведзеныя ў адпаведнае сэнсавае поле*, – сэнсарыфмавацца (*вылучана намі – А. І.*)[9]. Пра "сэнсавае поле" – далейшая гаворка.

Для пачатку разгледзім два ранніх версэты А. Разанава – **"Птах"** (1982 г.) і **"Палёт"** (1983 г.). Гэтыя творы тэматычна звязаныя. Па-сутнасці, "Палёт" ёсць працягам "Птаха", ці адказам яму. Сёння, як па распрацоўцы тэмы, так і па падыходзе да паэтычнай матэрыі, гэтыя два творы можна лічыць класічнымі ўзорамі версэтавай формы. На пачатку ж 80-х падобныя творчыя пошукі ўспрымаліся не

[9] Алесь Разанаў, *Паэзія: "уводзіны ў невымоўнае"...*, с. 179.

інакш як рэвалюцыйныя для беларускай паэзіі. Прыгадаем артыкул Варлена Бечыка "Шляхам пошука", змешчаны ў кнізе А. Разанава "Шлях-360", у якім аўтар, абараняючы *няўрымслівы пошук* маладога паэта, спасылаецца на калектыўную кнігу "Паэзія сацыялізма. Мастацкія адкрыцці сацыялістычнага рэалізму": *Сацыялістычнай паэзіі сённяшняга дня часам не чужы нервовы напал экспрэсіянізму або дзёрзкая слоўна-вобразная асацыятыўнасць сюррэалізму...*[10]. Чым, як не "нервовым запалам" можна вызначыць творчы стан стваральніка радкоў, з якіх пачынаецца версэт "Птах": *Вялізны хцівы птах пагойдваецца нада мною. Я ведаю: ён чакае маёй загубы. Тады ён з галодным хрыплым крыкам апусціцца на маё цела і цвёрдай глюгай ударыць мне ў твар*[11].

Гэты твор, як і многія іншыя версэты, падобны да індыйскіх сутраў – лаканічных афарыстычных выказванняў, а таксама да яшчэ аднаго жанру старажытнай усходняй літаратуры – гэтак званых "дзэнскіх гісторый". І ў першых, і ў другіх асаблівая ўвага надаецца сістэме вобразаў, алегарычнаму падыходу. Так, у "Птаху" ідэя ўнутранага змагання, руху наперад увасоблена ў вобразах птаха, які *адзін суправаджае мяне на маёй жыццёвай дарозе*, лірычнага героя, які не здольны пацэліць у птаха, *свайго пракаветнага ворага*, і, уласна, стралы. У творы ёсць указанне на месца дзеяння – *бяскрайні стэп*, у якім адбываецца гэты бясконцы двубой (на бясконцасць указваюць эпітэты "бяскрайні" і "пракаветны"). Па сутнасці, месца дзеяння паўстае як яшчэ адзін, трэці, персанаж твора – свайго роду назіральнік.

Завяршаецца твор высновай-падсумаваннем, праз якую раскрываецца вобраз птаха, а разам з тым і алегарычны сэнс усяго двубоя: *Дый, урэшце, як бы я ведаў, куды мне ісці, калі б ён час ад часу не залятаў наперад?!*[12]

У версэце "Палёт" прысутнічае усё тая ж амбівалентная пара персанажаў: "я"-герой і птах. Іх узаемадачыненні гэтым разам маюць іншы характар. "Палёт" пачынаецца з запыту: *Дакуль мне яшчэ трываць?*, – адрасаванага, як відаць з далейшага, птаху, – *з якім я лячу праз імглістую бездань часу*[13]. Ідэя *нерухомага палёту праз стагоддзі*

[10] Алесь Разанаў, *Шлях-360*, Мінск 1981, с. 107–108.

[11] Алесь Разанаў, *Вастрыё...*, с. 11.

[12] Тамсама.

[13] Тамсама, с. 30.

– з няволі – у вызваленне, са скрухі – у радасць, з цемры – у светлыню... – блізкая да ідэі бясконцага руху скрозь бяскрайні стэп, услед за недасяжнай "пуцяводнай зоркай" лірычнага героя. Адпаведна і вобраз месца – "бяскрайні стэп" – блізкі да ўяўлення прасторы ў версэце "Палёт", дзе няма ні часу, ні дзеяння, ні, зрэшты, самой прасторы:

Я кармлю птаха сваім целам,
паю сваёй крывёю
і перастаю ўжо адрозніваць, дзе ён,
а дзе я, а дзе час...[14]

З фармальнага гледзішча ў «Палёце», у адрозненне ад «Птаха», назіраецца пэўны баланс паміж версэйнымі і верлібравымі элементамі. Так, гэта адбываецца нават у межах адной часткі, калі версэйны прынцып доўжання радка пры адказе птаха на запыт лірычнага героя (*"Дакуль мне яшчэ трываць?"*) пераходзіць у рытмізаваны кавалак з выкарыстаннем сінтаксічнага паралелізму, кожны з кампанентаў якога адасабляецца чырвоным радком:

датуль, пакуль хопіць часу,
датуль, пакуль хопіць цябе самога,
датуль, пакуль хопіць нас...[15]

Той жа прыём назіраем і ў апошняй страфе твора. У гэтым выпадку верлібравая частка ідзе папарадзе версэйнай. Пры гэтым сінтаксічны паралелізм (канструкцыя *і ўсё доўжыцца* захоўваецца і ў версэйным радку).

Усё загойваецца на мне маё цела,
усё аджывае ўва мне мая кроў,
усё патрабуе птах сабе новай ежы,
і ўсё доўжыцца праз стагоддзі наш нерухомы палёт[16].

Як бачым, у абодвух творах ідэя руху наперад звязана з пэўнымі пакутамі для лірычнага героя, без якіх сам гэты рух немажлівы. У першым выпадку герой, што выступае ў ролі свайго роду паляўнічага, які спрабуе пацэліць у няўлоўнага прывіднага птаха, увесьчасна знаходзіцца ў прадчуванні небяспекі, што сыходзіць ад апошняга. І нібыта праз гэта ён палюе-рухаецца следам за сваім ворагам. У версэце ж

[14] Тамсама.
[15] Тамсама.
[16] Тамсама.

«Палёт» відавочная алюзія з антычным міфам пра Праметэя (*Я кармлю птаха сваім целам...*), толькі ў дадзеным выпадку мае месца адмысловая “супраца”.

У гэтых версэтах (як і ў многіх іншых творах А. Разанава) відавочная алегарычнасць руху, з якой узнікае не раз адзначаны крытыкай *канцэпт шляху* як анталагічнае паняцце. Можна меркаваць, што на ўвазе маецца рух як пэўны інтэлектуальны ці духоўны рост. Тады што разумеецца пад вобразам птаха, які адначасна спрыяе і перашкаджае руху? Магчыма, тут адбываецца свядомая змена канатацый пэўных паняццяў. Так, птах, які харчуецца целам, можа азначаць акурат цялеснае, жывёльнае, якое замінае духоўнаму росту, але праз пераадоленне якога гэты рост адно і мажлівы.

Важнасць руху для А. Разанава ўжо на матэрыяле пункціраў другога зборніка паэта адзначыў Уладзімір Калеснік. Яго заўвагі і назіранні добра стасуюцца і да разглядаемых версэтаў:

> Паэтызацыя волі спалучаецца ў Разанава з паэтызацыяй дыялектыкі руху, палёту. Рух – гэта прычына і вынік усяго існага, гэта знаходкі і страты, дарога без пачатку і канца, бясконцасць малых і вялікіх арбіт... Рух – збавенне ад мёртвай неабходнасці абставін, ад горычы памылак і ад шчасця знаходак[17].

У версэце “Палёт стралы” (1986) метафара руху рэалізуецца зусім нечакана. Тут мае месца ідэя атаясамлення самога лірычнага героя са стралой: *Пакуль я жыву, я абкружаны небакраем, / пакуль я жыву, не магу дасягнуць небакраю: / ён – там, дзе спынюся, / ён – там, дзе ўпаду,*[18] – гэтак у адной з строфаў акрэсліваюцца каардынаты стралы-героя ў прасторы.

«Палёт стралы» адсылае да слаўназнаных апорый старажытнагрэцкага філосафа Зянона Элейскага, у адной з якіх – «Страла» – даводзіцца, што страла, якая ляціць, у кожным кадры часу займае месца, роўнае яе даўжыні, – адпаведна, насамрэч страла не ляціць, а знаходзіцца ў спакоі. Згадка гэтага псеўданавуковага, шматразова абвергнутага парадоксу карысная для нас тым, што, як і мысляр Зянон намагаецца надзяліць рэчаіснасць новымі (няхай і заведама «памылковымі») прасторава-часавымі характарыстыкамі, гэтак і Разанаў выбудоўвае ў версэтах *сваю* прастору і рэчаіснасць. Паэта захапляе

[17] Уладзімір Калеснік, *Зорны спеў*, Мінск 1975, с. 370.

[18] Алесь Разанаў, *Вастрыё...*, с. 61.

гульня з рухам і сэнсамі. Толькі «стаўшы стралой» мажліва змяніць мысленне, а г. зн. – пашырыць межы свядомасці.

Разанаўскі версэт часам успрымаецца як гэткая страла, пушчаная нацянькі да пэўнай мэты. Што гэта за мэта? Магчыма, – розум, *вольны ад асабовасці*. "Страла і мэта" – назва знакавага артыкула У. Калесніка пра творчасць Разанава. Сам паэт у памянёнай вышэй гутарцы так акрэслівае стасункі паміж гэтымі паняццямі:

> Двое яны адно: і намацаная мэта гэта ўжо і пушчаная страла. Што да медытатыўнай лірыкі, дык гэта страла, пушчаная некуды, – у ноч. Але не ў нікуды, і ноч, у якой усё растваряецца і ўсё прысутнічае, уцягвае яе ў сваё бязмежжа, а здані распачынаюць з ёю сваю размову. Тут шмат зману, і парадай маглі б быць словы Адама Міцкевіча: *Май сэрца і глядзі ў сэрца*[19].

Відавочна, што Разанаў укладае ў тэрмін "медытатыўная лірыка" іншы, чым агульнапрызнаны ў літаратуразнаўстве сэнс (вершы філасофскага зместу). У гэтым сэнсе паказальным бачыцца твор "...Вобразы вабяць услед за сабой" (1987), які закрывае версэтавую нізку зборніка "Вастрыё стралы".

Твор мае выразны вобразна-алюзійны план і даволі трывалую версэтавую структуру: 5 строф – звышфразавыя адзінствы (ЗФА) – напісаныя версэйнай прозай, уяўляюць з сябе адзін сказ (акрамя парадкавай чацвёртай часткі), які доўжыцца да кропкі, і адасоблены чыстым радком. Чацвёртае ЗФА складаецца з пяці сказаў, кожны з якіх пачынаецца з чырвонага радка. Верлібру з яго разбіўкай на радкі і інтанацыйнымі паўзамі тут ужо няма месца. Паэт свядома адмаўляецца ад графічнай рытмізаванасці. Пры гэтым, нельга казаць пра адсутнасць у творы рытму, стварэнню якога ў кожнай страфе спрыяюць сінтаксічныя паралелізмы, градацыя і інверсія. Так, у трэцяй страфе паралелізм і градацыя будуюцца на ўсё тых жа антанімічных парах: *Чалавек – гэта два чалавекі, як дзве далоні, што лепяць суладна снежку ці перакідваюць, каб утрымаць, жарыну: адзін з іх – пачатак, другі – завяршэнне, адзін з іх выток, і другі – суток, адзін з іх – прычына, другі з іх – вынік, адзін з іх – пытанне, другі – адказ, а паміж імі цякуць, вынікаючы з іх і ўпадаючы ў іх, сусветы*[20].

Пераходзячы да аналізу зместавага боку версэта "...Вобразы вабяць...", варта звярнуцца да медытатыўнай "тэрміналогіі". Усходняя

---

[19] Алесь Разанаў, *Паэзія: "уводзіны ў невымоўнае"...*, с. 179.

[20] Алесь Разанаў, *Вастрыё...*, с. 118.

філасофія (прыкладам, духоўныя практыкі дзэн) размяжоўвае паняткі *розум* і *інтэлект*, лічачы першае перашкодай на шляху да прасвятлення, ад якой неабходна пазбавіцца. Падкрэслім, што ў гэтыя словы ўкладаюцца не зусім тыя значэнні, што замацаваныя за імі ў свядомасці еўрапейца. Вось жа, мэтай медытацыі ёсць пазбаўленне ад думак, што спараджае розум, – для далейшага самазапаўнення "вялікім Інтэлектам". У гэтым сэнсе версэт "...Вобразы вабяць..." можна разглядаць як свайго роду "практыкум" для дасягнення ўнутранай гармоніі, складзены ў іншасказальнай, зашыфраванай форме. Далей паспрабуем расшыфраваць-патлумачыць яго.

Вобразы вабяць услед за сабой, але памкнуся за імі – і іх растворыць прастора: магчыма, яны проста птушкі, якія адводзяць таго, хто ідзе, ад сваіх затоеных гнёздаў[21].

Як бачым, у працытаванай уступнай страфе твора аповед вядзецца ад першай асобы, у якой мы пазнаем лірычнага героя іншых, у тым ліку і вышэй разгледжаных, версэтаў – *таго, хто ідзе*.

Найбольш карысная для нас далейшая рэфлексія: *ад іх* (сцежак – *А. І.*) *падымаецца стромкая вышыня і, падымаючыся над сабою, становіцца розумам цела, і, падымаючыся над сабою, розум становіцца ўсёразуменнем, якое, нібы ваданосныя жылы, сабой насычае і жывіць кожнае слова і кожны крок*[22]. Іншымі словамі, у выніку *ўзняцця над сабою* чалавек пазбаўляецца жывёльнага (*становіцца розумам цела*) – і напаўняецца боскім, сакральным (*усёразуменне*). Важна падкрэсліць, што лірычны герой не вызнае нейкую канкрэтную рэлігію ці вучэнне – ён пазаканфесійны, так бы мовіць *сам-сабе-рэлігія*. Канчатковы стан, стан свайго роду прасвятлення, медытатыўнасці, з'яўляецца, мабыць, вяршыневым для ўсіх духоўных практык (прыгадайма дзэнскае раздзяленне розуму і інтэлекту). Таму калі "боскае" перамагае ў чалавеку "цялеснае" – яно *насычае і жывіць кожнае слова і кожны крок*.

Матыў пераадолення ўнутранай раздвоенасці доўжыцца і далей, у чацвёртай страфе: *Калі чалавек сустрэнецца з чалавекам?*[23] – што азначае: калі чалавек здолее дасяжуць гармоніі ўнутры сябе (другое слова "чалавек", відавочна, падразумявае напісанне з вялікай літары). Але гэта не рытарычны запыт – маецца і "адказ": *Пачакай, памарудзь, адпусці жаданне – і ты перастанеш быць часткай, нацэленай*

[21] Тамсама.

[22] Тамсама.

[23] Тамсама.

супраць усіх...[24]. Спроба *адпусціць жаданне*, адсячы прыхільнасці ёсць падмуркам шматлікіх медытатыўных практык. Працытаваны ж радок насамрэч эрзац адказу: *тлумачэння* таго, *як* канкрэтна зрабіць тое, чаго ў версэце няма, ды яно і немагчымае для паэтычнага твора. Але сама форма звароту і дазваляе нам, вядома, з вялікай доляй умоўнасці, называць версэт "практыкумам".

Г. Кісліцына слушна вылучае як адну з характэрных рысаў версэта *наяўнасць у ім адносна самастойнага сказу-выніку, які, аднак, нельга назваць падагульняючым, бо ён нясе на сабе функцыю ключа, арыенціра далейшых разваг*[25]. Такі сказ-вынік, які адначасна і падсумоўвае, і звязвае строфы твора, маецца і ў версэце "...Вобразы вабяць...". З аднаго боку сістэма версэта адкрытая і не прадугледжвае абавязковасць пэўнай маральнай высновы. У той жа час, пры адноснай "развязанасці рук" з фармальнага гледзішча, паэт усё ж змушаны трымацца пэўных унутраных законаў у межах створанага жанру. Гэты сказ успрымаецца як свайго роду шматкроп'е да твора, сэнсавая дамінанта, і сапраўды скіроўвае да далейшых разваг: *...і вернуцца да цябе тыя птушкі, якія не ловяцца, калі іх ловіш, якія хаваюцца, калі іх шукаеш, і ты пачуеш: у кожнай птушкі – твой голас, і ўбачыш: у кожнай птушкі – твой твар*[26].

Тэма ўнутранага двубою набывае новае выяўленне ў версэце з далейшай кнігі "Паляванне ў райскай даліне" – "На нямецкай дарозе" (1992). Трымаючыся прынцыпу структурнага аналізу, што прымяняўся вышэй, спярша адзначым месца дзеяння версэта, якое вызначаецца ўжо ў назве твора. Першая страфа ўводзіць адразу і месца, і двух персанажаў твора: *Там, дзе адна дарога ўпадае ў другую, да мяне падбягае, аднекуль узяўшыся, нізкі, з кутасікамі ў вушах, настойлівы звер*[27].

Пакуль усё адпавядае ранейшай сістэме вобразаў: ёсць той, хто ідзе і ёсць перашкода на ягоным шляху. Як адзначалася вышэй, усе вобразныя складнікі тэксту варта разглядаць алегарычна. У дадзеным выпадку дарога сімвалізуе шлях да пэўнай духоўнай звышмэты ("прасвятлення"), звер – цялеснае, што перашкаджае духоўнаму цалкам завалодаць сітуацыяй. Далей пачынаюцца разыходжанні. Калі

---

[24] Тамсама.

[25] Г. А. Кісліцына, *Алесь Разанаў: Праблема мастацкай свядомасці*, Мінск 1997, с. 119.

[26] Алесь Разанаў, *Вастрыё...*, с. 119.

[27] Алесь Разанаў, *Паляванне ў райскай даліне*, Мінск 1995, с. 22.

ў ранейшых творах перашкода адначасна была і стымулам для руху (“Птах”) альбо яго часткай, небходнай умовай (“Палёт”), то ў “На нямецкай дарозе” яна ёсць той сілай, што нібыта цягне назад. Каб задобрыць звера, лірычнаму герою даводзіцца кідаць зверу ежу з сваёй торбы:

Звер глытае мае пачастункі і, калі яны канчаюцца неўзабаве, падступаецца да мяне бліжэй – нібыта я даставаў іх з самога сябе і сам я таксама – сала, мяса і каўбаса[28].

З далейшага дазнаемся, што мэтай падарожніка з’яўляецца “белы горад”, што віднеецца ўдалечыні. *У ім жывуць Немцы – іншыя людзі па мове і разуменні, як трэба жыць / Але, каб трапіць туды, я мушу паразумецца са зверам, а ён усё болей раз’ятрываецца і выклікае ўва мне ўсё большую боязь, усё большы страх*[29]. Такім чынам, дзеля таго, каб дасягнуць жаданага гораду (відавочнае перагуканне з матывамі “Вандроўнага гораду”), стаць “Немцам”, трэба ўлагодзіць унутранага звера, цялесную сутнасць. Аказваецца, што дзеля гэтага недастаткова адсячэння матэрыяльнага.

Развязка твора наступная: з другога канца дарогі *чуюцца раптам цвёрдыя нейчыя крокі, іх чуем і я, і звер.* Натуральна, гэта “Немец”, які сваім з’яўленнем змушае звера знікнуць *у глыбокіх, парослых кустамі,* [але!] *блізкіх равах*[30].

Хутчэй за ўсё гэтую мараль твора трэба разумець як тое, што немагчыма прайсці шлях самому, без гіда ці настаўніка. Дарэчы, неабходнасць настаўніка строга рэгламентаваная ва ўсходніх вучэннях.

Прасочым далей эвалюцыю фармальных і зместавых рысаў разглядаемай паэтычнай формы. Версэт, які мае назву “Маму Тхакур дас” (1992), з кнігі “Паляванне ў райскай даліне” раскрывае некаторыя моманты духоўнага развіцця А. Разанава, што, у сваю чаргу, дазваляе лепей зразумець вытокі тэмаў і матываў іншых яго твораў. Гэты версэт мае куды большую сувязь з асобай аўтара, яго біяграфіяй, чым абстрактны вобраз лірычнага героя з “Вастрыя стралы”.

Зазванілі званочкі, усплёснуліся кімвалы, узнесліся галасы. “Харэ Крышна, Харэ Крышна, Крышна-Крышна...” – творыцца махамантра.

---

[28] Тамсама, с. 23.

[29] Тамсама.

[30] Тамсама.

Маму Тхакур дас у аранжавым аблачэнні сядзіць, скрыжаваўшы ногі, і, пакуль раздаецца з тацы прасад, гаворыць: "Мінуліся тыя часы, калі нас можна было палічыць па пальцах, цяпер нас шмат..."

Прысутныя, што прыйшлі на гадзіну сустрэчы, слухаюць, згодна ківаюць галовамі і задаюць пытанні[31].

Як бачна ўжо з гэтага ўрыўка, апавядальнасці ў версэце паболела, тады як іншасказальнасці яўна паменела. Перад намі – апісанне пэўнай падзеі, у якім адсутнічае экспрэсіўная лексіка, паралелізмы, іншыя стылістычныя фігуры, усё тое, што заклікана спрыяць паэтызацыі твора. Відавочна, што фармальна, нават на графічным узроўні, твор значна болей набліжаны да версэйнай прозы. Тэкст трымаецца на сюжэтнасці, дзе сэнсавы план выходзіць на першае месца.

Твор "Маму Тхакур дас" пабудаваны на прыёме кантрасту – калі дзейсніцца проціпастаўленне розных сітуацый. Паэт-апавядальнік нібыта знаходзіцца па-над гэтымі сітуацыямі, з настальгічным сумам ды іранічнасцю аглядаючы пэўны этап свайго жыцця. Як адна з нязменных рысаў версэтаў тут прысутнічае сказ-вынік (традыцыйна заключная страфа), што нясе на сабе ўсё тыя ж функцыі сувязі частак і ў якім сфармулявана асноўная думка твора.

А я згадваю тыя часы, калі Маму Тхакур дас быў проста Міша, калі нікога не трэба было лічыць ні па пальцах, ні як інакш, калі кожны быў значны не тым, што знайшлося, а тым, што шукалася, што спасцігалася і што не мела найменння...

І мне шкада тых магчымасцяў і тых часоў[32].

Тыя страчаныя часы пошукаў, па якіх настальгуе лірычны герой, можна суаднесці з тымі, што выяўлены ў версэце "...Вобразы вабяць...". Але ж гэта былі часы нацыянальнага застою, чарговая змрочная эпоха ганенняў, калі інтэлектуал свядома абіраў працу вартаўніка ці смеццяра (такіх выпадкаў сярод беларускіх творцаў нямала) з прычыны немагчымасці супрацоўнічаць з тымі ўладай і ідэалогіяй. У літаратуры існаваў шэраг "закрытых", табуяваных тэмаў, якія, калі і закраналіся, то ў вельмі завуаляваным выглядзе. У гэты час з'яўляюцца найбольш іншасказальныя тэксты Разанава, што змушаюць да чытання "між радкоў". Пасля прыходу "галоснасці" рэчы пачынаюць называцца сваімі імёнамі, пра многае становіцца магчымым выказацца

[31] Тамсама, с. 25.

[32] Тамсама.

адкрыта. Змяняецца і алегарычнасць версэта Разанава: знікае недагаворанасць, значна пашыраецца кола тэмаў і праблематыкі. Версэт набывае большую апавядальнасць, змяншаецца ўжыванне сродкаў паэтызацыі. Калі з'ява ці прадмет атрымліваюць сваё найменне (іншымі словамі, калі Міша становіцца Маму Тхакур дасам), знікае сэнс пошуку, сэнс мастацкага супраціву. Але мастацкасць твораў не змяншаецца.

Версэт у сваім пачатковым выглядзе, верагодна, пачынае стамляць і аўтара, і чытача: пасля версэтаў кнігі "Вастрыё стралы", якія ствараліся цягам сямі гадоў, назіраецца часовы спад цікавасці аўтара да гэтага жанру, які саступае месца новай эксперыментальнай форме – вершаказу. З 1987-га да 1990-га гг. не напісана ніводнага версэта. У зборніку "Паляванне ў райскай даліне" сярод вершаказаў, паэм і зномаў версэт займае адносна сціплае месца (прадстаўлена ўсяго 24 творы). З 1994-га да 1997 гг. назіраем вяртанне да версэтаў, якія ўвайшлі ў кнігу "Рэчаіснасць" (1998). На гэтым этапе можна канстатаваць большую празаізацыю гэтай эксперыментальнай формы, што праяўляецца ўжо на графічным узроўні: строгая падзеленасць на строфы, пераважная адсутнасць унутраных паўзаў і вынесеных радкоў.

Перад тым, як разгледзець найбольш характэрныя рысы версэтаў "Рэчаіснасці", заўважым, што размешчаны яны ў кнізе ў храналагічным парадку.

Твор, які адкрывае кнігу, называецца "Кладкі" (1994). Ён складаецца з пяці версэйных строфаў, кожная з якіх утрымлівае закончанае паведамленне і звязваецца з іншымі агульнай ідэяй:

Мы ідзём па дрыгве.

Абапал тояцца прорвы, буяе жоўтая лотаць, тоўпяцца на куп'і пукі сітнягу[33].

Адразу звяртае ўвагу ў гэтай першай страфе множны лік першай асобы, ад імя якой вядзецца аповед, што нячаста сустракаецца ў версэтах. Калі ў шматлікіх разгледжаных творах гаворка ішла пра духоўны шлях аднаго індывіда, то ў гэтым выпадку можна казаць, пра спробу асэнсавання шляху калі не нацыі, то пэўнай яе, найбольш актыўнай, часткі.

Нашто шукаць сваёй згубы? – нам кажуць старыя людзі. – Прыйдзе час, і яна сама, каго трэба знойдзе[34].

---

[33] Алесь Разанаў, *Рэчаіснасць*, Мінск 1998, с. 11.

[34] Тамсама.

Гэтым людзям, што, напэўна, маюць сваіх рэальных прататыпаў, (атмасферу дзідаламальнага часу напісання твору няцяжка ўзнавіць, пагартаўшы хаця б шматтыражную тады газету "Літаратура і мастацтва"), даецца адказ, у якім утрымліваецца і рытарычны запыт:

Не згубы, аднак, мы шукаем, а выйсця – з жыцця, што, не маючы мэты, туліцца ўскрай дрыгвянога бязмежжа, і хіба мы прычынай таму, што выйсце ў ім гэтак шчыльна з'яднана са згубай, а тое, што ёсць, з тым, чаго няма?[35]

Канцэпт балота, рэгулярны для ўсёй беларускай літаратуры, займае, паўторымся, асаблівае месца і ў творчасці А. Разанава. Беларуская рэчаіснасць, а праўдзівей – выйсце з яе, атаясамліваецца ў версэце "Кладкі" з тым самым згубным балотам, "дрыгвяным бязмежжам", што ахінае гэтую рэчаіснасць, прайсці праз якое, на думку аўтара, – адзіна магчымы шлях да лепшага.

Але, як сцвярджае аўтар, сітуацыя павальнае неўразумеласці і дэзарыентаванасці была не заўжды: *Некалі праз дрыгву былі пакладзены кладкі, і людзі тады разумелі, к у д ы жывуць, але даўно ўжо кладкі ўбіліся ўглыб, засмакталіся прагнай дрыгвою, і трэба цяпер ісці наўздагад*[36]. У гэтых словах няма дыдактызму, што часцяком прыпісваецца творам Разанава падобнага плану, – адно скрушлівая канстатацыя. Тое, пра што трэба доўга і пераканаўча казаць-тлумачыць, выяўлена тут лаканічнай мовай сімвалаў і алегорый:

Мы гразнем, мы сумняваемся, мы вывяраем крокі і, калі раптам правальваемся ў згубную глыбіню, знаходзім гэтак жа раптам апірышча – страчанае, старое, аднятае, але ўсё роўна заўсёды прысутнае патаемна ў нашых адчайных памкненнях, –

к л а д к і[37].

Кладкі, па-за кантэкстам семантычна слаба маркіраванае слова, у версэце набывае канатацыю сімвала нацыянальнай памяці, глыбінных, можа, нават генетычных пластоў свядомасці.

Акурат такі ж самы прыём, калі ключавое слова-сімвал, вакол якога разгортваецца дзея твора, з'яўляецца адначасна і словам-вынікам, сустракаем яшчэ ў шэрагу версэтаў сярэдзіны 1990-х ("Бульбіны", "Навіны", "Алёсы", "Спрадвечны пыл").

Версэты "Рэчаіснасці" і далейшай творчасці паэта вызначае моцны аўтабіяграфічны пачатак, адрозны ад псеўда-асабовасці разных

[35] Тамсама.

[36] Тамсама.

[37] Тамсама.

твораў, дзе аповед і вёўся ад асобы лірычнага героя, але сам гэты лірычны герой да асобы аўтара меў даволі апасродкаванае дачыненне. Аўтабіяграфізм гэты можна параўнаць з тым, які мае месца ў паэмах сярэдзіны 1970-х гг. Прыгадаем, прыкладам, "Паэму рыбіны" і "Паэму сланечніка", дзе апісваюцца рэальныя варункі дзяцінства аўтара з канкрэтнымі персанажамі (сястра, бацька, Тэкля) у святле вобразаў і алегорый. У версэце "Маленькія ночвы" (1994) паэт звяртаецца да дзяцінства, каб пашырыць свой духоўны досвед, лепей зразумець пэўныя прычыны сябе-такога-які-ёсць.

Тут ізноў ёсць сказ, што ўводзіць у пэўную сітуацыю – без дэталяў, тлумачэнняў, абгаворванняў яе, ад якога адштурхоўваецца далейшая дзея: *Нехта стукае ў дзверы.* Сказ адасоблены ад наступнай страфы чыстым радком і ўяўляе закончанае звышфразавае адзінства:

Я доўга, не ведаючы, хто гэта стукае, не адчыняю, а калі адчыняю, бачу: стаіць за дзвярыма бацька з маленькімі ночвамі ў руках[38].

Ізноў жа – нічога лішняга: няма апісання знешняга выгляду бацькі, пачуццяў лірычнага героя, зрэшты, нейкага тлумачэння, чаму лірычны герой проста не можа спытаць, хто за дзвярыма. Бацька кажа: *Пакуль ты мне адчыняў, я схадзіў пад царкву і ўзяў вось гэтыя ночвы, каб і м і стукаць у дзверы. / Ці помніш ты гэтыя ночвы: ты ў іх купаўся, калі быў малым...*[39]

Невытлумачальна, чаму бацька хадзіў па ночвы "пад царкву", але відавочна, што "дзверы", у якія грукаецца бацька тымі (свянцонымі?) ночвамі выступаюць метафарай падсвядомага, з якога гэты вобраз з'явіўся. На гэта ўказвае і далейшая (заключная) страфа, дзе слова "дзверы" ўжыта наўпрост у алегарычным сэнсе:

Я гляджу на маленькія ночвы і, нібы ўва мне адчыняюцца нейкія дзверы, у іх пазнаю, што і помніць не помню, што згадваць не згадаю і што не мае ні вобразу, ні найменя, а мае мяне самога, –

с в а ё[40].

Вобразам маленькіх ночваў, вобразам маленства, цвердзіцца пра тое, што на шляху да свайго сапраўднага сутва трэба ісці не толькі "наперад", але і "назад", да сваіх каранёў, углыб сябе. А карані Разанава, звышэрудаванага, начытанага, авалодаўшага некалькімі славянскімі, літоўскай, нямецкай мовамі – растуць з вёскі Сялец, з бацькі,

[38] Тамсама, с. 29.

[39] Тамсама.

[40] Тамсама.

“вясковага анучніка”, з гэтых кранальных маленькіх ночваў, і нават з “дрыгвянога бязмежжа”, якое трэба было агараць на шляху да аднаго з першых майстроў інтэлектуальнай паэзіі.

Акрамя паўтаральных тэмаў, у версэтах Разанава існуюць і персанажы, што пераходзяць з тэксту ў тэкст. Так, вельмі адметны вобраз бацькі сустракаем, апроч разгледжанага, у версэтах “Змеі”, “Нож з драўлянымі тронкамі”, “Бацькавы рэчы”. У “Змеях” прысутнічае і вобраз Тэклі, што ўпершыню ўзнік у “Паэме сланечніка”. Шырока ўводзіць паэт у тэкст і іншыя асабовыя імёны – як правіла, гэта імёны ці мянушкі яго былых аднавяскоўцаў, сяброў дзяцінства. Яны могуць складаць нават загаловак версэта (“Гаворка Саша”, “Іван Гуговіч”, “Сяргей Цыган”, “Ляснік Амелька”). Адзін з першых выпадкаў увядзення такога “народнага” імя ў твор маецца ў паэме “Было балота” (экскаватаршчык Абравец).

Наогул загаловак адыгрывае ў версэце адмысловую ролю. На яго значнасць указвае ўжо той факт, што з усяго творчага набытку А. Разанава (па нашых падліках – болей за дзвесце адзінак) не набярэцца і дзесятка версэтаў, якія не маюць назвы. Часта яна складаецца з аднаго слова – аб’екта, ключавога вобраза, вакол якога будуецца тэкст, і адразу ўводзіць у пэўнае тэматычнае кола (“Зброя”, “Апора”, “Шыльдачкі”, “Камяні”, “Змеі”, “Дрэвы”, “Госці”, “Рэчы”, “Заваёўнікі” і інш.). У ранніх версэтах сустракаецца прыслоўная назва. Так, у невялікім па памеры творы “Дарэшты” (1980) – адным з першых версэтаў Разанава – назва засяроджвае ўвагу на ключавым слове, якім гэты твор заканчваецца. Уся логіка версэта скіравана да гэтага слова-выніка. У іншым раннім творы, “Навобмацак” (1981), наадварот, ключавое слова стаіць напачатку, і ад яго “адштурхоўваецца” тэкст. У “Дарэшты” ж рух паэтавай думкі – рух да загадзя вызначанага пункту.

Прыслоўныя назвы сустракаем не толькі ў першых версэтавых спробах паэта. Твор “Адгэтуль” (1986) – цікавы прыклад версэта, дзе ключавое слова хаця і стаіць у канцы, сэнсава не завяршае аповед. Паэт імкнецца ўвесьчасна вынаходзіць новыя прыёмы, спрабуе здзіўляць, абнечаканьваць чытача. У апошніх дзвюх строфах заключана паведамленне, якое можна інтэрпрэтаваць, як свайго роду паэтычнае крэда А. Разанава сярэдзіны 1980-х гадоў:

Але не магу я вярнуцца туды, дзе ўжо быў, – проці сваіх слядоў,
і не магу затрымацца тут, дзе знаходжуся сёння.
Мая прастора – мяжа.

Мой час – вастрыё.
Мой шлях – шлях агню: адгэтуль[41].

У пазнейшых версэтах можна канстатаваць з'яўленне ў назвах займеннікаў: неазначальных ("Нешта" (1997), "Нехта" (1999)) і азначальнага ("Кожны" (2005)).

Бывае, што для назвы розных твораў рознага часу паэт выкарыстоўвае адно і тое слова, ставячы парадкавы нумар. Так сталася з версэтамі "Рэчы" і "Заваёўнікі", якія ўпершыню з'явіліся ў кнізе "Вастрыё стралы" і з цягам часу аформіліся ў паэтычныя цыклы. У кнізе "Лясная дарога" гэтыя творы сабраныя разам у адпаведныя нізкі з указаннем гадоў стварэння (цыкл "Заваёўнікі" ў поўным аб'ёме ўпершыню быў надрукаваны ў першым нумары часопісу "Arche" за 2002 год).

"Рэчы" і "Заваёўнікі" – самы пераканаўчы прыклад статычнасці жанравых межаў версэта, пра якую вялася гаворка на пачатку. Так, першы версэт "Заваёўнікаў" датуецца 1982 г., "Рэчаў" 1983 г., а апошні ў абодвух выпадках – 2001 г. Пры гэтым стварэнне працягу цыклаў адбывалася спарадычна: напрыклад, прамежак паміж першым (кніга "Вастрыё стралы") і двума наступнымі ("Паляванне ў райскай даліне") версэтамі складае роўна дзесяць гадоў. Як кажа сам паэт, яны пісаліся *наплывамі і ўсё яшчэ застаюцца дарэшты не выказанымі*[42] – таму не выключана, што чытача чакае іхні працяг.

Яны ідуць па чужой зямлі.
Кожны іх крок – парушэнне невідавочнай мяжы, якая ўтрымлівае іх саміх у іхніх абліччах, у іхніх імёнах, у іхніх жыццях...
Яны выходзяць з сябе: скура старых забаронаў вываročваецца на левы бок.
На іх наведзена пільная лінза нябёсаў.
Сярэдзіна свету перамяшчаецца разам з імі.
За імі гарыць зямля.
Яны не змогуць вярнуцца[43].

Такі першы версэт цыклу «Заваёўнікі». І тут, і нідзе далей, у тэксце не вымаўляецца слова, што стаіць у загалоўку. Замест яго скарыстоўваюцца асабовыя займеннікі: у першым і трэцім версэтах «яны», у астатніх – «вы». Хто ж «яны» такія, каго мае на ўвазе

[41] А. Разанаў, *Вастрыё...*, с. 51.
[42] Алесь Разанаў, *Паэзія: "уводзіны ў невымоўнае"...*, с. 179.
[43] Алесь Разанаў, *Лясная дарога: версэты*, Мінск 2006, с. 181.

паэт пад гэтым найменнем? Адназначнага адказу на гэта ў тэксце не знойдзем. Няма і сказа-выніку, у якім даваліся б пэўныя тлумачэнні, але ёсць сказы-ключы. Тэкст «Заваёўнікаў» поўны алюзіяў ды іншасказальнасці, гэта свайго роду загадка, якую чытач мусіць разгадваць, паступова рухаючыся следам за думкай і вобразамі паэта – ад версэта да версэта, праз гады асэнсавання.

У прыведзеным версэце, як бачым, няма раздзялення на строфы. Кожны сказ пачынаецца з чырвонага радка і мае падобную сінтаксічную канструкцыю, лагічна залежную ад папярэдняга – як вынік – і ад слова «Заваёўнікі», пазначанага ў загалоўку. Кожны сказ дае яму пэўную характарыстыку. Гэткі ж прынцып так ці інакш захоўваецца ва ўсіх далейшых версэтах. У творы, што ўвайшоў у кнігу «Паляванне ў райскай даліне» пад назвай «Заваёўнікі-II» (разам з парадкавымі трэцім і чацвёртым) сярод іншага ёсць такое дапаўненне да характарыстыкі:

Бы жменя зярнят, сыпанутых у неабсяжнасць, вы несяце з сабой старажытны – і зноў абуджаны – змест.

І кожны жыхар, кожны дом, кожны камень і дрэва заваяванага краю маюць да вас асабістае дачыненне і мусяць сустрэцца сам-насам з вамі, каб нешта – ужо забытае – зноў убачыць і зноў зразумець [...]

Вы – першыя: нібы жанчына, чужына вас вабіць у глыб непазбежнасці – у нябыт[44].

Такім чынам, ужо можам акрэсліць шэраг ключавых слоў, што маюць рэгулярную паўтаральнасць у тэксце: *яны (вы)* – г. зн. заваёўнікі, што *ідуць па чужой зямлі*, сама гэтая зямля (*заваяваны край*) і шлях па ёй як *парушэнне невідавочнай мяжы*. Асэнсаванне паэтам гэтага шляху цягам розных гадоў змяняецца, як карэктуецца і сэнс, укладзены ў ключавы вобраз. Так, у чацвёртым версэце (датуецца 1993 г.) з'яўляецца іншы план погляду, які ўзнікае пасля ўвядзення новага матыву – пошуку ў «іх», заваёўніках, ідэі Бога.

«Бог абірае таго, хто сам сябе здольны абраць», – вы пераконваеце з дня ў дзень рэчаіснасць,

а яна гэтаксама, з дня ў дзень, пераконвае вас, што Бог, якога вы маеце, мёртвы,

што Бог, якога вы маеце, – с м е р ц ь[45].

---

[44] Тамсама, с. 181–182.

[45] Тамсама, с. 183.

Адсюль вырастае небяспечная філасофія ўседазволенасці. Разанаў не асуджае. Ён канстатуе і аналізуе, сягаючы ў сваіх развагах псіхалагізму прозы Дастаеўскага поруч з прарочай сугестыўнасцю вершаў Нострадамуса, што найбольш праяўляецца ў творах 2001 г. (часткі VI–XVI).

Што дазваляецца чалавеку, калі няма Бога, і што дазваляецца, калі ёсць, – пытаецца ў вас то адна, то другая думка, а вы – па-за думкай і па-за думкай, і шлях ваш просты і востры, быццам лязо нажа[46].

Наступствам адмаўлення Бога, а г. зн. – пакаральнасці за ўчынкі, узнікае ілюзія вышэйшасці, адасобленасці ад «простых смяротных». Прыгадайма: ніцшэанскі Заратустра адкрыў у сабе «звышчалавека» пасля таго, як зразумеў, што Бог памёр. Ідэя, укладзеная ў разанаўскіх «Заваёўнікаў», блізкая да ідэі нямецкага філосафа, паводле якой чалавек характарызуецца як канат, што нацягнуты паміж жывёлай і звышчалавекам – «канат над прорвай». Прыгадаем, што падобны матыў духоўнай разарванасці выразна гучыць у Разанава ўжо ў «Паэме незавершанага сказа» (*гэта я, / ні аб'ект, ні суб'ект, проста я: / бог, вар'ят і пачвара...*).

За вамі ўзнікаюць і апярэджваюць вас пагалоскі, што вы не людзі, і дзіўная радасць, што вы сапраўды не людзі, вам укладаецца ў грудзі і вас уздымае над смерцю і над жыццём[47].

Так, паэт не асуджае, але адасабляецца ад аб'екту апісання праз тое самае «вы», хаця тут можна ўбачыць і пэўныя перагуканні з яго ранейшымі творамі. Версэт – не той жанр, які *фармулюе*. Паэт не прадукуе тут філасофскія сентэнцыі, падносячы іх у завершаным выглядзе. Для гэтага існуе жанр зномаў, сціслых і ёмістых філасафем. У версэтах пакідаецца месца для дадумвання, дзейсніцца гульня з сэнсамі, ідэямі, адбываецца пераасэнсаванне матываў, якія ўжо спрабаваліся быць раскрытымі. Так, у версэце «Sumus ne simus» (1992) паэт падступаецца да ідэі адмаўлення быцця ў звыклых межах, якая ў крыху трансфармаваным выглядзе прысутнічае ў «Заваёўніках».

Мы не такія, мы іншыя, але мы апынуліся тут, і тутэйшае навакольле пераконвае нас няспынна, што мы гэтакія, як усе[48], – апісвае паэт сваё пачуванне не-на-сваім-месцы, укладаючы ў гэтае «мы»

[46] Тамсама, с. 187.

[47] Тамсама.

[48] А. Разанаў, *Паляванне...*, с. 26.

настрой цэлага пакаленя беларускай інтэлігенцыі, змушанага пражываць жыцці ў амаль варожых умовах, не здольнага напоўніцу раскрыць свой унутраны патэнцыял... *Мы не такія, мы іншыя, але мы апынуліся тут, і тутэйшае навакольле пераконвае нас няспынна, што мы гэтакія, як усе.* Разанаўскае «Sumus ne simus», «Мы ёсць, каб не быць» успрымаецца як перадумова да слаўназнанай тэзы айчыннага мысляра Валянціна Акудовіча «Мяне няма». «Мы ёсць, каб не быць» тымі, кім мусім быць – такім чынам можна завершыць разанаўскую фразу.

У дзевятай частцы «Заваёўнікаў» знаходзім іншую трактоўку гэтай думкі.

З мноства магчымасцяў, што паўстаюць перад вамі, вы абіраеце тую, што вас разумее найбольш, найглыбей, найпаўней, – н е м а г ч ы м а с ц ь,

і чорныя сонцы ўглядаюцца вам у вочы,

а смага вас поіць горкай вадой.

Быццам даецца святое, якое аддацца назад не можа, вам давяраецца даўняя таямніца пра тое, што азначае ***насамрэч не быць*** *(вылучана намі – А.І.)*[49].

Стан небыцця, да якога паэт прылічае сябе (у версэце «Sumus ne simus»), адрозніваецца ад стану Заваёўнікаў тым, што іх ніхто не змушае «не быць», яны самі, у сілу сваіх унутраных акалічнасцей, абіраюць шлях да яго. Шлях «углыб сябе», бо, чытаем далей: *У сарцавіне рэчаў няма іх – рэчаў, / і ў сутнасці чалавека няма яго – чалавека, / і шлях ваш углыб сябе.*

З усіх канцоў свету збіраюцца госці на свята, і свята спявае.

Паспеў небывалы ўраджай, і час, завяршаючыся, падрыхтаваў усім падарунак.

Апошнім прыходзіць жаніх і смерць бярэ за нявесту.

Расплюшчылася – і з груды старога рыззя глядзіць відушчае вока[50].

Паэт, відавочна, намагаецца ўнікнуць банальнасці. Але ў развагах пра жыццё і смерць гэта наўрад ці атрымаецца. Думку папярэдне працытаванага заключнага версэта цыклу можна сфармуляваць «простымі» словамі: усе роўныя перад смерцю. Альбо перад Богам. «Свята», што збірае гасцей, сімвалізуе канец, завяршэнне місіі чалавека

[49] А. Разанаў, *Лясная...*, с. 185–186.

[50] Тамсама, с. 189.

на гэтым свеце. І кожны, колькі б багацця ён ні назапасіў за жыццё, колькі б ні *заваяваў* улады і пашаны, роўны перад поглядам «відушчага вока». Таму ці апраўданы шлях заваяванняў? Ці не правільней ісці шляхам пашырэння свядомасці, адкрыцца свету і... гэтак заваяваць яго?

Баль-танец нябесных святлаў распачынае лірычнае дзеянне верша "Змяіны цар", ключавым кампанентам якога з'яўляецца харавод – старадаўні масавы танец, што суправаджаецца песнямі і драматычным дзеяннем: *У цёмным небе – хараводы // Сіняватых зорак...*" (56). Харавод – дзеянне зладжанае, прыгожае, дасканалае. А нябесны харавод успрымаецца як вышэйшая, ужо дасягнутая гармонія, да якой імкнецца ўсё зямное... *Вяршынны пункт паэзіі Багдановіча знаходзіцца ў касмічнай высі (як цэнтры ідэалу)...*[9] Таму краса нябеснага хараводу і вабіць-кліча срэбраных змеек *з цесных, душных, падзямельных нораК* у шлях да цёплага выраю. Гэты шлях – імкненне наблізіцца да вечнага нябеснага хараства, гармоніі – паўстае ў вобразах срэбных стужак, што праляглі па лясах, палях. Гэта – вектар, што мае пачатак і бясконца імкнецца да завяршэння, да хараводу, што сімвалізуе кола, якое не мае ні пачатку, ні канца. Сімвал бясконцага руху, вечнага жыц-

[8] Тамсама, с. 82.

[9] І. Э. Багдановіч, *Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага Адраджэння*, Мінск 2001, с. 96.

ця, жыцця ў раі. Змяінага цара не палохае нішто ў гэтым руху, нішто не можа быць перашкодай. Так, да сустрэчы з чалавекам, гаспадаром зямных абшараў, каб перайсці зямную мяжу, падрыхтаваны багаты водкуп: *Залаты ражок яму// Я ўраню з Кароны.* Тут таксама – водгук старадаўняга міфа пра чарадзейныя ўласцівасці ражка з залатой кароны змяінага цара, атрыманага ад удзячнага госця-змея.

У гэтым кантэксце дарэчы будзе прааналізаваць матыў балю ў вершы "Срэбраныя змеі", што не ўвайшоў у змест "Вянка", але ў час першай публікацыі ў "Нашай Ніве" ў 1911 г. меў пазнаку: З цыкла "Вадзянік". Таму ён мае непасрэдную сувязь з нізкай "У зачараваным царстве".

У вершы адлюстраваны матыў балю, пазначаны вытанчанай эротыкай, што сягае ў глыбіні часу, успрымаецца як водгалас старадаўніх культаў, якія абагаўлялі каханне. Выпушчаныя на волю з водных глыбіняў воляй вадзеніка, срэбныя змеі распачынаюць свой баль:

Будуць яны ўсю ноч віцца,
Ў хвалях хрыбтамі блішчаць;
Будуць сціскацца, круціцца,
Гэтак да рання гуляць (239).

Літаратуразнаўца Ірына Багдановіч гэтак трактуе намаляваную Максімам Багдановічам карціну: *Бліскучы рухомы клубок, абуджаны ветрам, выбляе на азёрнай паверхні тонкія дзівы, што літаральна зачароўвае назіральніка з уражлівай паэтычнай душой*[10]. Гэта і ёсць дзівы кахання. Гэта – эратычны баль, як піша далей даследчыца, *начны фэст, начное свята падобна стыхіі, што разняволіла скаваныя магчымасці прыроды і духу"*[11]. Гэтае дзіва асвечана Небам, срэбным святлом месяца. Маладзік не толькі сведка, але і мастак, майстра, які ўпрыгожвае клубок змеяў срэбнымі пералівамі. Іх эратычная гульня-каханне асветлена нябесным святлом. Але праз нябеснае святло і знішчаецца. Сонца, новае святло, нішчыць тую красу:

Свецячы блескам чырвонца
Праз парадзеўшую мглу,
Пусціць, уставаючы, сонца
Ў іх залатую іглу (239).

[10] І. Э. Багдановіч, *Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага Адраджэння*, Мінск 2001, с. 184.

[11] Тамсама.

Два незабыўныя імгненні апісвае Багдановіч у вершы – таямнічасць з'яўлення і таямнічасць знікнення – як два неад'емныя пачаткі ў прыродзе[12]. Дапоўнім: гэта два незабыўныя імгненні ў каханні. Згадаем назву нізкі, што не ўвайшла ў першае выданне "Вянка", – "Каханне і смерць". Гэты матыў асноўны і ў вершы "Срэбраныя змеі".

Поруч з нізкамі вершаў пра лесуна, вадзеніка, змяінага цара (Уладзімір Конан называе іх цыкламі. Пэўна, таму што так пазначана ў першай публікацыі ў "Нашай Ніве". Мэтазгодней усё ж ісці ўслед за Максімам Багдановічам, які ўвёў тэрмін "нізка"), паэт стварае некалькі вершаў пра пана Падвея, першапачатковыя веды пра якога найверагодней атрымаў з знакамітага даследавання свайго бацькі Адама Ягоравіча Багдановіча "Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў", дзе чытаем: *Падвей – гэта дух, які кружыцца ў віхуры. Ён насылае на людзей асаблівую хваробу, якая таксама называецца падвеем: набяжыць віхура на чалавека – і зверне яму галаву набок, адымецца мова, а не – то скурчыць руку ці ногу*[13].

Максім Багдановіч адкідае змрочныя характарыстыкі міфалагічнай істоты, ён пераўтварае Падвея, надаючы яму рысы вясёлага, разгульнага валадара снегавой стыхіі. Як піша Уладзімір Конан, *Падвей у яго атрымаўся паэтычны, гэткі гуляка і зух, славянскі Дыёніс, а па сутнасці – міфалагічная метафара беларускай зімы, жывапісна-музычальны "партрэт" снежнай завірухі*[14].

Матыў балю прагучаў тут надзвычай шырока, усеахопна, у ягоны палон-кругаверць уключана ўсё раздолле. А уверцюрай да разгульных скокаў-танцаў Падвея – гулянне мяцеліцы:

Разгулялася вясёлая мяцель,
Прабудзіўся, ў поле кінуўся Падвей.
Ў галаву яму ударыў снежны хмель, –
І не змог ён буйнай радасці сваей (217).

Відавочна, мае рацыю Валерый Максімовіч, калі на прыкладзе гэтага верша даследуе *карнавальны эратызм Багдановіча*, які *ёсць паэтычнае пералажэнне дыянісійнай вакханаліі, асноўны змест якога*

[12] Тамсама.

[13] А. Багдановіч, *Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў. Этнаграфічны нарыс.* Рэпрынтнае выданне, Мінск 1995, с. 79.

[14] Уладзімір Конан, *Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка Максіма Багдановіча*, с. 115.

складае прафануючае і сакральнае па сваёй сутнаці аргіястычнае савакупленне, якое мае трансцэндэнты міфалагічны сэнс[15]. Як пачынае, гэтак і завяршае гэты баль-оргію мяцеліца:

Калі ж звaліць хмель ў пуховую пасцель, –
Белы снег яго схавае між палей,
Замяцець, уложыць буйная мяцель (217).

Тут Максім Багдановіч не адступае ад трактоўкі вобраза Падвея ў кнізе Адама Ягоравіча: дух **унутры** (выдзелена намі – *А.П.*) віхуры, у яе валадарстве. Ягоная разгульная весялосць народжана, абуджана з яе ласкі, ёю прадвызначана і ёю ж улагоджана, суцішана.

Яшчэ выразней падкрэслівае гэтую думку паэт у вершы "Завіруха" з нізкі "Места", дзе ў цэнтры таксама матыў разгульнага балю пана Падвея. Усе сімвалы-атрыбуты балю: спеў, звон, віно, дзікі хмель – прысутныя і тут, але "дзеянне" перанесена ў горад, "сціснута", "абмежавана" рамкамі вузкіх вуліцаў. *Адкрытая мелодыя палявога раздолля, сціснутая гарадскімі гмахамі цесных вулак, набыла від рытмічна-аднастайнай "гарадской фугі", і яна па-мастацку імітуецца рэфрэнам*[16]. Можна меркаваць, што выкарыстанне рэфрэну *У бубны дахаў вецер б'е // Грыміць па іх, звініць, пяе* (100) тут ёсць не толькі спробай рытмічна "ўпарадкаваць" дзікі нораў Падвея-завірухі, не толькі акампанементам да танцаў-скокаў, але і імкненнем "героя" разбіць, знішчыць гэтыя дахі-сцены-межы, вырвацца на прастор: *...Паэт перадае прыгожа-пагрозны разгул стыхіі, якой прывольна ў палях і няма прастору і выйсця на гарадскіх вуліцах*[17].

Дасканала прагучаў матыў бяседы, хмельнага балявання ў вершы "Возера". Возера – гэта сама напоўненая віном чаша, неад'емны атрыбут балю:

У чарцы цёмнай і глыбокай
Плешча, пеніцца віно;
Хмелем светлым і халодным
Калыхаецца яно (59).

---

[15] Валерый Максімовіч, *Ідэйна-эстэтычныя асновы беларускага мадэрнізму: Вучэбна-метадычны дапаможнік*, Мінск 1998, с. 93.

[16] Уладзімір Конан, *Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка Максіма Багдановіча*, с. 116.

[17] Тамара Чабан, *Космас "Вянка"*, с. 498.

Гэты вобраз нагадвае іншы – вобраз чары з "Песні філарэтаў" Адама Міцкевіча. Найперш тым, што ў вершы, *бясспрэчна, з'яўляецца ключавым, бо аб'ядноўвае вакол сябе ўсё дзеянне*[18]. Але калі там *чара робіцца сімвалам яднання, сяброўства і перспектывы, бо ў гэтай чары не проста віно, але менавіта "польскі мёд"*[19], то ў Максіма Багдановіча рытуал прычашчэння мае крыху іншую афарбоўку. Гэта далучэнне да энергіі таямніцаў, што хавае ў сваіх глыбінях чара-возера, да міфаў, легендаў пракаветнай Беларушчыны. Віно, вытрыманае ў сховах часу, праз стагоддзі набірае магутнае моцы, таму яно гэткае п'янкое. Гэта і яднанне чалавека з прыродай.

Напоўненая хмелем чарка-возера не стрымлівае тую магутную энергію, што выліваецца, запалоньвае ўсё навокал. І ўсё хмялее, пачынае рухацца ў адмысловым танцы, падуладна рытму, закладзенаму ў хмелі-віне: *хістаецца асока, // І шуміць высокі бор...* І душа чалавека, гэтак схільная ўбіраць у сябе навакольны рух, адгукаецца на баль прыроды, сама ператвараецца ў музычны інструмент: *А ў душы не замаўкае // Струн вясёлых перабор.* А зрэшты, музыка ў душы чалавека нараджаецца найперш, напаўняе чарку возера хмелем, хмеліць усё вакол.

Адметна прагучаў бяседны матыў у вершах беларускага складу, якія *нагадваюць карнавальнае шэсце герояў як бы адчараваных паэтам з казачнага сну Сярэднявечча*[20]. Гэтыя творы *перакінулі мост паміж двума берагамі адной ракі нацыянальнай паэтычнай культуры: фальклорнай і літаратурнай*[21]. Гэты матыў "праступае" ўжо ў саміх назвах твораў: "Бяседная", "Сярод вуліцы ў нас карагод", "Лявоніха". У вершы "Бяседная" адлюстраваны пэўныя моманты тэксту старадаўняй беларускай бяседы-гасцявання, пачынаючы ад шчырага запрашэння, дзе ў звароце *мае гасцейкі* выкарыстана этыкетная форма *чалом* – нізкі паклон, схіленая ў пашане перад жаданымі госцямі галава. Гэтая бяседа цікавая найперш багатай фантазіяй гаспадыні,

[18] І. Э. Багдановіч, *Рамантычнае перасэнсаванне міфалагічных сімвалаў "чары" і "горада Божага" ў філамацкай творчасці Адама Міцкевіча*, (у:) З краю Навагрудскага... (Малая Айчына ў жыцці і творчасці Адама Міцкевіча), Зборнік навуковых прац, Гродна 2006, с. 153.

[19] Тамсама.

[20] Ірына Багдановіч, *Пакліканы Адраджэннем*, (у:) Максім Багдановіч, *Поўны збор твораў*. У 3-х т., т. 1, с. 534.

[21] Уладзімір Конан, *Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка Максіма Багдановіча*, с. 203.

аповедам пра той вышываны ў сем шаўкоў *каршуновы суд* на белым саматканым абрусе, якога ў рэальнасці няма, бо птушкі, спалохаўшыся, *разляцеліся хто куды здолеў*. Дасціпна, трапна заўважае фантазёрка-гаспадыня, што ў аснове добрай бяседы зусім не яе аздабленне, а змест і той своеасаблівы сяброўскі настрой нязмушанасці, прыветнасці:

Ды красна бяседа не узорамі,
А ласкавымі прыгаворамі;
Не ядвабнымі абрусамі,
А ласкавымі прымусамі (291).

Што да верша "Лявоніха", то сам ён стаўся цудоўнай песняй у спадчыне мулявінскіх "Песняроў", успрымаецца як узор беларускай бяседы-гулянкі, дзе само жаночае імя ператворана ў заліхвацкі, іскрысты танец, у сімвал радасці і весялосці:

Ой, Лявоніха, Лявоніха мая!
Дай жа бог табе даўжэйшага жыцця,
Дай на свеце сумным радасна пражыць,
Усіх вакол як весяліла, весяліць (291).

Матыў карчомнага балявання сустракаем у творчасці многіх нашаніўцаў. Не абмінуў яго і Максім Багдановіч. У баладзе "Максім і Магдалена" намалявана яскравая карціна, у цэнтры якой герой – *буйная галава*, шчодрая душа, што імкнецца ў п'янкім карчомным вяселлі схаваць сваю скруху, утапіць у піва-мёдзе боль па сваім нешчаслівым каханні.

У баладзе гучаць водгукі біблейскага матыву пакарання Хрыста, выдадзенага на загубу праз здраду. Ролю Іуды тут выконвае шынкароўна Сора, што *да палацу шпарка пабяжала, // Ваяводзе а прыгодзе ўсё пераказала"* (297). Герой становіцца ахвярай кахання, а сцэна пакарання яго нагадвае ўкрыжаванне Хрыста:

А як смерцю Максіма скаралі, –
Рукі белыя да брамы прыбівалі,
Рукі белыя да брамы мястовай,
Галаву – да вежы вартовай (300).

Часам герой твора, у якім гучыць матыў балю, як бы выштурхоўваецца з людской весялосці, апынаецца на ўскрайку балю. Так, па-за

шумным людскім карагодам аказалася дзяўчына, гераіня верша “Сярод вуліцы ў нас карагод”. Вымушаная адзінота гераіні, кветкі, адсутнай між кветкаў у вянку-карагодзе (гэтак яна сябе ўспрымае: *як той мак*), выкліканая імкненнем схаваць ад чужых вачэй пачуццё, якое гэтая юная, шчырая душа баіцца міжволі вынесці на людскі суд:

Здрадзіць тварык белы бедную мяне:
Толькі міленькае імя назавуць –
Белы тварык разгараецца,
А дзяўчаты усміхаюцца (286).

Праўда, у вершах беларускага складу герой на ўскрайку балю ўсё ж – выключэнне. Бо звычайна ўсё жывое ўключана ў стыхію руху, танца, хмельнага вяселля, бяседнага настрою, дзе раскрываецца душа чалавека. А вось у вершах урбаністычнай тэматыкі лірычны герой часта апынаецца па-за шумнай весялосцю. І гэта зразумела: чалавечая душа – аскепак жывога, натуральнага свету, праз што асоба далучана да высокага нябеснага святла, выступае чужароднай часцінкай між шмат у чым штучнай гарадской атмасферы, між абыякавага людскога натоўпу:

На глухіх вулках ноч глухая.
Не менш глухі людскі натоўп (99).

І толькі натуральны прыродны рух, баль завірухі, што ўрываецца з палёў у аглухлае ад пустога шуму, мітусні гарадское жыццё, здольны ажывіць чалавечую душу, ускалыхнуць яе магутнай эмоцыяй:

І вось той гул мне ў душу ўліўся.
Гудзі, гудзі, дрыжачы дрот!
Ўвесь бледны, млосны прыхіліўся
Я ля ліхтарні да варот (99).

У вершы “За дахамі места...”, які Тамарай Чабан адзначаны як *найбольш гарманічны ў гэтым радзе*[22], перададзены ўзлётны баль душаў, што ўздымаюцца да святла, але яно, высокае, вечнае, недасяжна. Яно патрабуе ахвярнасці, спальвае, бы на ахвярным вогнішчы. Да высокага балю герой, што зараз адзінокі, на ўскрайку гарадскога гуляння-тлуму, у музыцы якога яму чутно стагнанне, далучаны праз

[22] Тамара Чабан, *Космас “Вянка”*, с. 498.

успамін-мрою пра зведанае калісьці, даўно прамінулае, але не забытае. Але і гэты матыў узлёту ёсць гэткім жа марным намаганнем, як і імкненне машкары прабіцца да ліхтарнага агню, закутага ў тоўстае шкло:

І ўспомніў я час: срэдзь асенняй нахмуранай ночы
Музыка зайграла, агні ў вышыні запалалі,
І дыхалі грудзі шырока, свяціліся вочы...
Мы к светлу ўзляцелі... і шкло ўкруг яго напаткалі (98).

Семантычнае поле матыву балю ў паэзіі Максіма Багдановіча метафарызуецца, пераносіцца ў свет прыродных стыхіяў, дзе чаргуюцца спакой і рух, дзе гучыць музыка, дзе гэтак жа, як і ў застоллі, пеніцца віно. Так, у вершы "Ноч. Газніца гарыць, чырванее" чутны водгалас начной бяседы, дзе ролю гаспадыні іграе завея: *За сцяной запявае завея, // Сумна бомамі ў полі звініць* (70). Музыка-гул як ланцуговая рэакцыя (*З краю ў край яе гул аддаецца*), якая захоплівае чалавека, пачынае гучаць у ягонай душы прадчуваннем вясновага абуджэння. А хіба не адгалосак праўдзівага балю ў імклівым руху-лёце ў вершах "Зімовая дарога" і "Зімой", дзе музычным аздабленнем – звон бомаў, дзе чалавек гэтак жа далучаны да ўсеагульнага свята. Усё ў найбагацейшых уборах, падараваных шчодрым месяцавым ззяннем (снягі пакрыты рызай срэбнаю), дзе музыка зімы загучыць радасным экстазам[23]:

Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець (72).

Матыў узнёслага вяселля-радасці прагучаў у вершы "Маёвая песня". Праўдзівы апафеоз, *ціхі, ясны гімн* вясновaму абуджэнню. Песня-танец сінякрылага матылька зліваецца з спевамі ўсяго навaколля:

Ці не вецер гэта звонкі
Ў тонкіх зёлках шапаціць?
Або мо сухі, высокі
Ля ракі чарот шуміць? (76).

[23] Уладзімір Конан, *Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка Максіма Багдановіча*, с. 96.

Легкавейныя крылы песні падхопліваюць светлыя думы-летуценні героя, адгукаюцца ў ягонай душы. І вось ужо ўсё вакол урачыста спявае, вітаючы святло, залатое сонца: *Песня рвецца і ліецца // На раздольны, вольны свет* (83). Матыў узнёслай радасці перапляецца з матывам смутку. *Невыпадкова ў самым сонечным і жыццесцвярджальным вершы ў канцы нізкі..., вершы-апофеозе, прасякнутым светлынёю, радасцю жыцця, гімн быццю і красе вызвоньвае трапяткімі крыльцамі* "У *струнах сонца залатых" "Шпаркі, лёгкі, сінякрылы матылёк" – сімвал нявечнасці*[24]. Узнікае адчуванне ненадзейнасці гэтай, адначасна вечнай і такой кволай, красы, незразумеласці, неспазнанасці свету. Гэты матыў асабліва паглыбляецца ў фінале верша.

З поўным правам можна сказаць, што матыў балю, бяседы-вяселля ў паэзіі Максіма Багдановіча пераплятаецца з матывамі міфалагічнымі, фальклорнымі, літаратурнымі, асабістымі (радасці, смутку), філасофскімі (пошуку гармоніі ў свеце і ў чалавечай душы, нявечнасці, неразгаданасці красы) і, безумоўна, уяўляе сабой значны ідэйна-тэматычны чыннік творчай спадчыны наймаладога беларускага класіка.

SUMMARY

The article gerresents the analysis of ball and table-talk motive in works of a well-know classic of Belarusian literature Maxim Bogdanovich. Considerable attention is paid to this motive in the poetic chain "In the Magic realm" and so-called "Belarusian trend" works, which display the influence of imagery thematic content of Belarusian folklore.

[24] Тамара Чабан, *Космас "Вянка"*, с. 483.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Анна Саковіч
Беласток

Міхась Андрасюк – майстар адлюстравання правінцыйнай сучаснасці

Міхась Андрасюк належыць да сярэдняга пакалення празаікаў Беларускага Літаратурнага аб'яднання "Белавежа". Так склалася, што пераважная большасць членаў гэтай арганізацыі пачынала свой творчы шлях з вершаў, хоць некаторыя адначасова пісалі і апавяданні[1]. Невыпадкова ў 2003-ім годзе, якраз падчас святкавання 45-гадовага юбілею арганізацыі, бібліятэка Беларускага Літаратурнага аб'яднання "Белавежа" папоўнілася анталогіяй апавяданняў "Панароўе". Укладальнік і рэдактар кнігі, уласна збіральнік беларускай літаратурнай сябрыны ў Польшчы, Георгій Валкавыцкі адзначыў ва ўступным слове:

> (...) У сваім памкненні наперад з самага зараджэння на Беласточчыне беларускага арганізаванага жыцця (1956), літаратурная плынь, неад'емная частка гэтага жыцця, стварала вобраз сучаснага героя, імкнулася ўзнавіць гістарычную памяць. Выразна прасочваецца гэта ў апавядальным жанры.
>
> У анталогію ўвайшлі творы, моцна асаджаныя ў рэаліях краю, творы, заглыбленыя ў гістарычныя далі, аж да пачатку мінулага тысячагоддзя. Маем у іх своеасаблівую вобразную дакументацыю нашага тутэйшага ўкаранення[2].

[1] Для прыкладу, у 1969 г. выходзяць "Загоны" С. Яновіча, у 1987 г. – "Пожня" В. Петручука, у 1991 г. – "Віры" Г. Валкавыцкага і "Трызна" М. Гайдука.

[2] *Панароўе. Анталогія апавядання*, Складальнік Георгій Валкавыцкі, Беласток 2003, с. 4.

Тутэйшая проза прадстаўлена ў кнізе дваццаццю чатырма аўтарамі. Чарговасць пісьменніцкіх персаналій абумоўлена годам першадруку твора – ад 1958-га па 2000 год. Некаторыя з гэтых аўтараў, на жаль, рана пакінулі творча самавыяўляцца, памерлі або зусім перасталі пісаць, занятыя іншай грамадскай дзейнасцю, ці змушаныя аддаваць цалкам сябе працы дзеля хлеба надзённага, як напрыклад: Антось з Лепеля, Васіль Баршчэўскі, Уладзіслаў Дваракоўскі, С. Заставін, Сцяпан Карбоўскі, Вераніка Леанюк, Сымон Раманчук, Віктар Рудчык, Валянцін Сельвясюк, Вінцук Склубоўскі. Анталогія "Панароўе" дае магчымасць таксама пазнаёміцца з творамі больш і менш вядомых пісьменнікаў: Георгія Валкавыцкага, Міколая Гайдука, Васіля Петручука, Яна Чыквіна, Сакрата Яновіча, Міры Лукшы, Алены Анішэўскай, Міхася Красоўскага, Юркі Геніюша, Аляксандра Максімюка, Уладзіміра Паўлючука, Міхася Шаховіча, Ганны Кандрацюк і, зразумела, Міхася Андрасюка.

Трэба адзначыць, што проза "Белавежы" прадстаўлена шматлікімі жанрамі, аднак найбольш прыцягальным для празаікаў "белавежцаў" з'яўляецца аўтабіяграфічны жанр. Паказальна, што своеасаблівая анталогія "Беларускія пісьменнікі Польшчы"[3] адкрываецца аповесцю Янкі Жамойціна "З перажытага". Творчасць жа Георгія Валкавыцкага, акрамя вершаў, прэзентуецца некаторымі апавяданнямі з аўтабіяграфічнай кнігі "Белая вязь", а Васіля Петручука – фрагментамі з аповесці "Пожня".

Багаты жыццёвы вопыт Міхася Андрасюка, амаль равесніка Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа", таксама знайшоў своеасаблівае выяўленне ў яго трох кнігах прозы, што пабачылі свет у Бібліятэцы "Белавежы": "Фірма" (Беласток, 2000), "Мясцовая гравітацыя" (Беласток, 2004), "Белы конь" (Беласток, 2006). Ян Чыквін у рэцэнзіі на кнігу "Фірма" зазначыў, што Міхася Андрасюка да літаратурнай дзейнасці прыцягвае *ўласна перажытае, практычна-асабістае веданне жывой рэчаіснасці, непераможнае памкненне сваім непаўторным жыццём пазнаваць усялякія бакі чалавечай экзістэнцыі*[4]. І найчасцей ён прама абапіраецца на ўласны вопыт.

Аднак творы Міхася Андрасюка, утрымліваючы ў сабе аўтабіяграфічны вопыт, прыкметна вылучаюцца сярод творчага здабытку іншых калег па пяру. Калі ў творах Георгія Валкавыцкага, Мікалая

[3] *Беларускія пісьменнікі Польшчы. Другая палова XX стагоддзя*, Мінск 2000.

[4] Ян Чыквін, *Сцэны з нашага тэатрума*, "Тэрмапілы" 2001, № 4–5, с. 268.

Гайдука, Янкі Жамойціна, Васіля Петручука, Сакрата Яновіча ў значнай ступені навідавоку прысутнічае аўтар, прыхаваны калі-нікалі за героем або за наратарам, які выкладае ўласную іерархію маральна-этычных каштоўнасцей, то Міхась Андрасюк, валодаючы здольнасцю ўнікнуць эмацыянальна ў свет сваіх герояў, *перамяшчае сябе з пазіцыі ўсёведаючага аўтара-наратара на пазіцыю толькі аднаго з шматлікіх герояў, удзельнікаў, назіральнікаў нашага паўсюднага тэатрума. Ягонае "ён", "я" – гэта і дырэктар малой фірмы, і ён – гэта, бывае, і сам Міхась, але такі, як іншыя, сталы наведальнік бара "У Алеся", ён таксама – і 18-гадовы пацыент псіхічнага дыспансера, і рабочы хімічнай фабрыкі, і апошні ідыёт, і шэф прыватнай гасцініцы, і грамадзянін Гайнаўкі, і сябар Партыі кучаравых*[5].

Міхась Андрасюк нарадзіўся 2 снежня 1959 года ў вёсцы Войнаўка ў Дубіцкай гміне. Пасля заканчэння ў 1978 годзе беларускага ліцэя ў Гайнаўцы ён пачаў працаваць настаўнікам. Працягнуў працоўную дзейнасць будучы празаік муляром, каменячосам, лістаношам, пераплётчыкам кніг. Затым працаваў у Гайнаўскім самаўрадзе. Урэшце патрапіў на радыё "Рацыя", дзе працуе з перапынкамі да сённяшняга дня. Яшчэ ліцэістам у 1976 годзе М. Андрасюк стаў карэспандэнтам "Нівы", дзе трыма гадамі пазней (у 1979 годзе) дэбютаваў вершамі. У яго творах адчуваецца моцная жыццёвая аснова. Пераважная большасць з іх пабудавана паводле ўбачанага і перажытага ім у невялікім родным мястэчку – Гайнаўцы. Пры гэтым, здавалася б, на вельмі абмежаваным і лакальным канкрэтным гайнаўскім матэрыяле, пісьменнік вырашае агульначалавечыя праблемы, важныя для ўсіх часоў. Сапраўды, у творах М. Андрасюка *сумарнае і агульнае адлюстроўваецца са шчырай непасрэднасцю і робіцца адзінкавым і індывідуальным, усенароднае – прыватным, а сацыяльнае – мастацкім*[6].

Агульнапрызнана, што пісаць пра дзень сённяшні ды пра падзеі, непасрэдным удзельнікам ці назіральнікам якіх з'яўляецца аўтар, вельмі складана. Лічыцца, што лепш паддаецца мастацкаму асэнсаванню жыццёвая матэрыя, разгледжаная праз нейкі прамежак часу. Звычайна пісьменнік мусіць перачакаць, пакуль у *пакутлівым роздуме перажытыя падзеі не выстраяцца ў адпаведную канцэпцыю, пакуль маральныя адносіны да ўсяго зведанага ў жыцці не знітуюць адабраны ма-*

[5] Тамсама, с. 269.

[6] Лада Алейнік, *Погляд на жыццё з вышыні палёту (Проза Міхася Андрасюка)*, "Тэрмапілы" 2004, № 8, с. 233.

тэрыял у арыгінале адзінства[7]. Пісьменнікі самі сведчаць, што адчуваюць патрэбу, каб раней перажытае ў жыцці, перш чым стацца мастацка-эстэтычным асэнсаваннем рэчаіснасці, "астыла", дыстанцыравалася. Напрыклад, англійскі паэт Джордж Байран, абмяркоўваючы псіхалогію ўзнаўлення пісьменнікам жыццёвага матэрыялу, робіць выснову: *Пока вы находитесь под влиянием страстей, вы только ощущаете и не можете писать, как не можете обращаться к своему соседу и рассказывать ему происшествие, пока вы действуете. Если все состоялось, абсолютно все и навсегда, доверьтесь своей памяти, она тогда намного объективней*[8].

Безумоўна, вельмі цяжка і складана пісаць пра дзень сённяшні, знаходзячыся ў цэнтры падзей, не бачачы вынікаў нашых учынкаў, калі не можам ахапіць цалкам увесь жыццёвы кантэкст. Тонкія назіранні над гэтым аспектам псіхалогіі творчасці знаходзім у Вісарыёна Бялінскага:

> Много прекрасного в живой действительности, или лучше сказаць, все прекрасное заключается только в живой действительности; но чтоб насладиться этою действительностью, мы сперва должны овладеть ею в нашем разумении, а это возможно только при двух условиях: мы должны обнимать ее в целости и притом предметно, так чтоб наша личность, наши отношения не заслонили ее от нас. И мы этим пользуемся, но только в редкие минуты восторга, в нежданные мгновения какого-то внезапного внутреннего откровения; в большей части мы теряемся во множестве частностей и, не видя за ними целого, ничего в них не понимаем. Даже собственные наши чувства только тогда бывают предметом нашего наслаждения, когда мы освобождаемся от их томящей тяжести или от их трепетного волнения, в котором занимается дыхание, теряется сознание, и когда мы возобновляем их в воспоминании[9].

Аднак апавяданні М. Андрасюка, яго аповесць "Белы конь" нібы цалкам супярэчаць гэтым цікавым, глыбокім, ужо класічным, развагам. Якім жа чынам удаецца М. Андрасюку пісаць літаральна пра дзень сённяшнні, ствараць высокамастацкую мадэль жывой рэчаіснасці, пераадольваючы непасрэдныя пачуццёвыя адносіны да падзей? Відавочна, што пісьменнік унутрана дыстанціруецца ад стану непасрэднага ўдзельніка падзей. Адначасова ён з'яўляецца назіральнікам рэчаіснасці знутры яе. Усё, што адбываецца ў асяроддзі, вядомым яму

[7] Алесь Яскевіч, *У свеце мастацкага твора*, Мінск 1977, с. 43.

[8] Цыт. за: Михаил Арнаудов, *Психология литературного творчества*, Москва 1970, с. 208.

[9] Виссарион Белинский, *Полное собрание сочинений*, Москва 1955, т. 4, с. 490.

змалку, асяроддзі, якое ўзрасціла яго, па-свойму адкрытае яму, нават вычутае, прадбачанае. Унутраныя далягляды пісьменніка, які ходзіць аднымі сцежкамі са сваімі героямі, ахінаюць усе часавыя пласты. Уласна, дня сённяшняга няма без прошласці, цяперашняе грунтуецца, нават вырастае з прамінулага. Міхась Андрасюк – мастак слова з багатым жыццёвым вопытам – якраз не губляецца ў мностве падрабязнасцей, а, аддаючы ім належнае, стварае ўрэшце цэласны, завершаны зрэз рэчаіснасці. Вядома, мастацка-эстэтычны набытак М. Андрасюка дае падставы для далейшага глыбокага асэнсавання яго з пункту погляду псіхалогіі творчасці.

Тонкае вычуванне складанасцей часу, у якім ён жыве, выяўляе М. Андрасюк у апавяданні “Фірма”. Пад канец васьмідзесятых і на пачатку дзевяностых гадоў XX стагоддзя ў Польшчы адбыўся сістэмны пералом. Закончыла сваё існаванне сацыялістычная таталітарная сістэма і нібы прыйшла доўгачаканая свабода. Ды ад палітычных, а затым эканамічных зменаў найбольш пацярпелі простыя, сціплыя людзі. Менавіта ім найцяжэй аказалася знайсціся ў новай сістэме, бо, як заўсёды гэта бывае, усе перамены адбываюцца коштам найніжэйшага саслоўя. Яго сацыяльна-матэрыяльнае становішча было незайздроснае. Прадпрымальныя, адважныя асобы, вядома, імкнуліся змяніць сваю сітуацыю ў час палітычнай рэвалюцыі.

> Рэвалюцыя... Гэта ж яна нябачным дотыкам чарадзейскай палачкі прачку ператварае ў князёўну, пастушка ў афіцэра, а фурману ўручае міністэрскія лейчыны. А потым адступае, пакідаючы поле бою ўсім апошнім. Жвавым, гнуткім, прагным поспехаў. Трэба, аднак, помніць, што час апусташэлага поля не трывае наогул доўга. Вокамгненна пераходзяць з рук у рукі фабрыкі, мяняюцца шыльды з назвамі магазінаў, мяняюцца на гэтых шыльдах і прозвішчы ўласнікаў. Калі не мы, тады хто? – пытаюць адважныя. І гэта добрае пытанне. Хто не са мною, той супраць мяне, – заклікае прыватная ўласнасць. І гэта таксама слушны заклік[10].

Простыя людзі імкнуліся знайсці сваё месца ў новай раннекапіталістычнай рэчаіснасці, у якой *няма сантыментаў, дзе ўладарыць эканоміка* (15), дзе капіталізм *мае свае непахісныя законы* (15). Бо *не схапіць добрага моманту – гэта не тое ж, што прапусціць нейкі цягнік ці аўтобус. Адчакаеш гадзіну-дзве і ўсё-такі паедзеш, куды*

[10] Міхась Андрасюк, *Фірма*, Беласток 2000, с. 5. Далей – спасылкі на гэтае выданне. У дужках падаецца старонка.

табе трэба. Спазніўшыся на добры час, да канца жыцця ўжо будзеш маршыраваць – заўжды пешкі і заўжды супраць ветру (16).

У гэты час на свабодным эканамічным рынку Польшчы пачалі масава ўзнікаць маленькія фірмы. Іхнія ўласнікі лічылі, што свой бізнес, спалучаны з цяжкай працай, будзе пропускам у лепшы свет, у багатае, сытае, бесклапотнае жыццё. Відавочна, што М. Андрасюк, пісьменнік з тонкім адчуваннем рэчаіснасці, не мог не адрэагаваць на гэтую з'яву. Відаць, цалкам невыпадковай з'яўляецца назва яго першай кнігі.

Мае рацыю Я. Чыквін, сцвярджаючы, што М. Андрасюк арыгінальны ў паказе *сучасных раннекапіталістычных "лішніх герояў" нашага часу. "Лішніх" – не па сваім жаданні*[11]. Да ліку такіх персанажаў можна залічыць Толіка Рубеля і Ігара Барабу з аднайменнага апавядання "Фірма". Яны вырашылі схапіць свой лёс у свае рукі. Героі, заахвочаныя марамі пра бізнес, што пераводзяць чалавека з блокавай кватэры ў палац з басейнам, пакідаюць працу на фабрыцы. Хутка ствараюць яны ўласныя фірмы, якія займаюцца экспартам недастаючых на суседнім усходнім рынку тавараў. Аднак аказваецца, што прадпрымальніцкая самастойнасць гэта не такі лёгкі заробак на хлеб. Ужо на пачатку існавання фірмы ўзнікаюць шматлікія клопаты, з-за якіх хутка развальваецца бізнес. Дом з басейнам аказаўся ілюзіяй, нерэальнай марай. Хаця намаганні Толіка Рубеля ў эканамічнай галіне смешна-прымітыўныя, ды лёс усміхаецца яму ў вобліку спадчыны па бяздзетнай цётцы з Гамбурга, а затым кахання афіцыянткі пані Ані з кавярні "Верас".

Відавочна, што М. Андрасюк глядзіць на чалавека з любоўю, спагадаю, чым вызначаецца і характар яго гумару, пародыі. У гэтым моманце выяўляецца выразны кантраст паміж творчасцю Міхася Андрасюка і таксама выдатнага празаіка БЛА "Белавежа" Сакрата Яновіча. Калі пісьменнік з Крынак імкнецца паказаць чалавечыя недахопы праз саркастычнае, часам нават цынічнае, абсмейванне і высмейванне сваіх герояў, то аўтарская ўсмешка ў гайнаўскага творцы *падкрэслівае не толькі дастатковую дыстанцыю пісьменніка ад апісваемых падзей, але яшчэ і яго спробу па-філасофску асэнсаваць рэчаіснасць, якую ён адлюстроўвае*[12]. Творам М. Андрасюка ўласцівы сапраўдны гуманізм. Ён шчыра спачувае простаму чалавеку, часта пакрыўджанаму,

[11] Ян Чыквін, *Сцэны з нашага тэатрума*, "Тэрмапілы" 2001, № 4–5, с. 269.

[12] Галіна Тычка, *Проза Міхася Андрасюка: пошукі новых шляхоў мастацкага асэнсавання жыцця*, "Тэрмапілы" 2003, № 7, с. 113.

у лёсе якога аўтар бачыць адлюстраванне вялікіх праблем нашага часу. У канцы апавядання "Фірма" герой Толік Рубель дасягае матэрыяльнага дабрабыту, дзякуючы спадчыне з Нямеччыны, а не ўласнай працы і тут здаецца, *што вось-вось саркастычная ўхмылка ператворыцца ў цынічную грымасу*[13]. Аднак гэтага небяспечнага "ледзь-ледзь" аўтар не парушае, застаючыся верным сваёй этычнай пазіцыі.

Дакладныя планы ў новай сітуацыі, як у сферы жыццёвай іерархіі, так і прафесійнага росту, выбудоўвае пан Владак з апавядання "Крах". Ягоны, распісаны па пунктах праект, уключае наступныя пазіцыі: 1 – кватэра, 2 – адукацыя, 3 – пасада, 4 – машына, 5 – жонка, 6 – дзеці. Чытач застае яго падчас выканання чацвёртага пункта. Гэты стандартны, апрабаваны грамадствам шлях, з-за празмернай наіўнасці амаль саракагадовага служачага, вядома, не здзяйсняецца. Варта пагадзіцца з меркаваннем Лады Алейнік, што асоба пана Владка з апавядання "Крах" вельмі нагадвае галоўнага героя з рамана "Запіскі Самсона Самасуя" Андрэя Мрыя, беларускага пісьменніка, несправядліва рэпрасаванага ў 30-ыя гады. Выдатны прыстасаванец Самсон Самасуй і пан Владак – *камедыянты міжволі. Яны лічаць сябе вялікімі знаўцамі "тонкай механікі" службовых адносін, грамадскіх паводзін, абодва* (...) *імкнуцца да матэрыяльных і кар'ерных перспектыў*[14].

Своеасаблівым прадаўжэннем першай кнігі пісьменніка, блізкай у знешніх праяўленнях агульнажыццёвых прынцыпаў, з'яўляецца чарговы зборнік апавяданняў М. Андрасюка "Мясцовая гравітацыя". Ужо сама назва наводзіць на думку аб тэматыцы кнігі. Падзеі, зразумела, адбываюцца ў адным з малых мястэчкаў на Падляшшы, у якім лёгка пазнаецца ўсё тая ж Гайнаўка, дзе *прыцяжэнне мала адчуваецца, але моцна ўздзейнічае, непрыкметна закалыхвае, часта мяняе суадноснасць прапорцый, парушае іерархію каштоўнасцей. А галоўнае – забівае сваёй звыкласцю і прадказальнасцю*[15].

У такім мястэчку існуюць здаўна ўсталяваныя нормы і няпісаныя законы, да якіх трэба проста прыстасавацца, бо яны з'яўляюцца непарушнымі і агульнапрынятымі. Рэдка і выпадкова нехта адважыцца іх парушыць, бо тут усе знаёмыя і ведаюць адзін пра аднаго амаль

---

[13] Лада Алейнік, *Погляд на жыццё з вышыні палёту (Проза Міхася Андрасюка)*, Тэрмапілы 2004, № 8, с. 236.

[14] Тамсама, с. 230.

[15] Вольга Шынкарэнка, *З увагай да сховаў душы і старога дома*, "Тэрмапілы" 2005, № 9, с. 252.

ўсё. Так, у апавяданні "Знічка" героі працягваюць пахавальную традыцыю, якой верныя ўжо амаль трыста пакаленняў. У хаце памерлага пана Сенькі людзі збіраюцца, каб спяваць жалобныя песні. *Калі паглыбляешся ў смутныя літаніі, так і здаецца: усё будзе добра, куды трэба накіруюць пана Сеньку*[16]. Яны клапоцяцца, каб, згодна са старадаўнім звычаем, асабіста адправіць блізкую асобу ў апошнюю дарогу. *Можна было, вядома, зняць месца ў спецыяліstaў, закінуць туды нябожчыка на апошнюю ноч, а з раніцы прыйшлі б смутныя хлопцы ў чорных пінжаках, у белых рукавічках, спраўна ўзялі б, што трэба ўзяць* (137–138). Аднак людзі, якія жывуць на прадмесці мястэчка, яшчэ не карыстаюцца такімі зручнымі паслугамі. Тут жывуць звычайныя людзі, якія штодзённа пераадольваюць мясцовую гравітацыю, а напрыканцы жыццёвай дарогі *адыходзяць у вечнасць, пераступаючы свой парог і на спіне лепшых суседзяў* (138).

І калі надыходзіць момант, што хопіць зрабіць толькі адзін крок і, напрыклад, пераступіць парог шафы, каб збыліся мроі, каб пераўвасобіцца ў зусім новую асобу, каб змяніць сваё нецікавае жыццё, каб сказаць суседцы Ані аб сваім пачуцці, дык герою апавядання "Шафа" такой адвагі і не стае. Ён баіцца, што, *можа, сапраўды штосьці збудзецца? Пераменіцца ўсё і я вярнуся ў невядомае сабе месца, у чужы свет.* (...) *А, хто ведае, можа сам сабе акажуся чужынцам у гэтым свеце?* (10) Яна, цудадзейная шафа, ужо восьмы месяц стаіць у кватэры і чакае яго якраз рашэння. Аказваецца, што самае важнае – пераступіць парог "шафы", калі трэба, у свой час. Дарэчы, пераважная большасць людзей чакае таго, што нехта іншы зробіць першы крок за іх: першы падасць руку, першы адазвецца пасля спрэчкі і г.д. Неаднойчы здараецца і так, што потым можа не быць ужо той адзінай магчымасці, каб зрабіць гэты "першы крок". З аднаго боку, мы баімся новага, невядомага, а з другога – пакутуем, што не можам сябе перамагчы.

М. Андрасюк паказвае герояў, якія ў пераважнай большасці стаміліся ў змаганні за хлеб, за матэрыяльны дабрабыт, за добразычлівасць няласкавага лёсу. Іншага, лепшага жыцця хоча сабе кравец Марусь з апавядання "У цягніку". У яго большыя амбіцыі, чым шыццё рабочых рукавіцаў, таму ён выязджае ў Варшаву. Марусю марыцца аб пасадзе праектанта. Герой апавядання "У цягніку", нягледзячы на малады ўзрост, цалкам сур'ёзна разважае, што ў малым мястэчку:

[16] Міхась Андрасюк, *Мясцовая гравітацыя*, Беласток 2004, с. 133. Тут і далей – спасылкі на гэта выданне. У дужках падаецца старонка.

Гумавыя хвіліны выцягваюцца да воблакаў, у бясконцасць. І такая гума часу можа быць як трамплін, што, напяўшыся да межаў вытрымкі, шпурне чалавека ў лепшы свет. Але можа таксама лопнуць. Абарвацца з трэскам і тады стрымгаловіш у чорную прорву небыцця.

Але калі зашмат выдаўжаецца цярпенне, калі пераўтвараецца ў невыносны боль, вызначаюцца і чарговыя мэты – як вакцына, як апраўданне пакуты і адплата за яе. Бо чалавек у сіле перанесці свой, нават добраахвотніцкім жэстам загружаны крыж з аднаго кутка свету ў супрацьлеглы куток, калі аплачваецца такая ахвяра добрай цаною. А цана – у кожнага тут свая мера – абяцанне вечнага жыцця, улада над другім чалавекам, жаночая ўсмешка (23).

Адначасова сустракаем і такіх персанажаў, як Вітусь Агоньчык з апавядання "Клаксон", якія задаволены сваёй жыццёвай сітуацыяй і баяцца перамен, нават калі гэта тычыцца магчымага доўгачаканага нашчадка. Такім асобам вялікаю каштоўнасцю ёсць спакой і прадбачлівасць здарэнняў. Характэрнай рысай замкнёнага ў нейкай прасторы асяроддзя з'яўляецца боязь пра сваю рэпутацыю. Усялякія магчымыя ўскладненні, адступленні ўспрымаюцца пагрозай для свайго існавання, экзістэнцыі.

Такім жа парушэннем спакою ў апавяданні "Зубр" сталася нечаканае з'яўленне ў цэнтры мястэчка перад магістратам самага магутнага жыхара Белавежскай пушчы – зубра, але ж з залатымі рагамі. Менавіта гэтае каштоўнае ўпрыгожванне жывёліны выклікала найбольш цікавасці сярод тутэйшага насельніцтва. Кожны па-свойму пачаў тлумачыць прычыну і сэнс гэтай знаходкі. Напрыклад, кандуктар Самахіл і лясны вартаўнік Гудзейка, угледзеўшы дзіва, забываюцца пра свае службовыя, неадкладныя абавязкі. Цяпер ім найбольш істотнай справай быў гонар, што яны першыя ўбачылі і апынуліся каля зубра, бо *Чалавечае жыццё,* (...), *складаюць аказіі, наогул непаўторныя, праваронiш зручны момант, пішы прапала* (91).

Зубр таксама хвалюе такіх важных персанажаў мястэчка, як сакратар партыі Яўхім Гаворка і бацюшка Рыгор. Яны абодва адчуваюць боязь перад новым і адначасова невядомым для іх. Яны не ведаюць, як трымаць сябе ў гэтай канкрэтнай сітуацыі. Бацюшка разважае:

Падтрымаць такое, адобрыць сваім аўтарытэтам, вядома, што абазначае: смех вечны і ссылка ў далёкія Бяшчады. Або і яшчэ далей, у Шчэцін. Але тут жа і другое прыйшло на думку: "А калі сапраўдны цуд? А калі, у рэшце рэшт, прыйшло змілаванне і на наш панадворак? І тады што? Абмінуць маўчаннем? Абыякава паставіцца? (103–104).

Падобнага кшталту разважанні сакратара:

> Вось табе і заварэнцыя. А ўсё добра было, спакойна. А цяпер па прычыне кудлатай чатырохногай жывёліны гэты спакой разбурыўся. Штосьці пагрозлівае, некантраляванае нябачнай птушкай разгортвалася над мястэчкам. Яшчэ няўмела, пакуль хаатычна і навобмацкі. Але ж усялякія катастрофы, на якіх правальвалася любая ўлада, ці не з нуля пачыналіся? Ад аднае кулі, што трапіла ў цэль або абмінула яе, ад аднаго слова – сказанага або прамоўчанага (107).

Сашка Тытуньчык тлумачыць нязвыклую падзею, выкарыстоўваючы свае незвычайныя зацікаўленні. Менавіта ён даводзіць, што ўмяшаліся тут касмічныя істоты. У Паўлюка Палітуры, якому сніцца князь Альгерд пад Масквой, таўкуцца ў галаве думкі, што: *Знікне наша Бацькаўшчына. Сто гадоў – і след астыне. Хіба ж цяпер, у пачатку трэцяга тысячагоддзя, яшчэ здараюцца цуды?* (96). І вось цуд адбываецца. Палітура лічыць, што гэта расіяне заўважылі местачкоўцаў, бо *Золата ў Расеі, во, пад завязку. Усіх зброў азалаціць у пушчы – тое, што і сплюнуць для Расеі* (106). Сенсацыі шукае Кастусь Шыла, які *ніколі ў добры час у адпаведным месцы не акажацца* (99).

Да гэтага цяжкавытлумачальнага для герояў апавядання выпадку своеасабліва ставіцца Агафон Сакалюк, і утапічна мроіць аб тым, каб накарміць увесь свет. Пачуўшы пра незвычайную з'яву ў цэнтры мястэчка, ён не можа пагадзіцца з тым, што *Народ галадае, а яны золатам абвешваюцца!* (...) *Даволі ўжо* (116). Абураны марнатраўствам грамадскіх грошай, Агафон Сакалюк склікае на хаду дружыну, на чале якой арганізуе шэсце пад магістрат з транспаранатам: *Перакаваць золата ў суп!* (116).

Разгадка таямніцы залатарогага зубра прыходзіць нечакана з нябёсаў. Разам з першымі кроплямі дажджу высветлілася, што рогі былі памаляваныя дзесяцігадовым хлопчыкам. Расчараваны ўбачаным уласнік невялікага рэстаранчыка абмяркоўвае:

> Ці раз або два намагаўся падараваць, скалыхнуць гэты прыімшэлы камень? Дзесяткі разоў. Зрабілася Сакалюку і крыўдна, і кепска. Як заўжды, калі аддае сябе чалавек поўнасцю вышэйшым мэтам, агульным справам, змаганню за лепшае заўтра другіх, а ўзамен атрымоўвае пякучую фігу. Усё-такі кожную пазіцыю, кожнае поле бою пакідаць трэба з гонарам і з горда ўзнятай галавой. Гэта абнадзейвае на будучыню (119).

У 2006 годзе, у той жа Бібліятэцы БЛА "Белавежа", пабачыла свет трэцяя кніга М. Андрасюка – аповесць "Белы конь". У дзевяці частках твора пісьменнік раскрывае гісторыю сям'і Іванюкоў. Яе лёс падаецца ў кантэксце складаных падзеяў, якія адбываліся ў XX стагоддзі на польска-беларускай мяжы. Жыхарам правінцыі прыйшлося перажыць шмат іспытаў. *Вайна заўсёды жыла побач, як блохі і хваробы, кармілася людзьмі, вызначаючы адных у жывыя ахвяры, іншых у мёртвыя героі. Пры тым, якая б ні была, сусветная ці суседская, завяршалася нязменнай цырымоніяй – падзелам вялікіх краін або малых загонаў*[17].

Сімвалічнай бачыцца назва гэтай кнігі М. Андрасюка. У розных народаў вобраз белага каня мае крайне супрацьлеглае значэнне. З аднаго боку, абазначае свабоду ў любым сэнсе, ці то асабістым ці палітычным. А таксама прарочыць трыумф – таму так часта карысталіся ім рымскія імператары. З другога боку, напрыклад, у кітайскай міфалогіі дзікі белы конь прадказваў смерць. У абодвух значэннях ён выступаў у сусветнай літаратуры. Ужо ў "Іліядзе" Гамера белы конь паяўляўся ў сцэнах, якія суправаджаюць знішчэнне, разбурэнне. Падобную ролю, здаецца, адыгрывае ён у аповесці М. Андрасюка. Тут лёс белага каня – Султана з'яўляецца трагічным: яго ўласніка расстралялі першыя саветы, а другія саветы пасеклі жывёлу на гуляш і зварылі. Такім чынам, магчыма і неўсвядомлена, XX стагоддзе, асабліва яго першая палова, праз увядзенне ў твор белага каня характарызуецца пісьменнікам сімволікай, уласцівай яшчэ грэчаскай антычнасці.

Характэрнай рысай першай паловы XX стагоддзя было тое, што тэрыторыі, якія знаходзіліся на памежжы дзвюх краін, хутка мянялі сваю дзяржаўную прыналежнасць, свой статус. Калі чалавек займаў важную функцыю пры адной уладзе, то пры яе перамене быў шчаслівы, калі выжываў. У гэты час асабліва запатрабаванай была разважлівасць, бо, як слушна сцвярджае заснавальніца роду Іванюкоў, надзеленая народнаю мудрасцю бабка Сонька: *Усе імперыі на тое і ўзнікаюць, каб тутэйшага праваслаўнага мужыка шпарыць з абедзвюх рук па мухаедах, –* (...). *І лепей тры разы прамаўчаць, як тры разы сказаць "так" або "не"* (30).

Безумоўна, апавядаючы аб жыцці невялікага мястэчка, М. Андрасюк не мог абмінуць тэму кахання, заўсёды важную і актуальную. Так, у зборніку "Фірма" апавяданні "Гульня ў каханне", "Крах",

[17] Міхась Андрасюк, *Белы конь*, Беласток 2006, с. 19. Тут і далей – спасылкі на гэтае выданне. У дужках падаецца старонка.

а таксама “Пані Зося” сведчаць, што парадыйныя пачынанні герояў у сацыяльна–эканамічнай сферы закранаюць і сферу інтымную. Каханне ў творах М. Андрасюка пераважна пазбаўлена рамантыкі. Прыніжае высокае пачуццё Юрась, герой апавядання “Гульня ў каханне”, і кіраўнік, адказны за гарадскія дарогі – калі, карыстаючы з нагоды сваёй функцыі, *намагаецца знішчыць падначаленую сабе асобу, разбурыць яе шчасце і сямейны спакой* (20). Відавочна, неабходнасць, прага героя ў каханні вынікае

> з суцэльнай душэўнай пустаты, з імкнення запоўніць гэты вакуум эмоцыямі, пачуццямі, цеплынёй. А “дзіркі ў тратуарах”, якія ўвесь час падлічвае “адказны за стан гарадскіх дарог”, нібыта з’яўляюцца выразнай ілюстрацыяй тых самых дзірак у душы героя, якія таксама хацелася б нейкім чынам “падрамантаваць”[18].

Для пана Владака з апавядання “Крах”, прыярытэтамі з’яўляюцца пасада, кватэра, машына, а жонка і дзеці займаюць апошняе месца сярод ягоных каштоўнасцей. Засмучае таксама гісторыя няспоўненага кахання пані Зосі да мастака Шуры. Яны падабаюцца адно другому, аднак нявіннае наіўнае пытанне, пастаўленнае Зосяй каханаму: *А акварэль, гэта рыба марская ці прэснаводная?* (80) – паказвае, што інтэлектуальная розніца паміж імі нераадольная. Усхваляваны мастак выходзіць па папяросы ў кіёск і больш не вяртаецца. Пасля разлукі ні Зося, якая ўжо другі год не дае адказу на шлюбную прапанову дантыстычнаму тэхніку, ні Шура, які ашчацінелы і ў парваным пінжаку блукае па Варшаве, не сталі шчаслівейшымі. Можна сказаць, што рэалізуецца гэта вечная тэма ў стылёвай манеры, уласцівай увогуле М. Андрасюку.

Падобна як у першым зборніку апавяданняў М. Андрасюка, так і ў зборніку “Мясцовая гравітацыя”, героі, грамадзяне правінцыйнага мястэчка не перажываюць вялікага, узвышаючага, рамантычнага кахання. Так, напрыклад, у апавяданні “Гравітацыя” галоўны герой падчас сустрэчы са сваімі сябрамі Болюсем і Папусем, родіць уражанне, як бы для яго Зося і не важная асоба, ён не хоча паказаць свайго пачуцця да дзяўчыны, якой кляўся ў сваім каханні. Ён спадзяецца, што дзяўчына сама адаб’ецца ад атакі нахабнікаў, а калі не зможа, то папросіць дапамогі ў яго. Чакае, а гэтым часам першы крок робіць нехта

[18] Лада Алейнік, *Погляд на жыццё з вышыні палёту (Проза Міхася Андрасюка)*, “Тэрмапілы” 2004, № 8, с. 230.

іншы. Ён не змагаецца за сваё шчасце, не абараняе яго. І ўрэшце аказалася, што ягоныя жыццёвыя планы на супольнае жыццё з Зосяй не здзейсніліся, а з яго дзяўчынай шчаслівы іншы. Яму хочацца збегчы ад самога сябе *сесці на які-колечы аўтобус, нават не ведаючы яго маршруту, ды адправіцца ў самае далёкае месца на зямлі* (30).

Расчараваны сваім сямейным становішчам пан Носік з апавядання "Сустрэча". Вяртаючыся да сваёй жонкі, прыдбанай *даўным-даўно таму назад, у выніку палымянага і, як наогул у маладосці бывае, зусім неабмеркаванага пачуцця* (74), ён сустракае прыгожую, *трыццацігадовую, высокага росту, тонкую, зафіксаваную зверху навальніцай фіялетава-чорных кудзераў* (74) суседку Зіну. Пан Носік, зачараваны знешнім выглядам маладой жанчыны, захацеў стаць яе рыцарам. Нуднае шлюбнае жыццё ён хоча заступіць салодкім раманам. І вось, калі здавалася, што перамена лёсу знаходзіцца так блізка, што мары як бы пераплятаюцца з рэальнасцю, у гэты момант з'яўляецца невядома адкуль *нейкая ўсюдыісная, фатальная сіла* (78) ў вобразе пляткаркі цёткі Варвары, вядомай чытачу ўжо з першай кнігі "Фірма". Менавіта з-за яе не ажыццяўляюцца планы пана Носіка, які надалей будзе прымушаны ў выніку *незразумелай касмічнай катастрофы* (74) запаўняць *гэты, а не іншы фрагмент прасторы* (74). Так і не знайшоў пан Носік шчасця пры знешне вельмі прыгожай суседцы. Відавочна, яно было яму недасяжнае, яно мроілася як *паэтам мроіцца абсалютнае шчасце, філосафам – воля, палітычным шаленцам – справядлівасць* (73), або яго трэба было шукаць у іншым напрамку. Найчасцей жа бывае так, што яно знаходзіцца бліжэй, чым мы думаем.

Складанасць чалавечых узаемаадносін М. Андрасюк імкнецца выявіць і ў аповесці "Белы конь". Як тонкі псіхолаг, ён заўважае, што *людзей ствараюць перш за ўсё пачуцці. Пачынаецца чалавек з простай радасці, з часам ускладняецца злосцю, затым нянавісцю, аж даходзіць да самага незвычайнага – кахання. Можна скапіраваць чужую радасць і паўтарыць чужую нянавісць, але з каханнем у кожнага свая гісторыя. Адны знаходзяць яго, а другія ніяк* (41).

Псіхалагічна дакладна вымалёўвае пісьменнік характары сваіх герояў, і таму яны выклікаюць да сябе спагадлівае стаўленне ў чытача. Як, напрыклад, да аднаго з сыноў Сонькі – Антона, у якога ўжо сорак за спіной, а ён усё яшчэ не зведаў кахання (дарэчы, як шмат герояў М. Андрасюка). Ён упэўнены, што зможа жыць з любой жанчынай, не адчуваючы да яе ніякіх вялікіх пачуццяў. *Найважнейшае – быць добрым чалавекам. Жыць так, каб з-за нас не плакалі* (20). Але

ж і Антон, нечакана для сябе самога, закахаўся ў буфетчыцу Гандзю. Пасля шлюбу

> Незаўважальна ён пачаў у сваю працу ўкладаць асаблівую пяшчоту. Тым болей яе было, чым болей яго думкі займала Гандзя. Закаханыя паэты складаюць надчасовыя паэмы, кампазітары пішуць сімфоніі, мастакі малююць абразы, а дзядзька Антон ўслаўляў каханне праз тое, што ўмеў рабіць найлепш. Дамавіны – раней смутныя і халодныя – пацяплелі, папрыгажэлі (81).

І вось тады, калі Антон цалкам аддаў сябе гарачаму пачуццю, Гандзя адышла. Яна раней гаварыла, што каханне найважнейшае ў жыцці, але спадзявалася, што побач з Антонам, які стварыў для яе бяспечны і спакойны дом, зможа забыць сваё каханне. Аднак, калі хтосьці ўжо пражыў вялікае пачуццё, нават калі прыйшлося шмат цярпець з-за яго, не зможа ўжо жыць не кахаючы. Падобна сталася і з Антонам. Ён разам з каханнем зведаў і драму жыцця.

Пачуцці герояў М. Андрасюка далёкія ад створаных многімі рэжысёрамі ў шматлікіх фільмах, дзе расказ вядзецца:

> (...) пра Яго і Яе, багатых, прыгожых і адукаваных, і свет ім, усе тыя Рыверы, Караібы, Венецыі – тое, што і свая хата, хочацца – падаліся на цёплае мора, не хочацца – бавяць час дома, здараецца – спачатку – узводзіць недарэчныя барыкады грандыёзная цешча – вусны такое асобені стандартна надзьмутыя, бы сцяг пралетарскай рэвалюцыі – а вось з дваццатай хвіліны ўсе дружна б'юць у грудзі за ранейшыя недарazуменні, затым забіваюцца за стол, ласуюцца ікрою і шампанскім, ну жыць не ўміраць, дзяцей гадаваць на разбэшчаных шчасліўчыкаў, сядзіш вось, узіраешся ў экран, мабыць, і зайздросціш крадком, (...)[19].

У рэальным свеце няма месца для такіх ілюзій. Сацыяльна-матэрыяльныя перашкоды не аказваюцца настолькі банальнымі, каб можна было лёгка іх абмінуць. Адлюстраваныя на кінастужках салодкія, шчаслівыя гісторыі здараюцца вельмі рэдка ў сапраўднасці. Як слушна адзначае Галіна Тычка, у апавяданні "Кіно "Ілюзія"" М. Андрасюк *з уласцівым яму інтуітыўным адчуваннем найбольш балючых праблем з шчымлівою скрухай адлюстраваў найвялікшую бяду сучаснасці – брутальнае знішчэнне сапраўднай культуры, падмену яе сурагатам масавай*[20].

---

[19] Міхась Андрасюк, *Кіно "Ілюзія"*, "Тэрмапілы" 2002, № 6, с. 82.

[20] Галіна Тычка, *Проза Міхася Андрасюка: пошукі новых шляхоў мастацкага асэнсавання жыцця*, "Тэрмапілы" 2003, № 7, с. 112.

Гэтай сітуацыі спрыяе распаўсюджванне нізкапробнай культуры сярод грамадства ў самых розных сферах мастацтва. Кіч масавай культуры пачынае дамінаваць, пачынае існаваць як пажаданы жыццёвы стыль, нейкая норма, да якой трэба імкнуцца. Павялічваецца колькасць людзей, якія не здольныя адрозніць сапраўдных каштоўнасцей ад сярмяжнай падробкі і падману. Гэтая сітуацыя з'яўляецца сур'ёзнай праблемай нашага часу. Адбываецца папулярызацыя простага, лёгкага жыцця, у якім няма месца "мастацтву для мастацтва". Новыя нормы знішчаюць *лёсы маладых людзей, якія саладжавую ману прымаюць за пажаданае шчасце*[21].

М. Андрасюк закранае ў сваёй прозе і тэму палітыкі, і яе ўплыву на штодзённае чалавечае жыццё. У прыватнасці, у апавяданні "Кароткая гісторыя партыі кучаравых" ён парадыйнымі сродкамі адлюстроўвае палітычнае жыццё ў мястэчку. У першых дзвюх частках апавядання "Зачацце" і "Прэсавыя водгукі" даведваемся, што партыя ўзнікла падчас сустрэчы сяброў у бары "У Алеся". Яны вырашылі *ўдасканаліць і выратаваць свет* (...) *з далёкім разлікам* (55). Аб'ява аб гэтай падзеі была спантанна змешчана на сурвэце. На наступны дзень, калі галава аднаго члена яшчэ цалкам не выцверазела пасля дэгустацыі алькагольных напіткаў, узніклі галоўныя лозунгі партыі: *Праца толькі працавітым, бабы – бабнікам, а віно – вінаватым,* (...) (57). Можна сказаць, што ў гэтым творы:

> Кожны новы эпізод, новая сустрэча – не проста эмацыянальны ўсплеск, а сапраўдная аўтарская знаходка, дасканалы партрэт, выпісаны з натуры. Цікавым аспектам апавядання з'яўляецца спецыфічная натуральнасць гратэскнасці персанажаў, якая не выклікае здзіўлення ці непаразумення, а з'яўляецца не менш як каларытнай ілюстрацыяй да "выкрыцця ідыятызму жыцця[22].

Так, у апавяданні "Кароткая гісторыя партыі кучаравых" М. Андрасюк у кантэксце існавання партыі іранічна паказвае паводзіны розных людзей. Новымі падзеямі ў мястэчку хутка зацікавілася прэса, якая друкуе праграму новай партыі. Менавіта адна жанчына, даведаўшыся з газеты, што члены партыі *богабоязных жонак і дочак кінуць на волю распусным бугаям, а лепшыя штукі адправяць за*

[21] Тамсама, с. 113.

[22] Лада Алейнік, *Погляд на жыццё з вышыні палёту (Проза Міхася Андрасюка)*, "Тэрмапілы" 2004, № 8, с. 231.

мяжу, (...) (57) у арыентальныя гарэмы, падумала, што можна з гэтага нешта паймець. Спадзявалася яна атрымаць ад шэйха кватэру для сваёй дачкі. Інспектар Біндзюк, прачытаўшы, што праца будзе толькі працавітым, ідучы за парадай рэдактара газеты, пачаў шукаць сабе месца на могілках. Менавіта спрэчка вакол магілы становіцца прычынай разбурэння яго сям'і. Функцыянаванне Партыі кучаравых сталася таксама прычынай душэўнай хваробы адваката Нязгулы і ўступлення ў яе шэрагі лысага бандыта.

Своеасаблівы прыпынак у вандроўцы па праблемах маленькіх людзей у постсацыялістычным мястэчку можам знайсці на Вуліцы Добрай Надзеі. Усіх сустракае тут цётка Варвара – *усім праваднікам праваднік* (71), якая мае місію ад Усявышняга, каб *не парваліся сувязі між людзьмі* (72). Безумоўна, апавяданне "Вуліца Добрай Надзеі" адрозніваецца сваёй спакойнай, лагоднай танальнасцю ад іншых твораў са зборніка "Фірма".

> І так гэта з надзеі на лепшую будучыню нарадзілася наша вуліца. І з пагоні за прыгажэйшым жыццём, і са спадзяванняў на белы хлеб у белых далонях, і з пачутых у дзяцінстве казак пра мужыка, які царом стаўшы, валодаў светам доўга ды справядліва.
>
> Наша вуліца дзякуючы надзеі ўсё яшчэ разрастаецца і павялічваецца, а чарговыя ўцекачы з прыпушчанскай Безнадзеі якраз тут знаходзяць сваю прыстань (72).

На гэтай вуліцы спакою не змогуць парушыць некультурныя паводзіны некаторых асобеняў, якія імкнуцца *ў навакольлі першага або дзесятага дня месяца* (...) *вярнуцца да найранейшых вытокаў. Такія індывіды дастаюць з сябе гукі, падобныя на мяўканне і кваканне; бывае, што прымаюць пляската-гарызантальную выпраўку, стараючыся магчыма найшчыльней прытуліцца да* (...) *зямелькі-матулі* (74). Нават на чацвёрты дзень вайны *на нашай вуліцы – цішыня і спакой* (75). Толькі шматлікія забароны і тэлевізар напамінаюць аб ёй. Адначасова насельнікі вуліцы ведаюць, што спакой можа быць перарваны вайсковым загадам абароны радзімы. М. Андрасюк даводзіць, што *"соннае царства" здольна на вялікія справы, але ўсё ж перад гэтымі справамі ёсць іншыя, якія вымагаюць і часу, і сілы, і засяроджанасці, і адданасці – праца, сям'я, звычайны, такі банальны быт*[23].

[23] Лада Алейнік, *Погляд на жыццё з вышыні палёту (Проза Міхася Андрасюка)*, "Тэрмапілы" 2004, № 8, с. 233.

Як заўважаецца ў апавяданнях “Кароткая гісторыя партыі кучаравых” і “Вуліца Добрай Надзеі”, у нашыя часы часта бывае так, што такія сферы чалавечага жыцця, як эканоміка, сямейныя справы, каханне і палітыка часта перакрыжоўваюцца. І вось гэтыя працэсы, увесь кантэкст жыцця простых людзей схапіў пісьменнік у сваіх творах у жывапісальныя вобразы.

Галіна Тычка вылучае ў зборніку М. Андрасюка “Фірма” тры кампазіцыйныя блокі, у якія паяднаны невялікія навелы, у адно цэлае: *Бар у Алеся*, *Кароткая гісторыя кучаравых* і *Вуліца добрай надзеі*. Гэтыя навелы аб’ядноўваюцца *агульным месцам дзеяння ў прасторы ці часе. Такім чынам дасягаецца дакладнасць узнаўлення атмасферы правінцыі, з яе традыцыйнымі суседска-сваяцкімі сувязямі, запаволеным напаўвясковым побытам, але і з яе вялікімі праблемамі, выкліканымі зрухамі ў далёкім індустрыяльна-тэхнакратычным свеце*[24].

Гэты свет правінцыйнага мястэчка ствараюць розныя тыпы людзей: Толік, Ціхапук, Стручук, Кашалюк, дзядзька Кандрат, Юрка, Владак, Тадзік Навіцкі, цётка Варвара, Зося, Валя Курапатка, каляровая Амелька. Як дакладна акрэслівае іх Я. Чыквін, гэта *паўнакроўны, жывы свет дробнага, смешнаватага паўсялянства-паўместачкоўцаў, паўінтэлігентаў, адным словам, сваеасаблівага сацыяльнага маргінэсу на сумежжы нашай польска-беларускай рэчаіснасці*[25].

Хаця нярэдка адлюстраваныя М. Андрасюком гісторыі сумныя, пры ўзнаўленні характараў сваіх герояў, пры ўзнаўленні падзей ён карыстаецца гумарам, камізмам сітуацыйным. Варта пагадзіцца з Ладай Алейнік:

> Спрытны жарт, эмацыянальны досціп з’яўляюцца састаўнымі элементамі гумару пісьменніка. Трапная аналогія ўзмацняе сатырычнае гучанне твора, стварае эфектную і эфектыўную падфарбоўку для вылучэння ідэйнага сэнсу твора. Пісьменнік таленавіта расквечвае сюжэтныя перыпетыі гумарыстычнымі фарбамі, аздабляючы падзеі арыгінальнымі мастацкімі дэталямі[26].

---

[24] Галіна Тычка, *Проза Міхася Андрасюка: пошукі новых шляхоў мастацкага асэнсавання жыцця*, “Тэрмапілы” 2003, № 7, с. 113.

[25] Ян Чыквін, *Сцэны з нашага тэатрума*, “Тэрмапілы” 2001, № 4–5, с. 269.

[26] Лада Алейнік, *Погляд на жыццё з вышыні палёту (Проза Міхася Андрасюка)*, “Тэрмапілы” 2004, № 8, с. 232.

Пры тым трэба адзначыць, М. Андрасюк *валодае мераю і адчуваннем межаў у "порцыях" смеху*[27], бо ён любіць людзей, умее ім спачуваць і эмацыянальна суперажываць любым іхнім нягодам.

Звяртае на сябе ўвагу тое, што заключныя апавяданні зборнікаў "Фірма" і "Мясцовая гравітацыя", з'яўляюцца своеасаблівым абяцаннем, сведчаннем, пераходам да мастацка-эстэтычных вырашэнняў у новых кнігах. У апошнім апавяданні першай кнігі "Колька, які лётаў над мястэчкам" М. Андрасюк сцвярджае, што мэтанакіраваны, верны сваім марам чалавек абавязкова дасягае вынікаў, здзейсняе свае памкненні. Няма нічога дзіўнага ў тым, што дзеці мараць стаць лётчыкам, матросам або камандзірам партызанскага атрада. Рэдка сустракаюцца асобы, якім хочацца лётаць як птушка або як вецер. З аднаго боку, слушна сябры Колькі палічылі яго дзіваком, бо згодна з фізічнымі законамі *Можна ж адарвацца ад зямлі на самалёце, на аэрастаце, ну, няхай сабе і на крылах, бы Ікар, пра якога ў школе талкавала пані настаўніца. Аднак крыліцца вось так, з сябе самога? Не здаралася падобнае ні ў нашым мястэчку, ні нават у вялікіх гарадах* (84). З другога боку, толькі летуценнікі, насуперак усеагульнаму нявер'ю, здольны асягаць свае мроі, пераходзіць любыя мяжы, перамагаць бар'еры. Колька даказаў сябрам, што вернасць марам адплачвае тым, што яны здзяйсняюцца. Ідэя "Колькі, які лётаў над мястэчкам" у тым, што мусім быць вельмі настойлівымі ў дасягненні мэты. У гэтым апавяданні адчуваецца аптымістычны *заклік да здзяйснення самых смелых мараў і жаданняў, вера ў будучыню, якая амаль заўсёды перамагае безнадзейнасць*[28].

Колька, прыляцеўшы да сяброў маленства, доўга не забавіўся ў іх. Магчыма, гэта з прычыны таго, што вецер падымаўся і цямнела, а можа таму, што *Бываюць людзі, якіх сустракаеш штодзённа і нагаварыцца з імі не паспееш. Бываюць і другія, стрэнеш такога раз у гадоў дзесяць і адно, што табе прыходзіць на думку, – гэта маўчанне* (86). Безумоўна, Колька ўразіў знаёмых сваімі здольнасцямі, а адначасова прысароміў, што яны так хутка забыліся аб сваіх летуценнях, што іхняе жыццё такое звычайнае, усеагульнае, прадбачальнае. Яны ўжо жывуць у двух розных "светах". Гэтае апавяданне здзіўляе чытача сваёй рамантычнасцю. Сваім пафасам, стылем яно нагадвае мастацкае све-

[27] Тамсама, с. 236.

[28] Лада Алейнік, *Погляд на жыццё з вышыні палёту (Проза Міхася Андрасюка)*, "Тэрмапілы" 2004, № 8, с. 236.

табачанне Антуана де Сэнт-Экзюперы, а асабліва яго казку “Маленькі прынц”.

Сімвалічнае значэнне мае і “Дом”, апошняе апавяданне са зборніка “Мясцовая гравітацыя”. У структуры гэтага твора ўжо праглядаюць абрысы новых твораў М. Андрасюка. Дом з’яўляецца персаніфікаваным вобразам чалавека, лёс якога залежыць ад іншых. Розныя людзі маюць свае канцэпцыі адносна яго быцця або небыцця. Аўтар твора звяртае ўвагу на значнасць слова, слоў, якія *таксама, бы трускаўкі і кукуруза, спеюць сваім шляхам – часам ад сонца, часам ад дажджу. Часам днём, а часам ноччу. А паскораныя нецярплівасцю вырастаюць вялікімі, пустымі гібрыдамі. Часам варта памаўчаць, як чыніць гэта дом, бо толькі той, хто ўсё ведае, можа сабе такое дазволіць* (146).

М. Андрасюк канцэнтруецца ў сваіх творах на лёсе звычайных жыхароў невялікага гарадка, мястэчка, найчасцей простых людзей. Відавочна гаворачы пра канрэтных людзей, пісьменнік адначасова выказваецца пра агульначалавечыя праблемы, разважае над тым, што актуальнае для чалавека ва ўсе часы. З поўным правам можна сцвердзіць, што “белавежац” М. Андрасюк, упісаны ў агульнабеларускі кантэкст, адораны цудоўным талентам, мадэлюе свой непаўторны мастацкі свет, бачыць у непрыкметным значнае.

STRESZCZENIE

W artykule poświęconym twórczości Michała Androsiuka, autora książek prozy „Firma”, „Miejscowa grawitacja”, „Biały koń”, napisanych w języku białoruskim, analizowany jest świat przedstawiony, w którym odzwierciedla się prowincjonalna rzeczywistość z polsko-białoruskiego pogranicza kulturowego i narodowościowego z jego iluzjami, „miejscową grawitacją” na przełomie burzliwych lat 90-ch XX wieku, gdy następuje gwałtowna zmiana dotychczasowych wartości i ideałów. W warstwie obrazowo-stylistycznej utworów podkreślona jest cecha dla nich zasadnicza – stopniowe ewoluowanie pisarza od szczegółu do pierwiastków ponadczasowych, przechodzenie od gatunku opowiadania do gatunku przypowieści.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Іаанна Васілюк
Беласток

Беларускі патрыятызм у творчасці "лірніка вясковага" Уладзіслава Сыракомлі

Многія творы першай паловы XIX ст. напісаны па-польску аўтарамі, этнічна звязанымі з Беларуссю, якія, паводле слушнай заўвагі Уладзіміра Мархеля, *арганічна ўваходзяць у гісторыю беларускай літаратуры як польскамоўная плынь... Гэтая літаратурная спадчына, як адна рука, на якую, каб наблізіцца да аб'ектыўнасці, трэба глядзець з беларускага і польскага бакоў. Пальцы яе сціснуты ў кулак, і мы бачым яго толькі знешні бок – польскамоўную абалонку, а далонь будзе схавана, пакуль кулак не расціснецца і не выпрастаюцца пальцы, гэта значыць пакуль не будзе вывучаны беларускі пачатак твораў, напісаных па-польску нашымі аўтарамі*[1].

Асаблівае месца сярод іх належыць Уладзіславу Сыракомлю (Людвіку Кандратовічу 1823–1862 гг.), аднаму з пачынальнікаў новай мастацкай беларускай традыцыі, "лірніку вясковаму". Ён пісаў у вершы "Вызваленне сялян": *Бо мой прадзед шчырым быў ліцвінам*[2], і сам паэт адчуваў сябе ліцвінам. Сыракомлевай Літвою была Беларусь – Палессе з вёскай Смольгаў, дзе нарадзіўся паэт, і Яськавічамі, дзе прайшло яго маленства. Гэта Капыльшчына, Нясвіжчына, дзе прайшла асноўная частка жыцця паэта, гэта і надвіленскія мясціны. Літвой для У. Сыракомлі было гістарычнае Вялікае княства Літоўскае, куды, як зазначае

[1] У. І. Мархель, *Прысутнасць былога: Нарысы, артыкулы, эсэ*, Мінск 1997, с. 15.

[2] *Літаратура Беларусі, першая палова XIX ст. Хрэстаматыя*, укл. К. А. Цвірка, Мінск 2000, с. 408. (Тут і далей спасылкі на гэтае выданне. У дужках падаецца старонка).

Кастусь Цвірка, уваходзіла як этнаграфічная Літва, так і ўся Беларусь[3]. Адначасовае выкарыстанне розных этнонімаў – ліцвіны, русіны, беларусцы, беларусы – ускладняла працэсы самаідэнтыфікацыі беларускага народа. Страта ўласнага гістарычнага імя ў XIX ст. адлюстравала нацыянальную трагедыю беларусаў.

Пачынаючы з другой паловы XVII ст., літаратурная старабеларуская мова перастае ўжывацца ў справаводстве, а затым і ў іншых сферах культурнага жыцця. У XVIII ст. старабеларускае пісьменства канчаткова выйшла з ужытку. Беларускія магнаты і шляхта, а таксама амаль уся інтэлігенцыя засвоілі польскую мову і культуру, а вуснай беларускай мовай у розных дыялектах карысталіся сялянства, збяднелая шляхта. Пасля далучэння Беларусі да Расіі афіцыйнае становішча ў краі заняла руская мова, аднак у грамадскім і культурным жыцці аж да падаўлення паўстання 1863–1864 гг. панавала польская мова. Гэта тлумачылася ў значнай ступені тым, што з аднаўленнем самастойнасці польскай дзяржавы беларуская шляхта спадзявалася здабыць свабоду і для Беларусі.

На час далучэння да Расійскай імперыі Беларусь мела багаты культурна-гістарычны вопыт і сталыя культурныя традыцыі, якія складваліся на працягу стагоддзяў. Уключэнне ў новы дзяржаўны арганізм, які ў сваю чаргу вызначаўся ўласнымі, здаўна выпрацаванымі, культурнымі здабыткамі, не магло не паўплываць на далейшае культурнае развіццё беларускага краю. Гэта таксама садзейнічала кансалідацыі беларускага народа, росту яго самасвядомасці як асобнай этнічнай супольнасці. У выніку фарміраваўся ўстойлівы беларускі характар, лепшымі рысамі якога сталі талерантнасць, працавітасць, павага да суседніх народаў. Адначасова ішоў працэс узаемаўзбагачэння, знаёмства беларусаў з лепшымі ўзорамі рускай і польскай культуры.

Вызначэнне нацыянальнай прыналежнасці адукаванага чалавека было ў той час звязана з дзяржавай, канфесіяй і тэрыторыяй, дзе ён нарадзіўся. Шляхта Беларусі і Літвы вызначала сваю нацыянальную прыналежнасць як польскую. Пра нацыянальнае самавызначэнне ў першай палове XIX ст. непісьменнага сялянства гаварыць не даводзіцца. Сяляне часцей за ўсё называлі сябе тутэйшымі або мужыкамі.

[3] К. А. Цвірка, *Слова пра Сыракомлю*, Мінск 1975, с. 87.

Фарміраванне беларускай нацыі, сацыяльна-эканамічныя змены ў грамадстве, а таксама хваля агульнаславянскага нацыянальнага адраджэння на працягу XIX ст. садзейнічалі выпрацоўцы новай беларускай літаратурнай мовы на базе шматлікіх беларускіх гаворак.

У першай палове XIX ст., па сутнасці, адзінай сферай выкарыстання новай беларускай мовы была мастацкая літаратура. У сувязі з цяжкасцямі выхаду ў свет беларускіх кніг, што было звязана найперш з забаронай у 1840 г. царом Мікалаем I беларускага друку, і ўвогуле забаронай карыстацца тэрмінам *Беларусь*, беларускія творы выдаваліся лацінскім шрыфтам. Літаратура гэтага перыяду была пераважна рукапіснай і ананімнай. У гэты час у літаратуры з’явіліся таленавітыя паэты і празаікі з асяроддзя апалячанай беларускай шляхты, якія ішлі да творчасці на беларускай мове ад захаплення народнымі казкамі, песнямі, паданнямі і легендамі.

Большая частка твораў выходзіла ў Вільні, а таксама ў Варшаве, Пецярбургу і Маскве. Друкуючы беларускія матэрыялы і творы беларускіх пісьменнікаў, рускія і польскія выдаўцы і рэдактары аказвалі маладой беларускай культуры неацэнную паслугу.

Вялікая роля ў абуджэнні нацыянальнай свядомасці народа належыць тагачаснай літаратуры Беларусі. Першапачаткова амаль уся літаратура стваралася на польскай мове, аднак асноўным зместам яе было жыццё беларускага народа з усімі яго праблемамі.

Ля вытокаў нацыянальна-культурнага адраджэння стаялі інтэлігенты – пераважна выхадцы з акаталічанай і апалячанай у часы Сярэднявечча беларускай шляхты. Многія з іх былі выхаваны ў польскім патрыятычным духу. Пры гэтым яны з дзяцінства добра ведалі і простую (беларускую) мову, а пазней, вывучаючы гісторыю роднага краю, даведаліся і аб яго багатай мінуўшчыне.

Уладзіслаў Сыракомля вырас сярод сялянскіх дзяцей; з імі бегаў да Нёмана, па палях і лугах. Начлежныя вогнішчы і празрыста-ружовыя росныя раніцы, як заўважыў У. Мархель, выклікалі замілаванне адвечным, някідкім хараством тутэйшай зямлі. У маладыя гады У. Сыракомля зачытваўся баладамі Адама Міцкевіча і аповесцямі Вальтэра Скота. Распачаў вучобу, між іншым, будучы паэт у Нясвіжскай павятовай школе, якая, на жаль, у лістападзе 1835 г. была зачынена ўладамі. Таму, заключныя чацвёрты і пяты класы ён давучваўся ў Наваградку, і якраз у той школе, якую закончылі сябры Адам Міцкевіч і Ян Чачот. Праца ў нясвіжскай канцылярыі адкрывала перад Людвікам вялікія магчымасці для самаадукацыі, творчага росту. Менавіта ў Нясвіжы ён зблізіўся з выпускнікамі Віленскага універсітэта,

а таксама закахаўся ў Паўліну Мітрашэўскую, якая стала 16 красавіка 1844 г. яго жонкаю. Маладыя Кандратовічы вярнуліся ў арандаваны бацькамі фальварак Залуча. І менавіта тут Людвік Кандратовіч вырас у паэта Ул. Сыракомлю, стаў лірнікам вясковым. Пачутая аднойчы ў кірмашовы дзень у карчме гісторыя старога чалавека, так уразіла, узрушыла яго, што вылілася ў цудоўны твор. Верш "Паштальён" пабачыў свет у 1844 г. у часопісе "Atheneum", падпісаны скрыптонімам NN, жанрава вызначаны самім аўтарам як "народная гутарка". Паэтычны дэбют Ул. Сыракомлі аказаўся надзвычай удалым, набыў вялікую папулярнасць. У прыватнасці, твор быў перакладзены на рускую мову яраслаўскім паэтам Леанідам Трэфалевым і стаў папулярнай у Расіі песняй "Когда я на почте служил ямщиком..." Героем гутаркі з'яўляецца просты чалавек, паштальён, які расказвае сваю жыццёвую трагедыю. Прычынай яе сталася, паводле паэта, сацыяльная прыгнечанасць народа: паштальён не збочыў з дарогі, каб дапамагчы занесенай снегам дзяўчыне (як пасля аказалася – сваёй каханай), бо гэта затрымала б яго ў дарозе, а за недастаўленую своечасова эстафету, яго чакала фізічнае пакаранне. Такім чынам, ужо першым друкаваным творам У. Сыракомля сцвердзіў, што галоўным пафасам яго творчасці будзе спачуванне скрыўджанаму, прыгнечанаму чалавеку.

У Залучы паэт працаваў многа і плённа. У гэты час ён напісаў м. інш. гутаркі: "Дабрародны Ян Дэмбарог", "Хадыка"; вершы: "Вясковы лірнік", "Прысвячэнне ліцвінам народных гутарак", "Бусел", "Добрыя весці" і іншыя. Аднак у 1852 г. разам з сям'ёй і Вінцэнтам Каратынскім, які выконваў абавязкі сакратара і быў паплечнікам паэта, Ул. Сыракомля выязджае ў Вільню, а неўзабаве перабіраецца з шумнай сталіцы ў фальварак Барэйкаўшчына. Гэтае апошняе жыццёвае дзесяцігоддзе паэта вызначаецца ўзмацненнем у яго творчасці грамадзянскіх матываў. З-пад яго пяра выходзяць творы: "Вызваленне сялян", "Сахар-мароз", "Улас"... У 50-тыя гг. У. Сыракомля некалькі разоў наведвае Польшчу, таму ў 1859 г. паэт аказваецца пад паліцэйскім наглядам. Падазравалі яго ў распаўсюджванні па-за межамі краіны атныўрадавых твораў. Апошняя паездка ў Польшчу адбылася без дазволу улад, паэта арыштавалі 30 красавіка 1861 г., хворага на сухоты амаль месяц пратрымалі ў Віленскай турме, а пасля да заканчэння следства пад наглядам паліцыі яму дазволілі жыць у Барэйкаўшчыне. 15 верасня 1862 г., знаходзячыся ўжо на лячэнні ў Вільні, Ул. Сыракомля памёр.

Амаль цэлае сваё жыццё У. Сыракомля пражыў у межах сённяшняй Беларусі. Хаця ён пісаў на польскай мове, мове тагачасна-

га пісьменства і справаводства на Беларусі, але ёсць у яго творы і беларускамоўныя. На жаль, да нашага часу дайшла толькі маленькая частка беларускай спадчыны паэта: вершы “Добрыя весці” і “Ужо птушкі пяюць усюды”. У сапраўднасці ж беларускіх вершаў было, відаць, больш. *Jeśli do nas doszły tak skąpe białoruskie wiersze Kondratowicza, to w pewnej mierze winne są wypadki wojenne, ale też niewątpliwie fakt, że wiele z nich krążyło w rękopisach. Przecież i polskie, jak “Na wyzwolenie włościan”, “Owidiusz na Polesiu”, “Sachar-maroz”, tylko w odpisach były podawane z ręki do ręki, a sytuacja piśmiennictwa białoruskiego*, – слушна заўважае польскі даследчык яго творчасці Францішак Беляк – *była jeszcze gorsza*[4]. Заканспіраваныя беларускія вершы У. Сыракомлі перапісваліся і распаўсюджваліся нелегальна, што з’яўляецца сёння сапраўднай прычынай няпоўнай творчай спадчыны паэта.

У. Сыракомля наракаў у пісьме Рамуальду Падбярэскаму: *часы не для літаратуры... Цэнзура такая вострая, што кожнага, хто піша, можа канчаткова адбіць ад справы. Пішы тут і друкуй*[5]. Варта зазначыць, што паэт, паводле ўспамінаў свайго памочніка-сакратара В. Каратынскага, параіў таму не ўключаць яго беларускамоўных твораў у адзін зборнік з польскімі вершамі. *Сярод маіх твораў* – пісаў лірнік – *ёсць таксама трошкі беларускіх. Прапаную тады, каб мы разам, у адной кнізе, выдалі нашу беларускую паэзію*[6]. На жаль, лёс амаль усёй беларускамоўнай творчасці паэта застаецца невядомым.

Бясспрэчнай увагі заслугоўвае тут верш “Добрыя весці”, які быў напісаны У. Сыракомлем у 1848 г. на беларускай мове. Гэты твор трапіў у друк без подпісу яшчэ пры жыцці паэта ў 1862 г., надрукаваны быў у нелегальнай беларускай агітацыйнай брашурцы “Гутарка старога дзеда”. Раней верш распаўсюджваўся вусна. У 1845–1848 гг. рэвалюцыйным рухам была ахоплена амаль уся Еўропа. Гэтыя падзеі, вядомыя пад назвай вясны народаў, аказалі значны ўплыў на грамадскі рух у Беларусі. Як лічыць Адам Мальдзіс, “Добрыя весці” з’яўляюцца водгукам на сялянскае змаганне і адмену прыгонніцтва ў Галіцыі. Гэтаксама мяркуе Фэлікс Фарнальчык, аўтар манаграфіі пра У. Сыракомлю, які даводзіць, што прыезджыя студэнты з Кіева прывозілі ў Залуча інфармацыю пра падзеі ў Галіцыі 1848 г.: *wieści o zawieruchach socjalno-narodowych owego burzliwego 1848 roku dotarły do Załucza – i że poeta*

[4] F. Bielak, *Władysław Syrokomla. Wybór poezji*, Wrocław 1970.

[5] К. А. Цвірка, *Слова пра Сыракомлю*, с. 47.

[6] Цыт. за: У. І. Мархель, *Творчасць Уладзіслава Сыракомлі*, Мінск 2005, с. 120.

nie pozostał wobec nich obojętny[7]. Магчыма, гэта сталася штуршком да напісання верша. Лірычны герой з сардэчнасцю вітае *вецер з заходніх небёс* (389), які прынёс на родную зямлю весці, добрыя весці. Новай з'явай у беларускай літаратуры, як справядліва адзначыў Віктар Каваленка, *быў вобраз ветру як алегорыя вестак*[8]. У. Сыракомля піша пра рэвалюцыю па-народнаму проста, зразумела. Аўтар апісвае падзеі на захадзе, дзе *б'юцца для славы, свабоды і чэсці / І робяць вольных людзей з мужыкоў*. Тым самым ён паказвае свайму народу шлях да свабоды і шчасця, заклікае да барацьбы:

Годзе вам, годзе, царыкі-паганцы,
Таптаць у балотах хрышчоны народ. (390)
...
Годзе вам, годзе, мужыцкія дзеці,
З хаткі астаткі даваць на набор.

Думаецца, што гэты верш цалкам невыпадкова быў напісаны паэтам на беларускай мове – мове, якой карыстаўся толькі просты народ. Толькі ён мог зразумець думку аўтара, які выявіў ідэю твора пры дапамозе персаніфікацыі ветру і весцяў, якія былі зразумелыя і блізкія да вуснай творчасці простага народа. Паэт сваёй творчасцю паказваў беларускаму селяніну шлях да лепшага жыцця, да свабоды.

Іншы быў лёс другога беларускамоўнага верша "Ужо птушкі пяюць усюды", які быў напісаны У. Сыракомлем у 1861 г. Гэты твор, які У. Мархель назваў мініяцюрай, не распаўсюджваўся ў рукапісах як "Добрыя весці". Першы раз ён пабачыў свет у 1912 г. пад назвай "Беларускі верш". Упершыню ў беларускай літаратуры у вершы "Ужо птушкі пяюць усюды" паэт стварае вобраз вясны з алегарычным зместам надзеі, перамогі, абуджэння. У творы выразна гучаць патрыятычныя матывы, навеяныя грамадскімі падзеямі – паказаны настроі сялянства перад адменай прыгоннага права. Паэт гаворыць вуснамі мужыка, уводзіць у верш іронію як мастацкі сродак:

І нашто вясна нам, Божа?
Мы адвыклі ад вясны...
Елкі ў лесе, мох на стрэсе
Зелянеюць заўсягды... (410)

[7] F. Fornalczyk, *Hardy lirnik wioskowy*, c. 164.

[8] В. А. Каваленка, *Вытокі. Уплывы. Паскоранасць*, Мінск 1972, с. 121.

Беларускі даследчык Алесь Яскевіч лічыць У. Сыракомлю пісьменнікам, які ў працэсе станаўлення нацыянальнай літаратуры 40–60-х гг., *как никто потрудился над укреплением национальных основ новой белорускоӥ литературы, делавшей в ту пору первые шаги*[9].

Сучаснікі паэта называлі У. Сыракомлю рамантыкам, але яго творчы стыль быў надзвычай адметным, і не абмяжоўваецца адно адзнакамі рамантызму. Як творчая індывідуальнасць пісьменнік развіваўся ў самы складаны сацыяльна-палітычны час – паміж двума паўстаннямі 1830 г. і 1864 г. Варта пагадзіцца з даследчыкам творчасці лірніка вясковага У. Мархелем, які творчую спадчыну паэта называе гістарычна абумоўленым феноменам, *што ўзнік і развіўся ў 40–50-я гады XIX ст. у атмасферы нацыянальна-вызваленчага і антыфеадальнага руху, напярэдадні рэформы 1861 г. і паўстання 1862 г., на аснове польскай і беларускай культур*[10]. У. Сыракомля свядома пераняў толькі некаторыя элементы рамантычнага ўспрымання свету і мастацтва, і таксама толькі пэўныя спосабы паэтычнай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці, што, відаць, адпавядалі ягонаму светапогляду. *Ён*, як зазначыў Іван Штэйнер – *трымаючыся дакладных рэалій існуючага свету, цалкам заставаўся ў коле ўяўленняў сваёй сацыяльнай сферы, прытрымліваючыся вернасці памкненням і патрэбам свайго часу. Гэта ў значнай ступені дапамагло стварыць уласную традыцыю, у якой маглі спалучацца слынныя гістарычныя падзеі з найбольш яскравымі ўзорамі фальклору шляхты і простага люду*[11]. Такім чынам, зварот да мінулага дазволіў суаднесці старажытнасць з рэаліямі сённяшняга дня. Тут варта ўзгадаць паэму-гутарку У. Сыракомлі “Urodzony Jan Dęboróg”. У літаратурнай спадчыне паэта амаль усе творы апяваюць Літву – яго Айчыну. Ва ўступе да гэтай гутаркі паэт звяртаецца непасрэдна да роднай зямлі: *Ziemio moja rodzona, Litwo moja święta!*[12] З вялікім жалем пытаў ён, чаму ў яго краі няма лірнікаў, гусляроў, як сярод казакаў або песняроў, падобных да шатландскіх бардаў? Ці няма нічога цікавага ў гэтым краі?!

---

[9] А. С. Яскевич, *Становление белорускоӥ художественноӥ традиции*, Минск 1987, с. 50.

[10] Тамсама, с. 5.

[11] І. Ф. Штэйнер, *Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя*, Мінск 2002, с. 97.

[12] F. Bielak, *Władysław Syrokomla. Wybór poezji*, с. 140.

Lirnik miałby tu piękne i bogate żniwo:
Opiewać nasze krzyże, kurhany i groby,
Od czasów Mendogowych do dzisiejszej doby,
Od baszty w krewskim zamku, gdzie legł Kiejstut stery,
Aż do krzyża nad brzegiem Prypeci lub Szczary[13].

Паэт згадвае помнікі далёкай мінуўшчыны і магілы, дзе ляжаць продкі. Толькі песняры, лірнікі здольныя да таго, каб апяваць помнікі роднай зямлі, паказаць іх усяму свету. У. Сыракомля ў прадмове да паэмы-гутаркі цудоўна апісвае Нёман, які *cicho przebiega rodzinne siedziby, / nie straszny dla żeglarza i spokojny niby, … Taki zda się pokorny, taki niewolniczy!*[14] Але Нёман у адзін момант можа змяніць сваё аблічча і тады *falą zalewa błonie, echem grzmi po borze, / a gdyby jeszcze chwilka – świat zniszczyłby może.* Паэт параўноўвае раку з характарам беларуса, які з'яўляецца спакойным чалавекам, але калі сустрэне па дарозе перашкоды, можа паказаць свой сапраўдны характар: *Ot, tak samo jak Niemen i serce Litwina.* Як зазначае сам аўтар, не трэба мець музычнага таленту каб апяваць родны край і яго народ, можна пераліваць думкі на паперу – пісаць творы, якія сваім зместам пакажуць харство краіны і сапраўднае жыццё яе жыхароў. Відаць, гэтым у значнай ступені тлумачыцца спалучэнне ў творчасці У. Сыракомлі рамантычных і рэалістычных элементаў.

Можна меркаваць, што менавіта таму паэт звяртаецца да гавенды, а не да балады. Абодва гэтыя жанры літаратуры часта заснаваны на народных крыніцах. Аднак, як заўважыў І. Штэйнер, іх падыход да фальклорнага першаўзору зусім іншы. Калі балада арыентуецца на фантастычнае, незвычайнае, ірацыянальнае, то гавенда імкнецца да паказу рэальнасці, сцвярджэння верагоднасці падзей. Цікавым падаецца ў гэтым плане сцвярджэнне Юльяна Рагазінскага: *Nie ma tu słów rzucanych na wiatr, słowo określa konkret, który z kolei znów oddziałuje na nie… dar wywoływania obrazów plastycznych: jak swych współczesnych Syrokomla oprowadzał po litewskich i poleskich chałupach i dworkach, siołach i zaściankach, tak samo wprowadza tam nas*[15].

У. Сыракомля свядома абраў форму гутаркі за асноўны жанр сваёй творчасці, і, як доказна сцвярджае польскі даследчык Ф. Фарнальчык,

[13] Тамсама, с. 144.
[14] Тамсама, с. 142.
[15] W. Syrokomla, *Poezje*, wstęp J. Rogoziński, Warszawa 1972, с. 8.

wybierając formę ludowej gawędy nadał jej własny, indywidualny charakter[16]. Але нельга забываць аб тым, што якраз праграмным творам У. Сыракомлі з’яўляецца верш – “Лірнік вясковы”, дзе паэт усхваляе місію народнага песняра, які са сваёй лірай, зробленай *з чараўнічага дрэва* (392), вандруе па роднай зямлі. Інструмент гэты небяспечны, як зазначае аўтар, бо кожны, хто даткнецца да яго, трапляе назаўсёды ў палон яго гукаў, памрэ *пеючы на ліры*. Лірычны герой гаворыць, што многія людзі зайздросцяць яму, нібыта гэта лёгкая праца. Але пясняр, апяваючы радасці і гора чалавецтва, спявае народу песню яго-нага жыцця і хвалы. Ён ведае, што песня і ліра даюць шчасце, а таксама боль і пакуты, вызначаюць сэнс жыцця і пасмяротную славу[17]. У сваім творы У. Сыракомля раскрыў сваё разуменне ролі песняра, паэзіі і свету. Паэт атаясамлівае сябе з гордым лірнікам, носьбітам народнай песні:

Бог мне болей прызначыў: даў мне талент спявачы!
І прад любым мундзіром
Песню не зніжу і голаў – горды лірнік вясковы,
Памру, пеючы на ліры! (393)

Паэт лічыў, што вясковы лірнік выконвае ролю шатландскіх бардаў або гусляроў казацтва, якія апяваюць свае краіны. Тут, на роднай яго Літве, ёсць многа навакольнай прыгажосці і жыве разумны народ. Лірычны герой не патрабуе помнікаў з мармуру, *песні мае*, гаворыць паэт, *і ў часіну, калі на век я спачыну* (395) будуць яму помнікам. Гэта прыхільнікі яго таленту пачалі прызнаваць у паэце свайго вясковага лірніка. Варта таму пагадзіцца з У. Мархелем, які заўважае, што творам *“Вясковы лірнік” Сыракомля канчаткова сцвердзіў сябе ў польскай літаратуры як пясняр беларускай вёскі*[18].

Паэт шчыра і з зацікаўленнем ставіўся да таго, як жыў бедны беларускі селянін, амаль заўсёды ў сваіх вершах і гутарках рабіў яго галоўным героем. У. Сыракомля паказаў селяніна як чалавека сціплага, ціхага, але разам з гэтым гордага, з пачуццём асабістай годнасці, які не церпіць здзекаў над сабой. Менавіта такім чалавекам з’яўляецца галоўны герой гутаркі з Палесся “Хадыка” (1848 г.). У аснову твора легла рэальная гісторыя пра селяніна, які забіў свайго крыўдзіцеля,

[16] F. Fornalczyk, *Hardy lirnik wioskowy*, Poznań 1972, c. 78.
[17] У. І. Мархель, *Творчасць Уладзіслава Сыракомлі*, с. 42.
[18] Тамсама.

уцёк у лес і больш за трыццаць гадоў не вяртаўся дахаты. Цярпеў голад, холад, пераследаванні, тугу аб сям'і... усё што было яму наканавана. Галоўны герой вяртаецца ў родную вёску ўжо старым знясіленым чалавекам і трапляе пад замак слуцкі:

Абдзёрты старац ціснецца ўпарта,
З дубовым кіем, як разбойнік з лесу.
Страх паглядзець, іскрацца дзіка вочы,
Хаваюць бровы зірк яго трывожны,
Павісла белае валоссе клоччам,
Касцісты твар, пагорбленыя плечы (375).

Так У. Сыракомля пачынае свой аповед, характэрны для жанру гавенды. Ды Хадыка найбольш пакутуе ад душэўных згрызот:

О, цяжка мне! Як цяжка, каб вы зналі,
Чуць на руках расу крыві нявіннай (376).
...
Глупства суд чалавечы! У сэрцы глыбока –
Горшы суд... Там сумленне адно валадарыць (379).

Многа гадоў мінула, але асочнік не можа забыць свайго злачынства і тым самым не можа знайсці шляху да збавення. Кроў чалавека пакінула плямы на вопратцы і нагадвае Хадыку ўжо праз трыццаць гадоў пра забойства: *гэта свежая памяць аб даўнім злачыну* (379). Цяпер асочнік просіць у князя смерці, як лічыць герой, толькі яна зможа заглушыць згрызоты сумлення.

У. Сыракомля паказаў у простым селяніне хрысціянскую душу. Невыпадкова ён і памірае пасля споведзі. А людзям у памяць пра сябе галоўны герой пакінуў вуллі з пчоламі:

...А паміж бароў, сярод імшары дзікай,
Дасюль вядзецца пасека лясная,
Багата дзіў аб ёй апавядаюць
І называюць гэтак жа – Хадыка (389).

У палескай гавендзе паэт паказвае таксама сваё захапленне беларускімі лясамі, непраходнымі гушчарамі, балотамі, дзе безліч жыўнасці і птаства. Аўтар "Хадыкі" малюе цудоўныя сцэны, напрыклад, як асочнік адганяе мядзведзяў ад мёду, як *булькоча* ручаёк у алешніку, *як жа шмат на баравых палянах / пахучых зёлак і раслін мядзвяных* (384). Уся творчасць У. Сыракомлі прасякнута глыбокай любасцю да родных мясцін, маляўнічай прыроды і да простых людзей, якія пражываюць на гэтай зямлі.

Беларускія сяляне ў творах вясковага лірніка бачылі шляхі паляпшэння сваёй долі і лёсу свайго краю ў тым, каб заіснавала ў жыцці сацыяльная справядлівасць, сумленнасць, праўда, каб захоўваючы народныя традыцыі, чэрпаць з суседніх краін тое, што карыснае для паляпшэння жыцця на роднай зямлі. Менавіта з трох сыноў старога войта Сцяпана ў гутарцы “Жменя пшаніцы” толькі адзін Сымон быў варты таго, каб заняць месца бацькі. Ён у адрозненне ад братоў, якія пабывалі ў Германіі і Польшчы і грэбуюць культурай і звычаямі свайго народа, вярнуўся з Украіны з мяшком пшаніцы. Сымон думаў пра жыхараў сваёй вёскі і прывёз збожжа з мэтай паляпшэння жыцця людзей. Рыгор вярнуўся з Нямеччыны захоплены тамтэйшым адзеннем, а беларускі *саламяны капялюш*, паводле яго слоў, ужо нічога няварты, толькі сімвалізуе прыгнечанасць народу. Таксама Васіль, які пабываў у Кракаве, вярнуўшыся, расказваў аднавяскоўцам пра прыгажосць польскай мовы:

Што за мова ў палякаў,
Што за песні, проша пана!
Напяваюць кракавяка,
А мы спяваем так пагана (404).

Ён хоча пераіначыць тое, што было на гэтых землях спакон вякоў. Васіль раіць: *Кіньма спеў стары, жабрачы, / Кракавяка лепш заскачам.* У. Сыракомля паказвае чытачу на прыкладзе Рыгора і Васіля людзей, якія грэбуюць сваімі народнымі звычаямі, забываюць пра сваіх продкаў, аддаюць перавагу чужым песням, танцам, вопратцы, і нават мове, культуры. Відавочна, такія людзі не могуць займаць важных пасад у грамадстве. Менавіта таму бацька прыхільна зірнуў на Сымона, які нічога цудоўнейшага не знайшоў за мяжой, як толькі адну пшаніцу:

Вось адно хіба – пшанічка!
Рэч зайзросная ў тым краі!

Сыракомлеў герой не мог бы жыць на Украіне, нават калі б там горы багацця знайшоў. Радзіма мілейшая сэрцу, ён аддаў бы ўсё, каб толькі вярнуцца назад, *у бацькоўскую хаціну.*

Тут варта ўзгадаць верш “Улас”, у якім У. Сыракомля дае доказ таму, што людзі, якія жылі на гэтай зямлі адвеку, засталіся вернымі народнай традыцыі, *ні ўплывы чужыя, ні звычай найновы / не змянiў іх адзення, іх даўняе мовы* (408).

Народна-беларускімі матывамі і настроямі прасякнуты верш У. Сыракомлі “Бусел”. Любоў да роднага краю і спагада да ягоных

людзей асабліва праявілася ў гэтым вершы. Надыходзіць цяжкая для буслоў пара – зіма. Лірычны герой вымушаны ляцець у далёкія краіны, на Ніл. Але ён ведае, што там, на чужыне, будзе *думаць думку пра край тутэйшы*[19]. Будзе таксама нецярпліва чакаць гэтай пары, калі вернецца на Радзіму. З жалем думае ён аб тым, што можа ніколі ўжо больш не пабачыць сваёй зямелькі:

А толькі... толькі ведама Богу,
Ці смерць у дарозе абміну!
Пабачу ж Нёман і азярыну?!
Сяду ж на купцы мурогу?![20]

Шкада яму пакідаць роднае гняздо, дзе зазнаў столькі шчасця. *Я ж тут радзіўся, дзе мая хата* – тужыць лірычны герой. Тут, у гэтым гняздзе, нарадзіліся яго дзеткі. Невядомым з'яўляецца яго далейшы лёс: што ён застане на Бацькаўшчыне, калі вернецца назад:

Ці не заплачу па згубе!
Ці, прыляцеўшы вясной з выраю,
Гняздо застану на дубе!

Прыгнечаны сваімі думкамі аб роднай зямлі, бусел узняўся паволі і паляцеў далёка ў вырай *шукаць і шчасця і долі*[21].

У. Сыракомля быў гарачым патрыётам сваёй Радзімы. Беларуская тэматыка пераважала ў яго творчасці, ён свядома прысвяціў яе братам *з-пад Вяллі, з-пад Нёмана* (391). Менавіта ў творы "Прысвячэнне ліцвінам народных гутарак" паэт сцвярджае, што ягоная песня ў першую чаргу скіравана бедным:

Сэрца, жыццё я аддаць гатовы,
Пяю табе, мой народ шарачковы,
Толькі з табой спадзяванні злучаю,
Смутак і радасць, хвіліны адчаю...
Хай пад страхою жабрацкай хаціны
Верш прачытаюць браты-ліцвіны,
Калі адчуюць брата ў паэце,
Значыць, не марна жыў я на свеце (392).

[19] *Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай. Беларуская польскамоўная паэзія XIX стагоддзя*, укл. У. І. Мархель, Мінск 1998, с. 471.

[20] Тамсама, с. 473.

[21] Тамсама.

Паэт упэўнены, што яго *верш з-пад сякеры* (391) будзе зразумелым толькі простымі людзьмі, якія жывуць на гэтай зямлі. Паэт сваімі радасцямі і хваляваннямі можа падзяліцца толькі з імі, нездарма называе сялян сваімі браткамі, *у сярмязе і ў світцы*. В. Каваленка доказна сцвярждае, што ў вершы *“Прысвячэнне ліцвінам народных гутарак” У. Сыракомля разгортвае цэлую эстэтычную праграму служэння народным інтарэсам*[22]. Творчасць вясковага лірніка непарыўна звязана з жыццём вёскі – яна з’яўляецца рэхам сумных песень беларускага народа[23]. У. Сыракомля як паэт, творчы метад якога блізкі рэалістычнаму асэнсаванню рэчаіснасці, несумненна, разумеў патрэбу абуджэння самасвядомасці селяніна і таму нават у вершах, дзе ўвасабляецца патрыятычная тэма, ён паказаў нацыянальны прыгнёт беларускага народа ў цеснай сувязі з яго сацыяльным прыгнётам.

У. Сыракомля ў сваім вершы “Не я пяю – народ божы” падкрэслівае еднасць сваёй творчасці з нядоляю пакрыўджаных. Паэт часта ўставаў у абарону бяспраўнага і прыніжанага селяніна. Словы яго клаліся ў сэрцы, а ў пэўны момант ён выказваў іх у гарачых паэтычных радках. Паэт бачыў, што дапамагчы беларускаму сялянству можа найперш сваёй творчасцю, хоча *быць песняром-заступнікам народа*[24]. Ён ведаў цяжкае жыццё сялян з ваколіц Залуча і адносіны з імі адкрывалі паэту вочы на неверагодна жорсткую рэчаіснасць.

Галоўнымі героямі яго твораў былі простыя людзі – вясковы лірнік, малады паштальён, асочнік, старцы-жабракі, у якіх паэт бачыў непрыкметную мужнасць і ўнутраную прыгажосць. Ён імкнуўся высветліць маральныя якасці селяніна, узвышаў яго сумленнасць і працавітасць, паказваў, што праўдзівай высакароднасцю надзелены якраз просты народ, які таксама заслугоўвае зямнога шчасця.

Вельмі каштоўнымі з’яўляюцца гісторыка-этнаграфічныя даследаванні У. Сыракомлі “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах” ці “Кароткае даследаванне мовы і характару паэзіі русінаў у Мінскай правінцыі”, а таксама публіцыстычныя артыкулы.

У 1855–1861 гг. У. Сыракомля надрукаваў чатыры артыкулы аб творчасці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Лірнік вясковы паслядоўна абараняе ў іх права беларускага народа на развіццё літаратуры на яго ўласнай мове. Тым самым У. Сыракомля заахвочваў беларускага “ду-

[22] В. А. Каваленка, *Вытокі. Уплывы. Паскоранасць*, с. 121.

[23] У. І. Мархель, *Творчасць Уладзіслава Сыракомлі*, с. 45.

[24] Тамсама, с. 51.

дара" працягваць работу ў гэтым кірунку. *Пекная гэта галіна славянскай мовы – той крывіцкі дыялект*[25] – зазначае ў артыкуле № 1 *Карэспандэнцыя* "Gazety Warszawskiej" У. Сыракомля. Ён усведамляе, што на гэтай мове былі напісаныя Статуты Вялікага княства Літоўскага, што на гэтай мове размаўляла тры чвэрці даўняй Літвы. Вясковы лірнік падкрэслівае ў другім артыкуле "Nebdomadalia", што варта чытаць творы В. Дуніна-Марцінкевіча, бо яны *напісаныя на беларускай мове – на мове нашага простага народа*[26]. У гэтым жа артыкуле ён вядзе палеміку з Ф. Скібіцкім, варшаўскім грамадскім дзеячам, аб зацікаўленні і перспектывах развіцця беларускай літаратурнай мовы. У. Сыракомля выказаў тут свае тры галоўныя думкі наконт беларускай мовы:

1) Калі якая-небудзь мова або гаворка з непісьмовай становіцца пісьмовай, кожная кніжка, што выходзіць на ёй, заслугоўвае занатавання як доказ, што нараджаецца патрэба пісаць на гэтай мове або гаворцы[27].
2) З прагрэсам самога ж народа і развіццём пісьмовай мовы здолее яна (мова) са сваіх каранёў выпрацаваць словы і выразы, якіх сёння няма. Кожная мова праходзіла эпоху дзяцінства.
3) Удасканаленне якой-небудзь мовы не можа быць справай аднаго або некалькіх геніяў, але павінна быць справай усёй грамадскасці. На гэтай ніве працаваць можна і варта[28].

Польскі даследчык Ф. Фарнальчык сцвярджае, што *wyjazdy i kontakty Syrokomli z pisarzami i twórcami białoruskimi miały charakter świadomej działalności, zmierzającej do popierania odrębnej, własnej kultury budzącego się narodu*[29].

Білінгвізм У. Сыракомлі з'яўляецца тыповай з'явай у перыяд фарміравання новай беларускай літаратуры, з'явай, якая была выклікана пэўнымі сацыяльна-гістарычнымі абставінамі. Пісьменнік ведаў, што беларуская мова, якая была ў XVII ст. выцеснена з афіцыйнай арэны латынню і польскай мовай, засталася толькі *ў хатах, крытых саломай ці дранкай, у сваёй спрадвечнай чысціні*[30].

Паэт быў цесна звязаны з вуснапаэтычнай творчасцю свайго народа. Судакраненне твораў У. Сыракомлі з беларускай фальклорнай

[25] Цыт. за: Г. В. Кісялёў, *Пачынальнікі*, Мінск 2003, с. 294.
[26] Тамсама, с. 301.
[27] Цыт. за: Г. В. Кісялёў, *Пачынальнікі*, Мінск 2003, с. 302.
[28] Тамсама, с. 303.
[29] F. Fornalczyk, *Hardy lirnik wioskowy*, с. 322.
[30] Цыт. за: Г. В. Кісялёў, *Пачынальнікі*, Мінск 2003, с. 308.

традыцыяй было вынікам зацікаўленасці паэта духоўным жыццём народа. Ён запазычваў з фальклору матывы і сюжэты, апрацоўваў песні, у сваіх паэмах, гутарках і вершах выкарыстоўваў народныя прыказкі або фразеалагізмы. У яго паэзіі фальклорная стыхія выяўлялася, як відаць, па-рознаму, але заўсёды была скіравана на абуджэнне нацыянальнай свядомасці.

Творчасць паэта (польска- і беларускамоўная) была звернутая сваім зместам да праблем роднага краю, актывізавала таксама літаратурны працэс, які з бегам часу вылучыў знакамітых пісьменнікаў, такіх як В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Я. Лучына і інш.

Як зазначыў сам У. Сыракомля *poezja, literatura powinna być czynnikiem jeśli nie odrodzenia świadomości narodu, to podtrzymywania jego podstawowych zasad moralnych*[31]. Ён пісаў пра Літву (Беларусь), яе вёскі, лясы і палі, пра народ – пра тое, што было ў яго на сэрцы. Бацькаўшчына была для паэта непасрэднай крыніцай натхнення. У поўным сэнсе слова У. Сыракомлю можна назваць песняром Літвы – Беларусі.

STRESZCZENIE

Artykuł poświęcony jest analizie twórczości Władysława Syrokomli, jednego z przedstawicieli literatury białoruskiej XIX wieku, który zapoczątkował nową białoruską tradycję literacką. Zwraca się szczególną uwagę na patriotyzm białoruski „lirnika wioskowego". Spuścizna pisarza została ukazana na tle ówczesnych wydarzeń politycznych, społecznych i kulturowych. U podstaw pracy poety leżały założenia, zmierzające do społecznego i narodowego wyzwolenia narodu białoruskiego, walki o swoją godność. Podkreśla się równouprawnienie narodu białoruskiego wśród innych narodów słowiańskich, jego święte prawo do posługiwania się językiem ojczystym i stworzenia swojej własnej kultury i literatury.

[31] Цыт. за: F. Fornalczyk, *Hardy lirnik wioskowy*, c. 149.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Наталля Дамброўская
Брэст

Праблема нацыянальнага адраджэння і мастацкія прыёмы яе вырашэння ў аповесцях "Лабірынты" Вацлава Ластоўскага і "Падарожжа на Буцафале" Вячаслава Адамчыка

Тэма нацыянальнага адраджэння – адна з вызначальных у беларускай літаратуры на працягу некалькіх (XVIII–XX) стагоддзяў. Яе значнасць асабліва ўзрасла і на сучасным этапе сацыяльна-гістарычнага развіцця, калі вырашаецца лёс краіны.

На пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя на Беларусі ў абставінах грамадска-палітычнага ўздыму, адраджэння культуры, звароту да слаўных гераічных старонак нацыянальнай гісторыі, арганічнага працягу традыцый нашаніўскага перыяду нацыянальная праблема стала прыярытэтнай. Беларуская культура, літаратура адчувалі вострую патрэбу ў вяртанні народу яго нацыянальных архетыпаў. Пільная ўвага мастакоў слова да праблем нацыянальнай, моўна-культурнай, духоўнай ідэнтыфікацыі з'яўляецца адметнасцю беларускай літаратуры і двух апошніх дзесяцігоддзяў XX стагоддзя. Гэтае сутнаснае тыпалагічнае сыходжанне тлумачыцца ў многім блізкімі ўмовамі развіцця, змушанай запаволенасцю вырашэння важных нацыянальных праблем у адзначаныя перыяды.

Сярод пісьменнікаў-адраджэнцаў асаблівае месца займаюць Вацлаў Ластоўскі (1883–1938) і Вячаслаў Адамчык (1933–2001). Нягледзячы на тое, што жыццёвы і творчы лёс гэтых пісьменнікаў аддзелены адзін ад другога часавым адрэзкам больш, чым у паўстагоддзя, іх творчасці ўласцівы агульны, а менавіта адраджэнскі пафас, культ Радзімы, народа. У прыватнасці, асаблівую цікавасць уяўляе тое, як нацыянальная праблема вырашаецца гэтымі пісьменнікамі маста-

цка-эстэтычнымі сродкамі ў аповесцях “Лабірынты” (1923) і “Падарожжа на Буцафале” (1991).

В. Ластоўскі пакінуў свой твор без жанравага вызначэння, што сталася пазней падставаю для разнастайных характарыстык жанравай спецыфікі “Лабірынтаў”. Так, Яўген Лецка, напрыклад, вызначае жанравую разнавіднасць аповесці як фантастычную, Анатоль Сідарэвіч – як прыгодніцка-гістарычную. Уладзімір Конан ададае перавагу прыгодніцкаму элементу. Барыс Сачанка прызнае аповесць за навукова-фантастычную. Эдуард Зайкоўскі адносіць твор да жанравай разнавіднасці апавяданняў-гіпотэзаў (накшталт раманаў-гіпотэзаў Аляксандра Казанцава). Алесь Макарэвіч прапануе ў сваёй манаграфіі наступнае вызначэнне жанравай спецыфікі твора: *Апавядальная гісторыя аповесцевай будовы з навукова-фантастычным зместам*[1]. Лявон Юрэвіч назваў аповесць беларускай містэрыяй XX стагоддзя. У апошніх працах па творчасці В. Ластоўскага “Лабірынты” разглядаюцца як беларуская нацыянальная утопія (Ю. Пацюпа, В. Барысенка). У дадзеным выпадку мы салідарызуемся з сучасным аўтарытэтным даследчыкам Алесем Пашкевічам, які сцвярджае:

> Бачыць у “Лабірынтах” адно фантастычнасць і прыгодніцтва – значыць заблудзіцца на першым “павароце” аповесці. “Лабірынты”– сплаў філасофска-культурных напрацовак...і мастацкай містыфікацыі гісторыка-міфалагічнага кшталту, адна з першых фундаментальных мастацкіх канструкцый нацыянальнай канцэпцыі быцця, духоўная тапаграфія беларускай Крывіі. В. Ластоўскі выражаў у аповесці больш ”рэальнага”, чым “фантастычнага”. Больш правільна, думаецца, пра аповесць “Лабірынты” трэба гаварыць як пра нацыянальную містэрыю,... *практопію* (“урэчаіснену” утопію), створаную на аснове старажытнай беларускай гісторыі[2].

Аповесць В. Адамчыка “Падарожжа на Буцафале” некаторыя даследчыкі называюць фантастычнай (М. Тычына, Н. Кузьміч). Сам аўтар даў свайму твору падзагаловак: *Неверагодна-праўдзівая і фантастычна-рэальная аповесць*. Акадэмік Віктар Каваленка слушна зазначыў: *Гэтае жанравае “растлумачэнне” ў дастатковай меры апраўданае. У неверагоднасці падзей можа быць жыццёвая праўда і ў фантастыцы – рэальнасць сэнсу*[3].

---

[1] Алесь Макарэвіч, *Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст.*, Магілёў 1999, с. 299.

[2] А. А. Пашкевіч, *Канцэпцыя нацыянальнага быцця ў беларускай літаратуры (проза замежжа XX стагоддзя)*, Мінск 2002, с. 57–60.

[3] *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4 тамах*, Мінск 1999, т. 4, кн. 1, с. 546.

Адзначым, што гістарычны жанр як самастойная літаратурная адзінка вызначаецца шэрагам адметнасцей. Вядомая беларуская даследчыца Вольга Шынкарэнка ў манаграфіі, прысвечанай даследаванню праблем паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы, называе найбольш важныя з іх:

> ...зварот да мінулага, праз якое аналізуюцца істотныя супярэчнасці эпохі; раскрыццё заканамернасцей гістарычнага працэсу ў перспектыве грамадскага развіцця; дакументальнасць асновы; сінтэз гістарычнай праўды з элементамі домыслу, абумоўленасць выдумкі натуральным ходам падзей; выяўленне ў творы гістарычнай канцэпцыі аўтара, асвятленне сувязі паміж мінулым і сучасным як гістарычнай пераемнасці[4].

Варта дадаць да гэтага шырокага вызначэння заўвагу А. Пашкевіча: *Тэрмін "гістарычная проза" найперш сведчыць пра зместавасць, "прадмет" твора, ды ўскосна – пра яго ідэйна-мастацкую адметнасць*[5]. Творам жа фантастычнага жанру ўласцівы імклівае развіццё падзей, пераменлівасць і вастрата сюжэтных калізій, таямніцы і загадкі, інтрыга, займальнасць, неверагодныя прыгоды галоўных герояў. Падсумоўваючы вышэй сказанае, можна зрабіць выснову, што разглядаемыя аповесці В. Ластоўскага і В. Адамчыка маюць адзнакі гістарычнага і фантастычнага пачаткаў, а таму і могуць з поўным правам быць аднесены да гісторыка-фантастычнага жанру.

Назва расліны *Sinapis* у гаворках Беласточчыны мае формы: *harč'уса*, *horc'уса*, *hurč'уća* (*hor-*), *horšč'уса* (*har-*). Іх тэрытарыяльнае размежаванне выглядае наступным чынам. Этымалагічнае **о** ў першым націскным складзе на поўначы вымаўляецца як **а** або **о** ў залежнасці ад акання/окання. На поўдзень ад ракі Нараў, за выключэннем ваколіц Белавежскай пушчы, даўняе **о** перайшло ў **у**. Мяккасць суфіксальнага **ц'** супадае з агульнай ізафонай мяккасці/цвёрдасці зычнага **ц**. Спалучэнне **-шч-** (**-šč-**) выступае на тэрыторыі паміж рэкамі Супрасль і Нараў[30].

У беларускіх крыніцах слова *гарчыца* для абазначэння расліны з невялікімі жоўтымі кветкамі і плодам-стручком адзначанае толькі ў *Раслінным свеце* як агульнавядомая яе назва[31]. Тут знаходзім таксама *гарчыцу* як найменне пустазелля з невялікімі жоўтымі кветкамі і плодам-стручком з арэалам размяшчэння ў заходнепалескіх гаворках, у наваколлі Гродна, у Столінскім, Жыткавіцкім, Мсціслаўскім і Касцюковіцкім раёнах[32]. У ЛАБНГ у такім значэнні лексема *гарчы-*

---

[22] *Раслінны свет...*, с. 209.
[23] Тамсама, с. 68.
[24] *Лексічны атлас...*, т. I, с. 100, карта 236.
[25] *Раслінны свет...*, с. 56; *Лексічны атлас...*, т. I, с. 104, карта 249.
[26] *Раслінны свет...*, с. 70.
[27] Тамсама, с. 144.
[28] Тамсама, с. 187.
[29] Гл.: Тамсама, с. 264, 267, 271, 294.
[30] *Atlas gwar wschodniosłowiańskich...*, t. I, s. 138, mapa 9.
[31] *Раслінны свет...*, с. 216.
[32] Тамсама, с. 64.

ца не прыводзіцца. Апрача згаданай семантыкі, слова *гарчыца* (таксама з іншымі словаўтваральнымі фармантамі: *гарчычнік*, *гарчышнік*, *гарчышка*) на тэрыторыі паўночнай Віцебшчыны ўжываецца як назва *драсёну*[33], і спарадычна як найменне *свірэпы*, *палявой капусты* – расліны з голым сцяблом, перыстым лісцем і жоўтымі кветкамі (Маладзечанскі і Воранаўскі раёны)[34] і *цвінтарэю* – расліны з ярка-ружовымі кветкамі ў мяцёлчатых, як шчыток, суквецціях і з прадаўгаватым завостраным лісцем (Мінскі рэгіён)[35].

Л'ïпа (Tilia L.) – ***л'ïпч'ыца*** (Galium aparine L.)

Назва гэтага лісцёвага дрэва з'яўляецца агульнаславянскай, параўн. рус. *липа*, укр. *липа*, польск. *lipa*, палаб. *laipo*, луж. *lipa*, чэш. *lípa*, славац. *lipa*, славен. *lípa*, серб.-харв. *лӣпа*, макед. *липа*, *липата*, балг. *липá*. Узыходзіць да праслав. **lipa*, якое ад і.е. **lēipā* 'ліпа'. Найбольш блізкія адпаведнікі ў балтыйскіх мовах: літоўск. *líepa*, лат. *liẽpa* 'тс'. Гэтае балтаславянскае слова этымалагічна звязана з праслав. **lьpěti*, **lьpnǫti* 'прыклейвацца, ліпнуць, гарнуцца'. Назва дрэва матываваная яго характэрным слізістым, ліпкім сокам або лыкам[36]. Існуюць таксама меркаванні, якія аспрэчваюць сувязь лексемы *ліпа* з праслав. прыметнікам **lipъkъ* 'ліпкі'; гукавое падабенства тут чыста выпадковае[37], а найменне дрэва нематываванае[38]. Аднак такая версія недастаткова абгрунтаваная.

Слова *л'ïпч'ыца* па паходжанні роднаснае дзеяслову *ліпнуць*. Утворанае ад прыметніка *ліпкі* пры дапамозе суфікса *-іца*. Расліна названая паводле паўзучасці сваіх сцяблін, якія, рассцілаючыся, нібы прыліпаюць да зямлі[39]. Названыя ўласцівасці *ліпчыцы* добра перадае яе польскае найменне *przytulia czepna*, параўн. польск. *przytulać się* 'прытульвацца, туліцца' і *czepiać się* 'чапляцца'.

На тэрыторыі Беласточчыны лексема *ліпа* адзначана ў дзвюх формах: *l'ïpa* і *l'y^{e}pa*[40]. На Беларусі найбольш пашыраны і агульнавядомы

---

[33] *Раслінны свет...*, с. 68; *Лексічны атлас...*, т. I, с. 100, карта 236.

[34] *Раслінны свет...*, с. 113; *Лексічны атлас...*, т. I, с. 109, карта 264.

[35] *Раслінны свет...*, с. 125.

[36] W. Boryś, *Słownik etymologiczny...*, s. 288; М. Фасмер, *Этимологический словарь...*, т. 2, с. 499; *Этымалагічны слоўнік беларускай мовы*, т. 5, Мінск 1989, с. 314.

[37] A. Brückner, *Słownik etymologiczny...*, s. 299.

[38] A. Bańkowski, *Etymologiczny słownik...*, t. 2, s. 48.

[39] *Этымалагічны слоўнік...*, т. 5, с. 318.

[40] *Atlas gwar wschodniosłowiańskich...*, t. I, s. 75.

літаратурны варыянт *лíпа*[41]. Сустракаюцца таксама формы са слова-ўтваральным суфіксам *-ін* (*-ын*): *ліпіна*, *лыпына*, з рознай палаталь-насцю зычнага **л**: *ліпа*, *ӏыра*, *лыпа*, з каранёвым **э**: *лепа*, *ӏэпа*, *лэпа*[42]. На дыялектным узроўні слова *ліпа* выкарыстоўваецца і ў зборным зна-чэнні ‘ліпняк, зараснік маладых ліпавых дрэў’[43], у значэннях ‘ліпавы цвет’[44] і ‘ліпавая кара’[45].

Тэрмін *л’іпчʼыца* ў беластоцкіх гаворках ужываецца для абазна-чэння пустазелля, што найчасцей расце ў ільне і лепіцца да рук, польск. *przytulia czepna*. Выступае ў формах: *lipčʼуса* (*-ća*), *lʼopka*, *lʼipka*[46]. На тэрыторыі Беларусі слова адзначаецца як адзінкавая назва *гладуна гладкага* (Herniaria glabra L.) – расліны з кароткім галінастым сцяб-лом і дробнымі жаўтавата-зялёнымі або белымі кветкамі (Драгічынскі раён)[47], і *павітухі* – расліны без каранёў і зялёнага лісця, сцябло якой обвівае іншыя расліны і жывіцца за іх кошт (Кобрынскі раён)[48].

Орʼые͡х (Juglans regia L.) – ***орʼые͡шок*** (Trifolium repens L.) – ***орʼые͡шнʼіца*** (Corylus avellana L.)

Лексема *арэх* (дыял. *орʼые͡х*) выступае ва ўсіх славянскіх мовах, параўн. рус. *орех*, укр. *горіх*, *оріх*, ст.-рус., ст.-ц.-слав. *орѣхъ*, польск. *orzech*, чэш. *ořech*, славац. *orech*, в.-луж. *worjech*, н.-луж. *woŕech*, палаб. *vrech*, славен. *óreh*, балг. *орéх*, серб.-харв. *òрах*, дыял. *орѐh*, *орȉh*, ма-кед. *орев*. Праслав. **oř̆ěchъ* ‘арэх (плод і дрэва)’ магчыма роднаснае даўняму літоўск. *ríešas*, сучас. *ríešutas* ‘арэх’, лат. *riẽksts* ‘тс’, аднак агульнаславянская форма ўзыходзіць да і.е **rāi̯sa-*, балтыйскія – да і.е. **rēi̯sa-*[49]. Далейшыя і.е. сувязі паказваюць на грэч. *árya* ‘арэхі’, алб. *arrë* ‘арэх’, што можа тлумачыць пачатковае праслав. **o-*[50]. Найчас-цей *арэх* імкнуцца тлумачыць як не і.е. вандроўнае слова[51], запазыча-

[41] *Раслінны свет...*, с. 21; *Лексічны атлас...*, т. I, с. 77, карта 160.
[42] *Лексічны атлас...*, т. I, с. 77, карта 160.
[43] *Раслінны свет...*, с. 346.
[44] Тамсама, с. 359.
[45] Тамсама, с. 401.
[46] *Atlas gwar wschodniosłowiańskich...*, t. I, s. 76.
[47] *Раслінны свет...*, с. 64.
[48] Тамсама, с. 99.
[49] W. Boryś, *Słownik etymologiczny...*, s. 396.
[50] М. Фасмер, *Этимологический словарь...*, т. 3, с. 151–152; W. Boryś, *Słownik etymologiczny...*, s. 396.
[51] *Этымалагічны слоўнік...*, т. 1, с. 159–160. Тут таксама змешчаны іншыя версіі.

нае яшчэ ў праіндаеўрапейскую эпоху з каўказскіх моў[52]. Беластоцкая форма *орʼы͡ех* адлюстроўвае рэалізацыю даўняга **ѣ** (яць) у выглядзе дыфтонга **ы͡е**.

Лексічная семантыка гэтага слова ў славянскіх мовах адрозніваецца паміж сабой. У польскай мове яно абазначае назвы *ляснога* (у спалучэнні з прыметнікам *laskowy*) і *грэцкага* (з адʼектывам *włoski*) *арэха*. Толькі ў значэнні ‘грэцкі арэх’ ужываецца ў сербскахарвацкай, македонскай і балгарскай мовах. У астатніх славян яго значэнне ў асноўным супадае з беларускім.

Тэрмін *орʼы͡ешок* у аналізаваным матэрыяле ўжываецца як найменне белай канюшыны. Яго паходжанне звязанае са словам *орʼы͡ех* (бел. *арэх*): гэтая спецыфічная дыялектная назва матываваная падабенствам кветак расліны да пладоў арэшніку[53].

Этымалагічная і словаўтваральная сувязь з *арэхам* наглядаецца таксама ў слове *орʼы͡ешнʼіца*, якое ў даследуемых гаворках выкарыстоўваецца як назва аднаго дрэва арэшніку.

Арэал пашырэння роднасных лексем *орʼы͡ех*, *орʼы͡ешок*, *орʼы͡ешнʼіца* вельмі розны. Тэрмін *орʼы͡ех* ва ўсходнеславянскіх гаворках Беласточчыны ўжываецца ў значэнні пладоў ляшчыны і выступае ў наступных фанетычных варыянтах: *(h)arʼex'i*, *harʼex'i*, *orʼex'i*, *orʼy͡ex'i*, *orʼi͡ex'i*, *orʼixy*, *orʼyxy*[54]. Як найменне расліны *Juglans regia* занатаваны аўтарам толькі ў гаворках паўночнай Гайнаўшчыны. Значэнне ‘дрэва грэцкага арэха’ на тэрыторыі Беларусі не прыводзіцца. *Орʼы͡ешок* як назва белай канюшыны не прыводзіцца ні ў адной вядомай мне лексікаграфічнай крыніцы, выступае толькі на Беласточчыне. Найменне *орʼы͡ешнʼіца* ў беластоцкіх гаворках занатавана аўтарам. У AGWB гэтая лексема адсутнічае. Значэнне ‘дрэва ляснога арэха’ перадаецца там словам *leszczyna* ў дыялектных формах: *lešč*ʼ*yna* (*li-*), *lesc*ʼ*yna* (*li-*), *laščynʼa*. Словы з кораням *ореш-*: *harʼéšn'ik* (*ar-*, *or-*) выступаюць са зборным значэннем арэхавага зарасніка[55]. Назва аднаго дрэва арэшніку ў беларускамоўным матэрыяле абазначаецца словамі: *арэшына*; формай без пачатковага **а-**: *решына*; формамі з пратэтычнымі зычнымі: *варэшына*, *гарэшына*; фанетычнымі варыянтамі, якія адлюстроўваюць цвёрдасць/мяккасць зычнага **р**: *арэшына*, *арешына*; оканне: *орэшына*;

---

[52] W. Boryś, *Słownik etymologiczny…*, s. 396.

[53] Гл. таксама: Б. Сегень, *Назвы кармавых траў у гаворках паўночнай Гайнаўшчыны* (друкуецца).

[54] *Atlas gwar wschodniosłowiańskich…*, t. I, s. 75.

[55] Тамсама.

словамі з іншымі словаўтваральнымі суфіксамі: *арэшчына*, *арэшнік*, *арэшніна*, *арэшня*; а таксама рознымі ўтварэннямі ад слова *ляшчына*[56]. У значэнні ‘арэшына’ спарадычна ў асноўным масіве гаворак сустракаем і лексему *арэх*[57]. Назва дрэва *Corylus avellana* з фармантам *-іца* ў дыялектах на тэрыторыі Беларусі адсутнічае.

Р'ы͡епа (Brassica rapa L.) – ***рып'ак*** (Brassica napus L.) – ***рып'уха*** (Sinapis arvensis L.)

Слова *рэпа* (дыял. *р'ы͡епа*) служыць для намінацыі прапашнай расліны, якая мае спажыўныя карняплоды, звычайна белага або жоўтага колеру. Тэрмін агульнаславянскі, параўн. рус. *репа*, укр. *піпа*, рус.-ц.-слав. *рпъпа*, балг. *ряпа*, серб.-хавр. *рѐпа*, славен. *répa*, чэш. *řepa*, дыял. *řípa*, славац. *repa*, польск. *rzepa*, в.-луж, н.-луж. *rěpa*, палаб. *repó*. Побач са значэннем ‘рэпа’ ў асобных славянскіх мовах выступае з семантыкай ‘бурак’ (чэшская), ‘морква’, ‘бульба’ (сербскахарвацкая). Праслав. **rěpa* блізкае да літоўск. *rópė* ‘рэпа; бульба’, ст.-в.-ням. *ruoba/râba* ‘бурак, рэпа’, ням. *Rübe* ‘тс’, лац. *rāpum/rāpa* ‘рэпа’, грэч. *rhapys* ‘рэпа’. Усе гэтыя словы лічацца запазычанымі з невядомай крыніцы яшчэ ў дагістарычны перыяд[58].

Лексема *рып'ак* – гэта суфіксальнае ўтварэнне ад *рэпа*, параўн. польск. *rzepak*[59]. Слова ўжываецца для абазначэння культурнай расліны *Brassica napus*, што ва ўсходнеславянскіх мовах перадаецца тэрмінам *рапс*.

Ад таго ж самага кораня *рэп-* (*р'ы͡еп-*) пры дапамозе словаўтваральнага фарманта *-уха* утварылася слова *рып'уха* як назва пустазелля з жоўтымі кветкамі, вельмі падобнага на рапс. Знешняе падабенства раслін якраз і паслужыла матывацыяй гэтай намінацыі. Абедзве лексемы (*рып'ак* і *рып'уха*) адлюстроўваюць фанетычную з’яву пераходу ненаціскнога **е** ў **ы**.

Арэал пашырэння гэтых трох найменняў розны. На тэрыторыі Беларусі і ва ўсходнеславянскіх гаворках Беласточчыны агульнавядомым з’яўляецца толькі слова *рэпа*[60]. Тэрмін *рып'ак* аднатаваны мною

---

[56] *Раслінны свет...*, с. 41; *Лексічны атлас...*, т. I, с. 94, карта 217.

[57] *Раслінны свет...*, с. 41.

[58] W. Boryś, *Słownik etymologiczny...*, s. 533; М. Фасмер, *Этимологический словарь...*, т. 3, с. 471.

[59] A. Brückner, *Słownik etymologiczny...*, s. 475.

[60] *Раслінны свет...*, с. 229.

ў даследуемым дыялектным матэрыяле. У AGWB і ЛАБНГ ён не фіксуецца. У *Раслінным свеце* форма *рапак* сустракаецца толькі ў значэнні ‘лопух’ (Ваўкавыскі раён)[61], а адпаведнік польск. *rzepak* – бел. *рапс* выступае выключна як адзінкавая назва аднаго з гатункаў *бручкі* (Любанскі раён)[62]. Слова *рып'уха* адзначана ў AGWB у формах: *rapux'a*, *rap'uxa* (*re-*, *ry-*), *har'up'ica* (*har'upa*) як дыялектнае найменне польск. *ognicha*[63]. У беларускіх гаворках лексема *папýха* ўжываецца толькі ў наваколлі Гродна для абазначэння *здзічэлай рэдзькі*[64].

Падсумоўваючы разважанні аб паходжанні і тэрытарыяльным пашырэнні даследуемых найменняў, неабходна адзначыць наступнае.

1. Час з'яўлення ў мове аналізаваных лексем розны. Запазычанымі ў праславянскую мову трэба лічыць словы: *бук*, *гур'ок*, *ор'ы͡ех*, *р'ы͡епа*. Славянскімі ўтварэннямі праславянскай эпохі з'яўляюцца назвы: *б'укв'іца*, *гурч'ыца*, *л'іпа*. Усходнеславянскі характар маюць тэрміны: *гурч'ак*, *л'іпч'ыца*. *Ор'ы͡ешок*, *ор'ы͡ешн'іца*, *рып'ак*, *рып'уха* сведчаць аб спецыфіцы ўсходнеславянскіх гаворак Беласточчыны.

2. Аналіз паходжання дадзеных фларыстычных лексем паказвае, што аманімія каранёвых марфем наглядаецца толькі ў выпадку генетычна розных слоў: *гур'ок* – *гурч'ак*, *гурч'ыца*. Яна ўзнікла ў выніку страты пачатковага **о-** (*огур'ок* > *гур'ок*) і пераходу этымалагічнага **о** (дыял. націскное **у͡о**) у ненаціскной пазіцыі ў **у** (*г'у͡орк'і* > *гурч'ак*, *гурч'ыца*). Можна таксама заўважыць, што назвы *гурч'ак* і *гурч'ыца* ў адносінах да сябе з'яўляюцца роднаснымі; абедзве матываваныя горкімі ўласцівасцямі раслін.

3. Генетычная роднасць каранёў не выклікае сумненняў у словах: *бук* – *б'укв'іца* (апошняе матываванае першым), *л'іпа* – *л'іпч'ыца* (утвораныя ў розныя часы ад дзеяслова *ліпнуць*: праслав. **lipa* ад *lьpěti*, *lьpnǫti*, *л'іпч'ыца* ад *ліпкі* з *ліпнуць*), *ор'ы͡ех* – *ор'ы͡ешок* – *ор'ы͡ешн'іца* (два апошнія матываваныя першым), *р'ы͡епа* – *рып'ак* – *рып'уха* (два апошнія матываваныя першым).

4. У лінгвагеаграфічным плане беластоцка-беларускім арэалам характарызуюцца лексемы: *гур'ок*, *гурч'ак*, *гурч'ыца*, *л'іпа*, *р'ы͡епа*. Назвы *б'укв'іца*, *л'іпч'ыца*, *ор'ы͡ех* выступаюць таксама на тэрыторыі Беларусі, але часта з іншай лексічнай семантыкай. Выяўленымі толькі ва

[61] Тамсама, с. 90.

[62] Тамсама, с. 211.

[63] *Atlas gwar wschodniosłowiańskich...*, t. I, s. 76.

[64] *Раслінны свет...*, с. 229.

ўсходнеславянскіх гаворках Беласточчыны з'яўляюцца найменні: *бук*, *орʼы͡ешок*, *орʼы͡ешнʼіца*, *рыпʼак*, *рыпʼуха*.

Праведзены аналіз раслінай лексікі з увагі на невялікую колькасць (усяго 13 адзінак) даследуемых найменняў, зразумела, не вырашае канчаткова пастаўленага пытання. Дазваляе ён, аднак, заўважыць, што дыялектная батанічная сістэма Беласточчыны ў значнай ступені выкарыстоўвае праславянскія рэсурсы, а таксама выдзяляецца пэўнай колькасцю ўласных утварэнняў. Агульнаславянскія тэрміны пашыраны на большай тэрыторыі (выключэнне – *бук*), спецыфічна беластоцкія найменні найчасцей маюць вузкі лінгвагеаграфічны арэал. Аднак больш дэталёвыя вынікі патрабуюць даследаванняў, праведзеных на значна шырэйшым моўным матэрыяле.

STRESZCZENIE

W artykule dokonano analizy etymologicznej i lingwogeograficznej nazw roślin zanotowanych w gwarach wschodniosłowiańskich Białostocczyzny. Badaniom poddano tylko wyrazy o formalnie zbieżnych morfemach rdzeniowych w celu wyjaśnienia ich homonimiczności/genetycznego pokrewieństwa. Wyznaczono pochodzenie badanych terminów botanicznych oraz określono ich zasięg terytorialny z uwzględnieniem przede wszystkim obszaru Białorusi. Pokazano podobieństwa i różnice semantyczne analizowanych jednostek leksykalnych.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Вольга Ляшчынская
Гомель

Майстэрства і наватарства Янкі Купалы ў скарыстанні фразеалагічнага багацця беларускай мовы

У апошнія дзесяцігоддзі заўважна павысілася цікавасць да асобаснага аспекту вывучэння мовы, пэўных моўных сродкаў. Пры гэтым *ідзе пастаяннае пашырэнне семантычнага складніка аналізу як асобных моўных адзінак, так і іх спалучэнняў рознага аб'ёму*[1]. Пытанне пра творчае выкарыстанне фразеалагізмаў, хаця і неаднаразова ўздымалася даследчыкамі беларускай і рускай моў[2], тым не менш застаецца адным з найбольш прыцягальных і актуальных, што звязана з вывучэннем індывідуальнага стылю пэўнага мастака, з неабходнасцю сістэматызацыі стылістычных функцый і прыёмаў выкарыстання фразеалагічных адзінак (далей – ФА) у мастацкім маўленні ўвогуле і ўстанаўленні іх значымасці ў актуалізацыі ідыялекту пэўнага пісьменніка.

Мова класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы адносна яго фразеалагічных запасаў, месца і ролі іх у творчасці мастака не бы-

---

[1] Е. В. Красильникова, *Предисловие. Русская языковая личность и задачи ее изучения*, [в:] *Язык и личность*, Москва 1989, с. 3.

[2] Можна ўзгадаць, напрыклад, такія працы, як: М. Р. Каваленка, *Творчая апрацоўка фразеалагізмаў у творах Янкі Брыля*, [у:] *Праблемы беларускай філалогіі*, Мінск 1968; І. Я. Лепешаў, *Фразеалогія ў творах К. Крапівы: Стылістычнае выкарыстанне фразеалагізмаў*, Мінск 1976; Ф. М. Белозерова, *Трансформация фразеологических единиц как аспект фразеологической стилистики*, "Вопросы романо-германского языкознания" 1973, вып. 4; А. В. Кунин, *Двойная актуализация как понятие фразеологической стилистики*, "Иностранный язык в школе" 1974, № 6; А. В. Кунин, *Инверсия как явление фразеологической стилистики*, [в:] *Проблемы лексики и фразеологии*, Ленинград 1975 і інш.

ла аб'ектам спецыяльнага даследавання. Маецца шэраг артыкулаў, адзінкавыя даследаванні, якія прысвечаны вывучэнню альбо асобных тэматычных ці структурна-семантычных груп ФА беларускай мовы, альбо выкарыстання ФА ў творах беларускіх аўтараў пэўнага стылю, жанру, але ў любым выпадку яны характарызуюцца фрагментарнасцю і ўрывачнасцю палажэнняў і выкарыстаннем асобных ФА з мовы мастака ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу[3].

Мэта дадзенага артыкула – аналіз ФА ў мове твораў Янкі Купалы, выяўленне ролі майстра беларускага слова ў скарыстанні, творчай апрацоўцы гэтых унікальных адзінак мовы, у развіцці і станаўленні фразеалагічных норм беларускай літаратурнай мовы. Важна прадставіць той фразеалагічны фонд, які беларускі паэт атрымаў ад сваіх папярэднікаў і сучаснікаў, шляхі і спосабы яго выкарыстання. Асабліва нам важна паказаць Янку Купалу, вядомага як аднаго з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, як паэта, які і ў гэтых адносінах выступае як наватар развіцця беларускай літаратурнай мовы і мастацкага маўлення, і прасачыць працэс развіцця мовы мастака – ад агульнага да індывідуальнага, ад ФА як моўных адзінак да ФА як адзінак мастацкага маўлення.

У творчай спадчыне Янкі Купалы налічваецца каля 3000 ФА (без уліку варыянтаў, аўтарскіх мадыфікацый агульнавядомых фразеалагізмаў), што складае амаль палову паводле колькасці зафіксаваных адзінак у найбольш поўным "Фразеалагічным слоўніку беларускай мовы" І. Я. Лепешава, які лічыцца нарматыўным слоўнікам фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы і ў якім даецца лексікаграфічнае апісанне каля 6000 фразеалагізмаў[4]. Ужо толькі гэта з'яўляецца важкім ўкладам Янкі Купалы ў беларускую фразеалогію: ён фіксуе ФА як здабыткі беларускай мовы, замацоўвае *культурныя традыцыі, назапашваючы ў скарбонцы помнікаў духоўнай культуры*, бо мова паэта *з'яўляецца вяршыняй маўленчай культуры, эталонам для ацэнкі з'яў, усвядомленых у якасці нарматыўных*[5].

---

[3] Напрыклад: М. У. Юнаш, *Саматычныя фразеалагізмы ў мастацкім маўленні: Семантычны і функцыянальна-стылістычны аспекты (На матэрыяле беларускай драматургіі), Аўтарэф. дыс. ... к. філ. н.*, Мінск 2005.

[4] І. Я. Лепешаў, *Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У двух тамах*, Мінск 1993.

[5] Л. И. Скворцов, *Художественная литература и нормы языка*, [в:] *Русский язык: Проблемы художественной речи. Лексикология и лексикография / Виноградовские чтения. IX–X*, Москва 1981, с. 49.

Янка Купала скарыстоўвае ФА ў сваіх паэтычных, драматычных і публіцыстычных творах, і ў кожным выпадку яны з'яўляюцца сродкамі выражэння аўтарскіх адносін да таго, пра што ці каго ён піша, сродкамі ўзмацнення вобразнасці, эматыўнасці, сродкамі аўтарскага ўздзеяння на эмоцыі чытача-слухача сваіх твораў, сродкамі дасягнення максімальнага экспрэсіўнага эфекту пры лаканічнасці выказвання. Паэт ужывае ФА, выкарыстоўваючы розныя спосабы і прыёмы іх увядзення ў кантэкст твораў, без змен і са зменамі, і яны выконваюць шматлікія і разнастайныя стылістычныя функцыі ў мове твораў пісьменніка.

У паэтычных творах, якія вызначаюцца эканомнасцю моўнага выражэння і ўзбагачэннем семантыкі моўных сродкаў, ФА называюць прадметы, з'явы рэчаіснасці, характарызуюць і выражаюць пэўныя адносіны да іх. Напрыклад, у вершы "Гутарка аб кепскім гаспадару" паэт ужывае больш як дзесяць фразеалагізмаў, якія дапамагаюць яму стварыць яркія, трапныя малюнкі, жывы, паўнакроўны вобраз "кепскага гаспадара", у якога *Хата ў яго, хата ...* ***На курынай ножцы; Вераб'ю*** *авёсік Толькі* ***да калень***; расце *Бульба,* ***як арэхі***, а са страў для яды толькі ***Бульба з мундзірамі***, а калі ён едзе, то ***На чым свет*** *скаголіць Кволы панарад*, а *Колы і скрыпяць, Па вандолах скачуць* ***Ні ў дзесяць ні ў пяць; Што ні крок – супоня Рвецца, як аб пень***, бо ***Лад вядзе*** *стары*, а таму *У яго парадак –* ***Адпусці ты грэх:*** *І сабе на гора, І людзям* ***на смех*** (IV, 156–160)[6].

Ужыванне фразеалагізмаў з яркай экспрэсіўна-ацэначнай афарбоўкай у спалучэнні з іншымі лексічнымі сродкамі і з умелай іх сінтаксічнай арганізацыяй дазваляе паэту выразіць і данесці да адрасата яго перажыванні, цяжар неадступных дум, перадаць накал пачуццяў, як, напрыклад, у апошняй страфе верша "Я бачыў":

Я бачыў усё гэта й душою цярпеў,
Застыў смех на губах і песні не пеў,
Заплакаў, заліўся маркотнай слязінкай
Адзін над бярозкай, галубкай, дзяўчынкай (I, 88),

дзе ФА *застыў смех на губах* 'хто-н. не мае жадання смяяцца, весяліцца', безумоўна, больш вобразна, эмацыянальна перадае душэўныя перажыванні лірычнага героя, чым гэта было б выяўлена спалучэн-

[6] Тут і далей у дужках указваюцца том і старонка па выданні: Янка Купала, *Поўны збор твораў у дзевяці тамах*, Мінск 1995–2003.

нем слоў апісальнага характару тыпу *не мог смяяцца*, а градацыйная падача блізказначных дзеяслова *заплакаць* і ФА *заліцца слязінкай* ‘горка, няўцешна заплакаць’ узмацняе змест выказвання, фразеалагізм істотна ўдакладняе і дапаўняе семантыку дзеяслова *заплакаць*, а разам яны найбольш поўна характарызуюць эмацыянальны стан гаворачага. Да таго ж ужыванне ФА дазваляе імітаваць размоўны стыль маўлення ў паэтычным творы, калі адзін чалавек выказвае другому і ўсім сваю скаргу, свае перажыванні, тым самым выключна дакладна ўспрыняць змест і ўздзейнічаць на атрымальніка інфармацыі.

Ужыванне ФА побач з семантычна блізкімі ці эквівалентнымі словамі для стварэння напружання, узмацнення выказвання ў паэта можна лічыць аўтарскай адметнасцю. Пры гэтым фразеалагізм як больш значымая, функцыянальна насычаная адзінка можа размяшчацца пасля слова з мэтай узрастання ступені выказвання, яго градацыі: *Жылі і нядолі не зналі* – ***Свабодна, як рыбкі ў вадзе*** (III, 192), а можа размяшчацца і перад словазлучэннем, дзе кожнае слова мае сваё самастойнае значэнне, у выніку чаго, з аднаго боку, словазлучэнне набліжаецца паводле ўспрымання да ўзроўню ФА, а з другога – ФА ўспрымаецца і як семантычна цэласная адзінка, і як свабоднае спалучэнне слоў. Напрыклад:

Перапалохана кабеціна з дзяцьмі на шлях
Ідзе штодзень пад крыж і пазірае ўдаль;
Прагледзела ўжо **вочы** – ўсё ж надзея тліць ў грудзях.
Праслухала і **вушы** ўжо, а слухае на жаль (IV, 21).

Такім выкарыстаннем паэт дасягае павышанай увагі да ФА і блізкага да яе словазлучэння, яны становяцца своеасаблівым цэнтрам выказвання і сродкам аўтарскага эстэтычнага ўздзеяння.

У асобных выпадках паэт актуалізуе ФА двайным спосабам. Спачатку ён паўтарае фразеалагізм, калі размяшчае яго ў канцы адной страфы і ў пачатку другой, што адразу выдзяляе яго тэкставую семантыку, падкрэслівае нераўназначнасць элементаў тэксту, паколькі паўтор спрыяе збору і перадачы семантычнай інфармацыі. Затым пасля паўторанай ФА паэт падае аднаструктурны з ім сказ, як, напрыклад, у вершы “На старую ноту”:

Не шумі, бор панскі,
Так удзень і ўночы,
Пакуль сонца ўзыдзе,
Раса выесць вочы.

Раса выесць вочы,
Пот цела паране,
Пакуль будзе ў хаце
Долі панаванне.

У выніку такога размяшчэння, калі за ФА *раса вочы выесць* тыпу сказа паводле сваёй структуры ідзе аднаструктурная з ёю частка складанага сказа *пот цела паране*, дзе кожнае слова мае сваё самастойнае лексічнае значэнне, адбываецца "абнаўленне" спосабу моўнага выражэння і выяўляецца эстэтычнае і экспрэсіўнае значэнне, паколькі *ў свядомасці атрымальніка ўзнікае апазіцыя: вядомае (моўнае) і невядомае (маўленчае, аказіянальнае)*[7].

Звяртае на сябе ўвагу і градацыйнае размяшчэнне двух і болей сінанімічных фразеалагізмаў тыпу *Зладзейства – **крый ты** мяне **Божа**, Каб я зрабіў... **ражон мне ў бок!*** (II, 108).

У драматычных творах Янкі Купалы скарыстанне ФА найбольш відавочнае ў якасці сродку індывідуалізацыі мовы персанажаў, сродку стварэння камічнай сітуацыі ці іроніі і скрытага падтэксту, сродку стварэння эфекту, з аднаго боку, і характарыстыкі, выражэння адносін аўтара да дзейных асоб – з другога. Дастаткова толькі параўнаць колькасць і якасць ужытых ФА ў мове, напрыклад, двух персанажаў з камедыі "Паўлінка" – Паўлінкі і Адольфа Быкоўскага.

Мова Паўлінкі вызначаецца багаццем ФА (усяго ў яе мове зафіксавана 77 фразеалагізмаў). Паводле якасці ўжывання ФА мова гераіні характарызуецца трапнасцю выбару ФА, дакладнасцю з іх дапамогай ацэнкі сітуацыі: *Трэба шэршня **за нос павадзіць**, каб і **дзесятаму заказаў*** (VII, 164), *Пагавораць, пагавораць ды перастануць, як **намазоляць языкі*** (VII, 154), ці іншых асоб п'есы, напрыклад, Адольфа Быкоўскага: *Не так, пан Адольф, бярэш шклянкі ... Ну, і зграбны ж! не раўнуючы – **як вол да карэты*** (VII, 174), *Што ж гэта, пан Адольф, надуўся, **як мыш на крупы** або **як апошняе ў печ усыпаўшы**?* (VII, 170). Гераіня вызначаецца дасціпнасцю ў размове, уменнем абыграць словы суразмоўніка: *Усе дома, усе дома. Толькі ў Якіма **не ўсе дома**, бо поначы ходзіць да маладых дзяўчат* (VII, 141). У выніку аналізу толькі ўжытых у мове Паўлінкі ФА, іх ацэнкі з боку ролі, стылістычнай функцыі можна канстатаваць, наколькі па-майстэрску паэт намаляваў вобраз разумнай, вельмі прыемнай, гарэзлівай і дасціпнай беларускай дзяўчыны.

У мове Адольфа Быкоўскага, па-першае, адзначаюцца адзінкавыя ФА (усяго 11), па-другое, у лік іх уваходзяць фразеалагізм-прывітанне, характэрнае для каталікоў, ***пахвалёны ў хату*** (VII, 162), рускі фразеалагізм ***в прыметке*** 'пад увагай (мець, трымаць)' (VII, 167)

[7] Э. И. Ханпир, *Окказиональные элементы в современной речи*, [в:] *Стилистические исследования*, Москва 1972, с. 306.

замест ***мець на прымеце*** ‘ўлічваць, браць на ўвагу’, а таксама няправільна ўжытыя ФА. Напрыклад, у выказванні Быкоўскага *Відаць, дзеўка ўлялюскалася ў мяне* ***па самую шыю*** (VII, 174) выяўляецца няправільнае спалучэнне ФА *па самую шыю* з дзеясловам *ўлялюскацца* замест спалучэння гэтай адзінкі са словамі *заняты, загружаны* (работай, справамі) ці *сядзець, быць* (у вадзе, балоце і інш.). Альбо ўжыванне ФА *на ўсе лады* ў адказе Быкоўскага Паўлінцы, якая скардзіцца: *гэтых мудрых танцаў не толькі што не ўмею, але ніколі нават іх і не бачыла*, чуем: *Не бойцеся! Я* ***на ўсе лады*** *выўчу паненку скакаць* (VII, 165), дзе ФА *на ўсе лады* выяўляе толькі блізкае для яе значэнне – ‘усебакова, вельмі добра’, але нехарактэрнае спалучэнне з дзеясловам *вывучыць* замест 1) *гаварыць, тлумачыць* ‘вельмі падрабязна, грунтоўна’, 2) *спяваць* ‘па-рознаму’ ці 3) *хваліць* ‘вельмі моцна’. Усё разам і пры гэтым толькі выкарыстанне ФА дазволіла пісьменніку адлюстраваць беднасць мовы Адольфа Быкоўскага, мізэрнасць яго фігуры, выразіць сваю насмешлівасць і негатыўныя адносіны да яго, супрацьпаставіць Быкоўскага астатнім дзейным асобам камедыі і тым самым паўплываць на ўспрыманне яго адрасатам твора.

ФА ў мове дзейных асоб драматычных твораў Янкі Купалы выяўляюць нацыянальную адметнасць, сацыяльны статус, узровень развіцця, маўленчы этыкет і культуру паводзін. І заўсёды гэта характарыстыка кемлівасці, знаходлівасці беларуса, адзнака яго багатай і вобразнай мовы.

У публіцыстыцы ФА выконваюць тэкстаўтваральную ролю, функцыю апасродкаванага дыялогу з чытачом, калі аўтар з дапамогай іх актуалізуе сэнс, стварае ілюзію суразмоўніцтва, выяўляе логіку і сілу пераканання, больш ярка, выразна і дакладна выказвае аўтарскія адносіны да прадмета размовы, уздзейнічае на чытача, прымушае яго задумацца, згадзіцца з ацэнкай аўтара ці прыводзіць яго да пэўных высноў адносна апісанай аўтарам з’явы, падзеі і пад. Напрыклад, у артыкуле “З гуты “Залессе” пісьменнік, аналізуючы ўмовы працы гутнікаў і адміністрацыі гуты, цікава ўводзіць фразеалагізм *глядзець праз пальцы* ‘абыякава ставіцца, свядома не заўважаць што-н., знарок не звяртаць увагу на што-н. (часцей адмоўнае)’: *Фабрычная інспекцыя* ***глядзіць на ўсё праз пальцы*** *або і саўсім не глядзіць* (VIII, 24), дзе назіраецца сутыкненне як аднародных членаў сказа фразеалагізма *глядзець праз пальцы* з паўторам дзеяслоўнага яго кампанента з адмоўнай часціцай – *не глядзіць*, у выніку чаго па-новаму ўспрымаецца ФА (як семантычна цэласная адзінка з замацаваным за ёй значэннем і адначасова як спалучэнне семантыкі самастойных слоў) і па-новаму выказана

думка, што вядзе да вобразных асацыяцый, узмацняе экспрэсіўнасць выказвання.

Найбольшую цікавасць і ўвагу прыцягваюць вынікі фразетворчай дзейнасці Янкі Купалы, калі мастак, уводзячы ў кантэкст твора агульнавядомыя ФА, змяняе, пераўтварае, абнаўляе іх форму, структуру, семантыку ці структуру і семантыку адначасова з мэтай выканання імі разнастайных і шматлікіх функцый аказіянальнага характару, тым самым выяўляючы індывідуальна-аўтарскае скарыстанне ФА, пераводзячы іх з разраду адзінак мовы ў разрад адзінак мастакага маўлення. Менавіта гэта праца Янкі Купалы заслугоўвае найвышэйшай ацэнкі і прызнання як наватарскай, што ў каторы яшчэ раз вызначае яго геніяльнасць, боскую адоранасць.

Янка Купала прыйшоў у свет з вялікай місіяй Асветніка, Творцы, Прарока, прыйшоў у той час, калі найбольш востра стаяла праблема фарміравання нацыянальнай свядомасці. Ён быў у цэнтры беларускай паэзіі, у цэнтры барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за беларускае друкаванае слова. Паэт адстойваў права народа на родную мову, на свабоднае жыццё. Менавіта таму найпершая роля Янкі Купалы, яго творчасці, галоўным рэчышчам якой *стала арыентацыя на фальклор і народную жывую мову*[8], у афармленні і развіцці беларускай літаратурнай мовы. І ў гэтым працэсе належнае месца адводзіцца паэтам фразеалагізмам, якія ён уводзіць у літаратурны ўжытак і паказвае ўзоры іх скарыстання, выяўляючы наватарскі падыход да асэнсавання фразеалагічных багацця ў народа, іх актуалізацыю ў індывідуальным паэтычным стылі.

Варта заўважыць, што выкарыстанню менавіта ФА са зменамі рознага тыпу і назначэння ў творчасці пісьменніка спрыяе яго інтуіцыя, тонкае адчуванне мовы, яго талент, даведзены да вяршынь геніяльнасці. Бо паэт жыў і тварыў у першай палове XX ст., у той час, калі беларуская мова, хоць паскорана, інтэнсіўна, але толькі фарміравалася, складваліся яе нормы. Гэта адбывалася дзякуючы нястомнай працы многіх мастакоў беларускага слова, сярод якіх пачэснае месца займае Янка Купала. І менавіта творчасць паэта, яго праца над мовай сваіх твораў увогуле і па скарыстанні ФА ў прыватнасці спрыяла выпрацоўцы літаратурныз нормаў, у тым ліку і фразеалагічных нормаў, а таксама і фразеалогіі, фразеаграфіі як будучых галін навукі аб мове, паколькі фразеалогія як навука, паводле заўвагі І. Я. Лепеша-

[8] І. Э. Багдановіч, *Янка Купала і рамантызм*, Мінск 1989, с. 13.

ва, *яшчэ ў 60-я гады* [XX ст. – В.Л.] *...знаходзіцца ў стадыі скрытага развіцця*[9].

Усё сказанае азначае, што Янка Купала задоўга да тэарэтычных распрацовак і высноў даследчыкаў фразеалогіі прадвызначыў і практычна іх рэалізаваў, даўшы свету, сваім суайчыннікам і паслядоўнікам узоры скарыстання фразеалагізмаў, на якія багаты беларускі народ, праілюстраваў усе магчымыя на сённяшні дзень прыёмы і спосабы ўвядзення ФА, скарыстання іх невычэрпнага стылістычнага патэнцыялу.

Гэта сёння ў лінгвістычнай літаратуры, прысвечанай пытанням творчага выкарыстання фразеалагізмаў у маўленчай дзейнасці, кантэкстуальныя змены ФА ў мастацкім ці публіцыстычным творы прызнаюцца як бясспрэчны факт, як больш складаны і "артыстычны" спосаб транспазіцыі народных фразеалагізмаў у літаратурную мову[10]. Гэта ў наш час вызначаны прыёмы мадыфікацыі ФА, устаноўлены іх разнастайныя стылістычныя функцыі. Больш таго, выяўлена, што такому выкарыстанню фразеалагізма спрыяе *сама яе складаная прырода, супярэчлівасць і неадпаведнасць паміж формай, якая часцей за ўсё нічым не адрозніваецца ад звычайнага, свабодна арганізаванага словазлучэння, і цэласным зместам, функцыянальна блізкім да слова*[11]. А гэта, варта адзначыць, задоўга убачыў, адчуў слынны мастак беларускага прыгожага пісьменства, у чым можна пераканацца на шматлікіх прыкладах з яго твораў.

Так, у вершы "Памяці С. Палуяна", які Купала напісаў з прычыны заўчаснай смерці беларускага паэта Сяргея Палуяна, у апошняй страфе адразу пазнаецца фразеалагізм *няхай зямля будзе пухам*, які ўжываецца як выказванне, пажаданне каму-небудзь памерламу ў час яго пахавання ці пры ўпамінанні аб ім у размове, хаця фразеалагізм гэты і падаецца ў аўтарскай апрацоўцы, відазмяняецца на *няхай зямелька будзе лёгкай*:

Спі, дружа мой, сявец у родных слоў сяўбе
Па нашай дрэмлючай старонцы!
Няхай зямелька будзе лёгкай для цябе,
Як лёгка рваўся ты да сонца (II, 131).

[9] І. Я. Лепешаў, *Фразеалогія сучаснай беларускай мовы*, Мінск 1998, с. 4.

[10] Б. А. Ларин, *История русского языка и общее языкознание*, Москва 1977, с. 158.

[11] І. Я. Лепешаў, *Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы*, Мінск 1984, с. 118.

Дзякуючы зменам у складзе ФА – словаўтваральнай (замест *зямля – зямелька*), лексічнай (замест *пухам – лёгкай*), выяўляюцца шчырыя, цёплыя адносіны аўтара да С. Палуяна, актуалізуецца ФА, індывідуалізуецца маўленне, яму надаецца мастацкая выразнасць.

Адной з самых пашыраных змен ФА ў творчасці Янкі Купалы з'яўляецца замена аднаго ці некалькіх кампанентаў (адзначаецца 135 такіх ФА, ужытых паэтам, як правіла, у паэтычных і драматычных творах). Напрыклад, у вершы "З нуды" лірычны герой, любуючыся прыгажосцю дзяўчат, адзначаючы іх дзявочыя чары, выказвае сваё ўражанне і, відавочна, з прычыны свайго горкага вопыту робіць наступную выснову:

Ой, дзяўчаткі! Хоць вы гладкі,
Быццам маляваны, –
Не хацеў бы я папасці
Ў вашыя кайданы (II, 156),

дзе агульнавядомая ФА *папасці ў рукі* падаецца са зменай субстантыўнага кампанента – *папасці ў кайданы*, што ўзмацняе цытаваную перасцярогу, вывад аўтара ці лірычнага героя, паколькі пачуццё кахання, перажытае ім, асацыіруецца з непажаданай для яго ўладай, якая пазбаўляе волі, бо *мае сваю вяліку сілу*, да таго ж з каханнем *Хворбы да работы Не прыдбаці*, а таму, трапіўшы ў сеці кахання да дзяўчат, *ужо гінеш*, бо *Любіш вас без меры*.

Дастаткова часта назіраецца замена дзеяслоўнага кампанента ФА, пры гэтым адзначаецца замена стылістычна нейтральнага дзеяслова стылістычна маркіраваным, калі разглядаць іх як самастойныя словы. Напрыклад, у вершы "З дня ў дзень..." адзначаем ФА *матаць паклон* замест *біць паклон*:

Ці быў прыгон, ці ёсць прыгон, –
Шануй закон – матай паклон,
Бо вылеціш і з роднай хаткі (IV, 48),

што вядзе да ўзмацнення стылістычнага эфекту, больш вобразнага і дакладнага выказвання ў адпаведнасці з кантэкстам твора.

Такога тыпу замены асабліва характэрны пры ўжыванні ФА ў мове дзейных асоб драматычных твораў, параўнаем, напрыклад, агульнаўжывальныя фразеалагізмы і на іх аснове індывідуальна-аўтарскія аказіянальныя ФА: *вырваць з сэрца* – [Сымон:] *Уночы, апоўначы панясу, але не ўдзень, бо ўдзень яшчэ і крыж мне выдзеруць, як* ***выдзерлі***

з сэрца і душы *ўсё добрае і светлае* (Раскіданае гняздо, VII, 236); *схадзіць па розум да галавы* – [Максім:] *Але як тут* ***споўзаць па розум да галавы*** *і навясці спраўку, куды мяне ліхаманка з сваёй хаты перавалакла?* (Прымакі, VII, 182) і інш. Нярэдка яны адзначаюцца і ў паэтычных творах, напрыклад: *раса вочы выядае – Дык і нам цапы і косы Час браць з вышак, покі* ***росы Воч*** *не* ***згрызлі*** *ў нас* (Час! IV, 33) і інш.

У адзінкавых выпадках адбываецца адваротная замена дзеяслоўнага кампанента на больш "лагодны", што звязана зноў жа з пошукамі больш дакладнага выражэння і ўздзеяння і з улікам захавання гарманічнасці кантэкстуальнага акружэння. Напрыклад, у паэме "Яна і я" пасля сустрэчы двух *Нявіданыя дзівы .. Шапталі мне: вазьмі яе, шчаслівы! Шапталі ёй: сабе яго вазьмі! І рукі злучывалі нам навекі, Багаслаўленне далі нам сваё* (VI, 106), дзе ФА *рукі вязаць* 'заручаць, браць шлюб' у адпаведнасці з больш узнёслым, эмацыянальным выкладам мяняе на *рукі злучываць*.

Адзначаецца даволі часта і ўскладненне ФА словам свабоднага ўжывання, якое можа далучацца да ўсяго комплексу фразеалагічнага выразу, як, напрыклад, ужыванне ФА *не сёння дык (то) заўтра* 'вельмі хутка, у бліжэйшы час (будзе што-н.)[12] у мове Марылі з драмы "Раскіданае гняздо": *Але* ***не сягоння, то заўтра, пазаўтра*** *будзем імі* [жабракамі] (VII, 233), у выніку чаго назіраецца і змена значэння ФА: 'калі-небудзь, але абавязкова'; ці асобнага кампанента ФА, як, напрыклад, у мове Ганулі з п'есы "Тутэйшыя": *...ідзі асцярожна, каб цябе ў палон не схапілі або сам* ***у*** *якую* ***нячыстую гісторыю*** *не* ***ўпутаўся*** (VII, 323), дзе дадатковы ад'ектыўны кампанент агаляе ўнутраную форму ФА і ўдакладняе яе значэнне, указваючы на дакладную ацэнку *гісторыі – нячыстую гісторыю*.

Ускладненне ФА ў мове Янкі Купалы назіраецца за кошт спалучэння некалькіх у адну, як, напрыклад, *біцца як рыба аб лёд* 'без выніку і плёну намагацца, стараццa, шукаючы выйсце з бядоты' і *як нямая рыба* 'моўчкі, нічога не кажучы' ў Купалы аб'яднаны ў *нямой рыбай аб лёд біцца* 'моўчкі, нічога не гаворачы, дарэмна, без выніку намагацца, стараццa шукаць выхад з бяды':

[12] Значэнне агульнаўжывальных фразеалагізмаў падаецца паводле "Фразеалагічнага слоўніка беларускай мовы" І. Я. Лепешава.

Нямой рыбай аб лёд біся
Век-вяком
І ў магілу паваліся
Бедаком (III, 145).

Характэрна для мовы твораў Янкі Купалы і фразеалагічная зеўгма як стылістычны прыём рэалізацыі двух значэнняў фразеалагізмаў, калі на аснове агульнага кампанента дзвюх ФА яны аб'ядноўваюцца ў адну. Напрыклад, у беларускай фразеалогіі зафіксаваны дзве ФА: 1) *ліць пот* 'працаваць да знямогі' і 2) ліць кроў 'гінуць, паміраць; забіваць, знішчаць каго-н.'. У паэтычных творах з мэтай эканоміі моўных сродкаў, перадачы найбольшай інфармацыі, аказання найбольшага ўздзеяння на пачуцці адрасата твора, з мэтай выклікаць пэўныя асацыяцыі Янка Купала аб'ядноўвае іх у адну:

Ты сотні год **Ліў кроў і пот**,
Каб сыты быў варшаўскі зброд (V, 159);

Я не плачу, што ніва не родзе, –
Пот і кроў я прывык **ліць** напрасна (II, 101).

Адзначаецца ў мове тэкстаў Янкі Купалы і прыём рэдукцыі ва ўжыванні ФА, калі аб'ём кампанентнага складу пэўнай ФА скарачаецца, але тым не менш яна пазнаецца, больш таго яна канцэнтруе на сабе ўвагу, нярэдка падкрэслівае дынамізм, хуткасць перадачы дзеяння, перадае эмацыянальна-псіхалагічны стан лірычнага героя ці дзейнай асобы. Напрыклад, у паэме "Магіла льва" паэт так перадае свае адносіны да баярына, які ўпадабаў простую вясковую дзяўчыну:

Пачаў к дзяўчыне падсядаць,
Пускаць туман і, як бы дзівы,
Ёй брэдні ўсякія складаць (V, 97),

дзе адразу ж пазнаецца ФА *пускаць туман (пыл, дым) у вочы* 'выхваляючыся, падманваць каго-н., ствараць падманлівае ўражанне пра сябе'.

Можна доўжыць пералік прыёмаў і функцый скарыстання паэтам ФА, але, думаецца, нават прыведзенага дастаткова, каб уявіць той аб'ём працы мастака і тое значэнне, якое адыграла яго творчасць для развіцця і станаўлення фразеалогіі, фразеалагічнай нормы, для працягу лініі развіцця прыгожага беларускага пісьменства, для асэнсавання моўных адзінак і пераводу іх у адзінкі мастацкага маўлення, у адзінкі апазнання індывідуальнага стылю.

Такім чынам, у творах беларускага майстра слова, які жыў і працаваў у першай палове XX стагоддзя, выяўляецца наватарскае для гэтага часу выкарыстанне фразеалагізмаў у беларускай мастацкай літаратуры, калі фразеалагізмы, выступаючы з замацаванай за імі семантыкай, структурай і формай існавання, пераўтвараюцца ў мэтах выражэння аўтарскіх патэнцый, вырашэння аўтарскіх задач. Выяўляецца цэлы шэраг індывідуальна-аўтарскіх прыёмаў рознага тыпу пераўтварэнняў фразеалагічных адзінак (замена кампанента, нарашчэнне кампанента (-аў), абыгрыванне аднаго з кампанентаў фразеалагізма, пераасэнсаванне фразеалагізма, агаленне ўнутранай формы фразеалагізма, пашырэнне метафарычнага кантэксту на вобразнай аснове фразеалагізма, спалучэнне са словамі, словазлучэннямі, сказамі, параўнальнымі зваротамі і інш.), якія выконваюць шматлікія і разнастайныя стылістычныя функцыі узуальнага і аказіянальнага характару. Такое скарыстанне фразеалагізмаў дэманструе найперш майстэрства пісьменніка ў выкарыстанні функцыянальных магчымасцей фразеалогіі беларускай мовы, выяўляе яго светаадчуванне, здольнасць чэрпаць з фразеалогіі новыя вобразы і адкрываць новыя стылістычныя эфекты; па-другое, гэта ілюстрацыя, пацвярджэнне тонкага адчування паэтам беларускай мовы ўвогуле і прыроды гэтых унікальных адзінак мовы ў прыватнасці – іх *дынамізму, гатоўнасці да пастаяннага абнаўлення*[13]. А ўсё разам выяўляе наватарства Мастака беларускага слова, прадвызначанасць яго асобы і абранне Богам для пашырэння славы беларусаў, развіцця, станаўлення і ўслаўлення беларускай мовы.

SUMMARY

In the article for the first time in the Byelorussian linguistics the role and significance of Yanka Kupala's creativity in development of the Byelorussian stylistic phraseology are determined, poet's skill and innovation in use of phraseological units in fiction and his predetermination of phraseological norms are revealed.

[13] В. М. Мокиенко, *Славянская фразеология*, Москва 1989, с. 48.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Krzysztof Rutkowski
Białystok

O pewnym sposobie definiowania leksyki konfesyjnej w „Словаре современного русского литературного языка" (1950–1965)

W „wielkiej" leksykografii radzieckiej słownictwo związane ze sferą religii było deprecjonowane i piętnowane na różne sposoby. Dokonywano tego między innymi poprzez stosowanie odpowiednich kwalifikatorów chronologicznych i ekspresywnych (np. *устар.*, *церк.*[1]), manipulację ortografią (np. *бог*, *спаситель*) oraz interpunkcją (np. «*конец мира*», «*святость*») czy nieuwzględnianie znaczeń konfesyjnych w przypadku jednostek polisemicznych (np. *книжник* – любитель книг; brak: uczony w Piśmie). Powszechną praktyką było również definiowanie tego typu słownictwa z wykorzystaniem rozmaitych ekspresywizmów.

Niniejszy artykuł porusza jeden z aspektów omawianego zagadnienia. Dotyczy zastosowania w słownikowym opisie leksyki konfesyjnej negatywnie nacechowanych środków leksykalnych *буржуазный*, *враждебный*, *идеалистический*, *реакционный*, *суеверный*, *фанатик*, *шовинистический*.

Bazę do badań stanowi materiał leksykalny wyekscerpowany ze „Словаря современного русского литературного языка" (AN ZSRR, t. 1–17, Moskwa 1950–1965; dalej: BAS). Zostanie on przeanalizowany metodą porównawczą – w zestawieniu z analogicznymi jednostkami słownikowymi pochodzącymi z „Толкового словаря живого великорусского языка" (W. I. Dal,

[1] O ekspresywnej funkcji kwalifikatora *церк.* w radzieckich słownikach opisowych języka rosyjskiego wspomina m.in. G. N. Sklariewskaja, *Лексика русского православия в процессе языкового возрождения начала XXI века: ее место в лексической системе и в культуре страны*, [в:] *Русистика и современность: Лингвокультурология и межкультурная коммуникация*, Санкт Петербург 2002, с. 26.

t. 1–4, reprint drugiego wydania 1880–1882, Moskwa 1978–1980; dalej: DAL). Za uzupełniające źródło ekscerpcji przyjmuje się „Словарь церковно-славянского и русского языка" (t. 1–4, reprint wydania 1867–1868, Leipzig 1972; dalej: SCR).

Obecność wyżej wymienionych środków opisowych zaobserwowano w definicjach następujących jednostek leksykalnych:

DAL//SCR	**BAS**
анахоретъ – пустынножитель, пустынникъ, отшельникъ, скитникъ (DAL, I, 16)	*анахорет* – 1. истор. религиозный фанатик, ведший уединенный аскетический образ жизни, отшельник (I, 135)
—	*богоискательство* – 1. истор. реакционное течение среди русской интеллигенции начала XX века, искавшее примирения социальных противоречий в создании новой религии, которая должна была отвлечь трудящихся от классовой борьбы и от революции (I, 527–8)
всевышний – относящійся до Бога; сщ. Богъ (DAL, I, 263)	*всевышний* – 1. в идеалистическом понимании – стоящий над всем существующим (церк. – эпитет бога) (II, 820)
—	*клерикализм* – 1. реакционное течение при феодализме и капитализме, стремящееся к усилению влияния церкви или к господству ее в политической и культурной жизни (V, 1018)
ладанка – сумочка с ладаномъ или какою либо святынею, носимая вмѣстѣ съ крестомъ на шеѣ (DAL, II, 232)	*ладанка* – небольшой мешочек с ладаном или каким-то талисманом, носимый на груди, по суеверному представлению, для предохранения от зла (VI, 23)
—	*мессианизм, мессианство* – 2. реакционное шовинистическое учение об особой роли данного народа в судьбах человечества (VI, 879)

DAL//SCR	BAS
небо – то выспреннее пространство, гдѢ, по нашимъ понятіямъ, пребываютъ вообще души умершихъ, тотъ свѢтъ, духовный міръ; также въ особенности, гдѢ души праведныхъ, окружаютъ Господа и ангельскія сонмища Его; рай, небесное царство, противоп. адъ (DAL, II, 502)	*небо* – 2. в религиозном суеверии – пространство, где обитают бог или боги, ангелы и святые, где находится рай и т.п. (VII, 138)
пантеизмъ – всебожіе; обожанье природы, боготворенье всего созданнаго, вмѢсто Создателя (DAL, III, 15)	*пантеизм* – 1. философское идеалистическое учение, отождествляющее бога с природой (IX, 121)
—	*персонализм* – 1. реакционное идеалистическое течение в современной буржуазной философии, рассматриваемое личность первоосновой бытия (IX, 1054)
столпникъ – церк. названіе христіанскаго подвижника, который для удрученія плоти и для отлученія отъ міра, пребывалъ на столпѢ (SCR, II, 478)	*столпник* – 1. религиозный фанатик, отшельник, молившийся, стоя на небольшом столпе или затворяясь в тесной келье (XIV, 934)
—	*теизм* – 1. враждебное науке религиозное учение, утверждающее, что мир создан и управляется богом, всемогущей личностью, обладающей разумом и волей (XV, 191)
чертъ – олицетворенье зла, врагъ рода человѢческаго; нечистый, некошный, черная сила, сатана, діаволъ, лукавый, луканька, шайтанъ, шутъ, шиликунъ, шишъ, шишига, отяпа, хохликъ, бѢсъ (DAL, IV, 597)	*черт* – 1. в суеверных представлениях – злой дух, обычно в образе человека, но с рогами, копытами и хвостом (XVII, 940–9)
чудо – всякое явленье, кое мы не умѢемъ объяснить по извѢстнымъ намъ законамъ природы. *Богу всѣ чудеса доступны* (DAL, IV, 612).	*чудо* – 1. по суеверным представлениям – сверхъестественное явление, вызванное волшебством (XVII, 1170–3)

Odnotowane w definicjach jednostek *анахорет*, *всевышний*, *ладанка*, *небо*, *пантеизм*, *столпник*, *черт* oraz *чудо* określenia *буржуазный*, *враждебный*, *идеалистический* i inne są niewątpliwie elementami nowymi. Powyższe zestawienie jasno dowodzi, że jeszcze w przedrewolucyjnym języku rosyjskim nie wchodziły one w ich zakres znaczeniowy.

Pozostałe wyrazy (por. *богоискательство*, *клерикализм*, *мессианизм*, *персонализм*, *теизм*) rozpowszechniły się w języku rosyjskim najprawdopodobniej dopiero na przełomie XIX i XX wieku, dlatego też nie mogły być zarejestrowane ani przez DAL, ani przez SCR. Warto je jednak włączyć do materiału egzemplifikacyjnego, ponieważ w BAS zostały zdefiniowane w identyczny sposób, jak jednostki *анахорет*, *всевышний* itd.

2. Найменні, матэрыяльна тоесныя па аснове, але нятоесныя па суфіксе: ***awantur****nik* – ***авантур****ыст*, ***bab****iaż* – ***баб****нік*, ***bied****actwo* – ***бед****ак* (*небарака*, *гаротнік*), ***bluźnier****ca* – ***блюзнер***, ***chrześ****niak* – ***хрэс****нік*, ***chytr****us* – ***хітр****ун*, ***cieśl****a* – ***цясл****яр*, ***debosz*** – ***дэбаш****ыр*, ***desant****owiec* – ***дэсант****нік*, ***dzwon****nik* – ***зван****ар*, ***dżud****owiec* – ***дзюда****іст*, ***faryz****eusz* – ***фарыс****ей*, ***gór****nik* – ***гар****няк*, ***grabież****ca* – ***грабеж****нік* (*рабаўнік*), ***hurt****ownik* – ***гурт****авік*, ***ślep****iec* – ***сляп****ы*, ***śmiesz****ek* – ***насмеш****нік* (*жартаўнік*, *спёха*), ***sabotaż****ysta* – ***сабатаж****нік*, ***Tybet****ańczyk* – ***тыбе-цец***, ***win****owajca* – ***віноў****нік*, ***wojsk****owy* – ***вайск****овец* (*ваеннаслужачы*), ***zdraj****ca* – ***здрад****нік*, ***znajd****a* – ***знайд****ыш*, ***karc****iarz* – ***карц****ёжнік*, ***taks****ówkarz* – ***такс****іст*, ***intelektual****ista* – ***інтэлектуал***, ***śmiał****ek* – ***смяль****чак*, ***siew****ca* – ***сяв****ец* (*сейбіт*), ***skrzyp****ek* – ***скрып****ач*, ***siodl****arz* – ***сёдзель****нік* (*рымар*), ***smark*** – ***смарк****ач* (*сапля*), ***tanc****erz* – ***танц****ор*, ***kadr****owiec* – ***кадр****авік*, ***kafl****arz* – ***кафель****шчык*, ***konferansj****er* – ***канферансье***, ***wąs****al* – ***вус****ач*, ***wegetar****ianin* – ***вегетар****ыянец*, ***wędr****owiec* – ***вандр****оўнік* (*падарожнік*), ***wieszcz*** – ***вяшч****ун* (*прарок*), ***woźn****ica* – ***воз****чык*, ***wróż****biarz* – ***варажб****іт*, ***wybor****ca* – ***выбар****шчык* (*выбарнік*), *wy****chow****anek* – *вы****хав****анец*, *wy****chow****awca* – *вы****хав****ацель*, *wy****daw****ca* – *вы****дав****ец*, *wy****gna****niec* – *вы****гна****ннік*, *wy****kład****owca* – *вы****клад****чык*, *za****klin****acz* – *за****клін****альнік*.

[3] J. Nosowicz, *Rzeczowniki osobowe, strukturalne, tożsame w języku rosyjskim i polskim*, [w:] *Rozprawy Uniwersytetu Warszawskiego*, Warszawa 1988, s. 57–59.

Табліца 1. Суадносіны дэрыватаў пры спалучэнні іх з матэрыяльна тоеснымі асновамі ў польскай і беларускай мовах

польскія суфіксы	беларускія эквіваленты																										
	-ец	-іст/-ыст	-анец	-нік	-тар	-ят/-ат	-ёр	-янін/-анін	∅	-яр/-ар	-еец	-ак/-як	-ун	-ын	-ік/-ык	-ыр/-ір	-ач/-яч	-чык	-шчык	-іцель	-ер/-нер	-вец	-энт/-я-ант	-ном	-лог	-іч	-ац
-czyk	+							+	+																		
-ista/-ysta		+		+		+					+					+					+						
-ent/-ant				+						+													+				
-anin			+					+																			
-tor		+			+					+																	
-ata						+																	+				
-or							+			+																	
-∅	+	+						+	+					+									+				+
-ysz	+						+		+			+															
-arz	+	+		+						+								+	+								
-ak/-ek	+											+							+								
-nik		+		+						+							+		+								
-ca	+			+					+									+				+	+				+
-in	+								+																		
-acz													+				+										
-er							+			+						+			+								
-yk/-ik	+	+							+			+			+												
-owiec		+		+											–		+										
-es	+																										
-nom																								+			
-niak				+																							
-us													+														
-iciel				+											+			+	+	+							
-icz																										+	
-on													+														
-ek		+							+			+															
-owicz		+																									
-log		+																							+		

У гэтай групе выдзяляюцца пары суфіксаў з найбольшай прадуктыўнасцю пры ўтварэнні аднаслоўных дэрыватаў: *-ca/-нік*, *-ац*, *-вец*, *-ант*, *-чык*; *-yk(-ik)/-ік*, *-ык*, *-як*, *-ыст*; *-nik(-ownik)/-ар*, *-шчык*, *-ач*; *-asz/-ей*, *-нік*, *-ый*, *-∅*; *-arz/-ар*, *-шчык*, *-нік*, *-ец*, *-∅(a)*, *-ер*, *-іст*, *-юг(а)*; *-anin/-ян*, *-анец*; *-at(a)/-ат*, *-яр*; *-ant(-ent)/-нік*; *-ist(a)/-ыст*, *-еец*, *-нік*, *-іст*, *-нер*, *-ал*, *-ер*, *-ят*; *-iciel/-шчык*, *-цель*, *-чык*, *-нік*, *-вец*; *-tor/-тар*, *-ыст*; *-owiec/-нік*, *-іст*, *-вік*. Вялікую актыўнасць праяўляюць таксама іншамоўныя (лацінскія) па паходжанню фарманты *-at*, *-ans*, *-ist(a)*: *jubilat* – *юбіляр*, *ordynans* – *ордэнаносец*, *czerwonogwardzista* – *чырвонагвардзеец*. Суадносіны матэрыяльна тоесных асноў польскай і беларускай моў прадстаўлены ў табліцы 1.

3. Адзінкі, матэрыяльна нятоесныя па аснове, але тоесныя па суфіксе. Гэта невялікая група карэлятыўных пар, і асноўную іх частку складаюць дэрываты з суфіксамі: *-arz*, *-nik*, *-ec*, *-(i)ciel*, *-ant*, *-tor*. Аналіз асноў польска-беларускіх эквівалентаў, ускладненых аднолькавымі суфіксамі, дазваляе выявіць дзве катэгорыі асноў: а) з адной асновай і з рознымі супрацьпастаўленымі прэфіксамі: *osiedleniec* – *пасяленец*, *współtowarzysz* – *таварыш*, *spedytor* – *экспедытар*, *współautor* – *сааўтар*, *wysłaniec* – *пасланец*; б) з рознымі асновамі, але аднолькавымі суфіксамі: *chlewi**arz*** – *свін**ар***, *doktor**ant*** – *аспір**ант***, *dostoj**nik*** – *саноў**нік***, *wizyta**tor*** – *інспек**тар***, *kłót**nik*** – *склоч**нік*** (*звадзік*), *kobzi**arz*** – *дуд**ар***, *czap**nik*** – *шапач**нік***, *cel**nik*** – *мыт**нік***, *cud**ak*** – *дзіў**ак***, *dach**arz*** – *страх**ар***, *dław**iciel*** – *душ**ыцель***, *doktor**ant*** – *аспір**ант***, *dostoj**nik*** – *саноў**нік***, *ślus**arz*** – *слес**арь***, *uczest**nik*** – *удзель**нік***, *zawist**nik*** – *зайздрос**нік***, *cierpiąt**nik*** – *пакут**нік***, *cukrz**yk*** – *дыябет**ык***, *zawod**nik*** – *спабор**нік*** (*удзельнік*), *zbocz**eniec*** – *вычвар**энец***, *zwierzch**nik*** – *началь**нік***, *zwolen**nik*** – *паслядоў**нік*** (*паплечнік*), *szabrow**nik*** – *мяшоч**нік*** (*мяшэчнік*).

4. Пары слоў, тоесныя па аснове, але ўскладненыя рознымі афіксамі: *s**pis**ywacz* – *пера**піс**чык*, *z**mar**zluch* – *(разм)* ***мярз**ляк*, *z**wias**tun* – *прад**вес**нік*, *z**wied**zający* – *на**вед**нік* (*на**вед**вальнік*), *zwy**rod**nialec* – *вы**рад**ак* (*дэгенерат*), *za**miat**acz* – *пад**мят**альшчык*, *z**dzier**ca* – *аб**дзір**ала*, *ze**słan**iec* – *с**сыльн**ы*, *ś**mies**zek* – *на**смеш**нік*, ***bur**zyciel* – *раз**бур**альнік*, ***sił**acz* – *а**сіл**ак* (*здаравяка*), ***służ**alec* – *пры**служ**нік* (*лакей*), *s**twór**ca* – *т**вор**ца* (*стваральнік*), *u**god**owiec* – *з**год**нік* (*прымірэнец*), *u**kład**acz* – *у**клад**чык*, *u**lub**ieniec* – ***люб**імец* (*пястун*), *in**no**wator* – ***нав**атар* (*рэфарматар*), *inno**wer**ca* – *інша**вер***, ***kroj**czy* – *за**кройш**чык*, *król**obój**ca* – *цараза**бойц**а*, ***kus**iciel* – *спа**кус**нік*, ***wis**ielec* – *па**вешан**ы*, ***wład**ca* – ***улад**ар* (***валад**ар*), *włam**ywacz* – *узлом**шчык*, ***właś**ciciel* – ***улас**нік* (***улад**альнік*), ***włócz**ęga* – ***валац**уга* (*бадзяга*),

*wy**nal**azca* – *вы**наход**нік*, *wy**siedl**eniec* – *вы**сял**енец*, *wy**sła**niec* (*wy**sła**nnik*) – *па**сла**нец*, *z**wiad**owca* (*wy**wiad**owca*) – *раз**вед**чык*, *zak**ład**nik* – *за**лож**нік*, *za**smark**aniec* – *(разм) **смарк**ач*, ***zło**czyńca* – ***зла**чынца* (***зла**мыснік*).

Сюды адносяцца варыянты карэлятаў, нятоесныя па асновах, але тоесныя па афіксах: ***bez**wstyd**nik*** – ***бес**саром**нік***, *s**ub**lokator* – ***суб**кватарант*. Сустракаюцца варыянты суфіксаў з адным і тым самым значэннем: *-log/-знаўца*, *-вед*; *-mistrz*, *-majster/-майстар*: *teatrolog* – *тэатразнаўца*, *cechmistrz* – *цехмайстар*.

5. Існуюць нятоесныя па аснове і суфіксе адпаведнасці: *absolw**ent*** – *выпуск**нік***, *adher**ent*** – *прыхіль**нік***, *ambasad**or*** – *пас**ол***, *art**ysta*** – *маст**ак***, *bad**acz*** – *даслед**чык***, *baj**acz*** – *казач**нік***, *ban**ita*** – *выгнан**нік***, *biural**ista*** – *кантор**шчык***, *bohat**er*** – *герой*, *brat**anek*** – *плям**еннік***, *brut**al*** – *грубі**ян*** (*нахабнік*), *boj**ownik*** – *барацьб**іт***, *cerat**ik*** – *ганч**ар***, *charakteryz**ator*** – *грым**ёр***, *chimer**yk*** – *фантаз**ёр***, *Chiń**czyk*** – *кіта**ец***, *cholewk**arz*** – *закрой**шчык***, *chwal**ca*** – *падліз**нік***, *ciemięz**ca*** – *прыгняталь**нік***, *ciężar**owiec*** – *штанг**іст***, *cinksi**arz*** – *мян**яла***, *cukier**nik*** – *кандыт**ар***, *cwani**ak*** – *хітр**ун***, *darczyń**ca*** – *ахвяраваль**нік***, *daw**ca*** – *ахвяраваль**нік***, *defens**or*** – *абарон**ца***, *defet**ysta*** – *паражэн**ец***, *delikac**ik*** – *пяст**ун***, *dent**ysta*** – *стамато**лаг***, *dyryg**ent*** – *дырыж**ор***, *dyspon**ent*** – *распарад**чык***, *dzieci**ak*** (*разм*) – *смарк**ач*** (*разм*), *ekspedi**ent*** – *прадав**ец***, *ewangel**ik*** – *пратэст**ант***, *dziennik**arz*** – *журнал**іст***, *dzierżaw**ca*** – *аранд**атар***, *fryzj**er*** – *цырульн**ік***, *głos**iciel*** – *вяшчаль**нік***, *gol**arz*** – *цырульн**ік***, *gorsz**yciel*** – *спакус**нік***, *grab**arz*** – *магіль**шчык***, *graj**ek*** – *музык**ант***, *gruźl**ik*** – *сухот**нік***, *starz**ec*** – *дзед*, *sukces**or*** – *наслед**нік*** (*спадчыннік*), *szatni**arz*** – *гардэроб**шчык***, *szczęści**arz*** – *шчаслів**ец***, *szmaci**arz*** – *ануч**нік*** (*рызнік*, *лахмытнік*), *sztych**arz*** – *грав**ёр***, *spadochroni**arz*** – *парашут**ыст***, *spaw**acz*** – *звар**шчык***, *spisk**owiec*** – *загавор**шчык*** (*змоўшчык*), *urlop**owicz*** – *адпуск**нік***, *konsum**ent*** – *спажыв**ец***, *kręt**acz*** – *круц**ель*** (*ашуканец*), *krucz**ek*** – *выкрут* (*хітрык*).

Сярод іх можна выявіць намінацыі, якія характарызуюцца ў дзвюх мовах адпаведнымі суадносінамі суфіксаў: *-ca/-нец, -іцель, -ун, -ар, -нік, -ац, -ант, -чык, -к*; *-owiec/-ік, -шчык, -нік, -ец, -ант, -ал*; *-ista(-ysta)/-нік, -ун*; *-owicz/-нік, -шчык, -ант*; *-nik/-ец, -ар, -ер, -ён, -шчык, -эц, -ат, -∅, -ыст*; *-ant(-ent)/-нік, -ыст, -ян, -уц*; *-tor/-ёр, -нік*; *-arz/-іт, -шчык, -янін*; *-acz/-яг(а), -уг(а)*; *-yn/-янт*; *-er/-як, -янт, -шчык*; *-ic/-шчык*; *-ol/-ут*; *-us/-нік*; *-ek/-нік*; *-ik(-yk)/-нік, -ак, -ун, -іст*; *-usz/-нік*; *-czyk/-ец*; *-iciel(-yciel)/-ц(а)*; *-ak/-ач, -нік, -∅(я)*; *-et/-ор, -чык*; *-as/-ей*; *-el/-ач, -ук, -нік*; *-at/-як, -ант*; *-ec/-нік, -ок, -∅*; *-erz/-яр, -шчык, -ыст, -нік*; *-∅/-ант, -янін, -вец, -ец*. Самымі актыўнымі з іх

пры ўтварэнні паралеляў, нятоесных па аснове і суфіксе, з'яўляюцца пары дэрыватаў *-ca/-нік*; *-nik/-ец*; *-owiec/-шчык*; *-er/-як*; *-ent/-ян*; *-arz/-шчык*; *-tor/-еец*. Суадносіны дэрыватаў пры ўтварэнні іх з матэрыяльна нятоеснымі асновамі ілюструе табліца 2.

На падставе прааналізаваных суфіксальных эквівалентаў, якія далучаны да матэрыяльна тоесных і матэрыяльна нятоесных асноў, можна зрабіць вывад аб тым, што большасць параўнаных дэрыватаў ўтвараюць пары незалежна ад ступені матэрыяльнага падабенства.

6. Характэрнай рысай многіх прааналізаваных пар з'яўляецца наяўнасць ў іх складзе не аднаго слова, а цэлага сінанімічнага рада польскіх карэлятаў, адпаведнага аднаму беларускаму дэрывату ў адным канкрэтным значэнні: *lasowy, gajowy, leśniczy, leśnik – ляснік*; *magik, kuglarz – фокуснік*; *marynarz, majtek – марак*; *chlebodawca, dobrodziej, łaskawca – дабрадзей*; *krajan, krajowiec – туземец*; *ludojad, ludożerca – людажэр*. Кампаненты сінанімічнага рада са словаўтваральнага пункту погляду адрозніваюцца паміж сабой па суфіксе: *wysłan**iec**, wysłan**nik** – пасла**нец***; *stworz**yciel**, stwór**ca** – твор**ца***; *tłuś**cioch**, tłuś**cioszek** – тай**ст****ун***; *kłam**ca**, klam**czuch*** (*разм*) – *і**лгун***; *zarząd**ca**, zarządz**ając**y – кіраў**нік***; па прэфіксу: ***z**wiadowca, **wy**wiadowca – **раз**ведчык*; па матываванай аснове з адначасовай наяўнасцю аднолькавых суфіксаў: *baj**arz**, baśni**arz** – казачнік*; *łachmani**arz**, szmaci**arz** – анучнік*; па аснове і суфіксе, прычым адзін з сінанімічных эквівалентаў можа быць запазычаным словам: *kombinator, macher – махляр*; *dygnitarz, dostojnik – саноўнік*; *dacharz, dekarz – страхар*; *fryzjer, golarz – цырульнік*; *grek, helenista – эленіст*; *idiota, kretyn – ідыёт*; *kamrat, przyjaciel – сябар*; *mistrz, majster – майстар*.

Выяўлены выпадкі, калі розныя лексемы беларускай мовы маюць адзін польскі эквівалент: *zbieracz – збіральнік, калекцыянер*; *idol – ідал, балван*; *szofer – шафёр, кіроўца*; *samotnik – адзінец, самотнік*; *skarbnik – скарбнік, казначэй*; *wisus – вісус, свавольнік*; *zalotnik – залётнік, бабнік*; *znachor – знахар, чараўнік*; *huncwot – нягоднік, паганец*; *szlifierz – шліфавальшчык, тачыльшчык*; *koszykarz – кашолачнік, баскетбаліст*; *zbieracz – збіральнік, калекцыянер*; *zwolennik – паслядоўнік, паплечнік*.

7. Паралелі, у складзе якіх выступае адно суфіксальна-складанае слова, можна падзяліць на групы, у якіх суфіксальна-складаным можа быць: польскі кампанент, пераважна з суфіксамі *-owiec, -ca, -arz, -nik*: *chudopachołek – бядак, drzeworytnik – разьбяр, kaznodzieja – прапаведнік, krótkodystansowiec – спрынтэр, krwiodawca – донар, listonosz – пашальён, miedziorytnik – гравёр, mocodawca – давернік, możnodawca – магнат, ofiarodawca – ахвяравальнік, płetwonurek – вадалаз, radioope-*

Табліца 2. Суадносіны дэрыватаў пры спалучэнні іх з матэрыяльна нятоеснымі асновамі ў польскай і беларускай мовах

польскія суфіксы	беларускія эквіваленты																														
	-эц/-ец	-іст/-ыст	-анец	-нік	-тар	-ат/-ят	-ор/-ёр	-янін/-анін	-∅(а)	-яр/-ар	-овец	-як/-ак	-ун	-ік/-ык	-ір	-ач	-чык	-шчык	-іцель	-ан/-ян	-ус	-ант/-янт	-лаг	-вік	-унт	-к	-юга	-ый	-ей/эй
-yciel/-iciel	+			+	+					+	+							+	+											
-ca	+			+					+	+			+		+		+	+	+			+				+				
-owiec	+	+		+									+	+				+				+								
-ysta/-ista	+			+								+	+					+					+							
-owicz				+														+				+								
-is																					+									
-nik	+	+				+				+								+												
-ant		+		+						+										+										
-ent	+			+			+										+	+												
-tor	+			+			+		+	+							+	+												
-arz	+	+		+			+	+	+	+		+						+				+		+						
-yn																						+					+			
-yta/-ita				+																										
-er	+			+					+	+		+						+				+								
-ic												+						+												
-ol																									+					
-us				+																										
-or	+			+																					+					
-acz	+	+		+			+			+								+												
-ek		+		+								+	+									+			+					
-al																				+										
-usz				+							+																			
-czyk	+			+																										
-niś				+							+		+									+								
-∅								+										+	+		+									
-yk/-ik		+										+	+												+					
-ak																+														
-yt																						+								
-at																						+								
-ar									+																					
-erz		+		+						+								+												
-ec				+										+						+										
-an										+																				
-anin			+																	+										
-asz									+																				+	+

rator – радыст, spadkobierca – спадчыннік, sprawozdawca – дакладчык, oczajdusza – прахвост, powieściopisarz – раманіст, spadkobierca – спадчыннік; беларускі карэлят, пераважна з суфіксамі *-ец, -нік, -шчык*: *ebenista – чырвонадрэўшчык, filmowiec – кінааператар, imiennik – аднафамілец, księgarz – кнігапрадавец, domownik – дамачадзец, kopacz – землякоп, łyżwiarz – канькабежац, malarz – жывапісец, niedowiarek – малаверац, oracz – земляроб, przyrodnik – прыродазнаўца, rolnik – земляроб, sadownik – садавод, smolarz – смалакур, kamieniarz – каменябоец, cesionariusz – правапераемнік, chmielarz – хмелявод, dmuchacz – шкловыдзімальнік, hipokryta – крывадушнік, hodowca – жывёлавод, kronikarz – летапісец, pancernik – браняносец, nurek – вадалаз, podatnik – падаткаплацельшчык, rzeźnik – жывёлабоец, dworzanin – царадворац, smolarz – смалакур, ziemianin – землеўласнік*; ці абодва суфіксальна-складаныя карэляты адразу з суфіксальнымі паралелямі *-czyk/-ец*; *-arz/-ец*; *-nik/-нік*; *-ec/-ец*; *-ca/-ц(а)*; *-ista/-еец*; *-ca/-ац*; *-nik/-ец*; *-ca/-нік*; *-ek/-ец*: *Nowozelandczyk – новазеландзец, bajkopisarz – байкапісец, biznesmen – бізнесмен, brakorób – бракароб, darmozjad – дармаед, dobrodziej – дабрадзей, fotoreporter – фотарэпарцёр, elektrotechnik – электратэхнік, hydrotechnik – гідратэхнік, samozwaniec – самазванец, carobójca – царазабойца, czerwonogwardzista – чырвонагвардзеец, dzieciobójca – дзетазабойца, gleboznawca – глебазнавец, dziejopisarz – гістарыёграф, innowerca – іншаверац, jednochodnik – інаходзец, geometra – землямер, koniokrad – канакрад, bałwochwalca – ідалапаклоннік, nosiwoda – ваданос, rymotwórca – вершаскладальнік, samolub – сябелюб, linoskoczek – канатаходзец, jednolatek – аднагодак, wolnomyśliciel – вальнадумец, wszystkowiedzący – усявед (усяведны), samobójca – самазабойца, samowładca – самадзержац.*

Структурны аналіз адпаведнікаў, калі адзін кампанент выяўляецца пры дапамозе суфіксальна-складанага слова, дазваляе вылучыць пары лексем з агульным коранем: ***kamien**iarz* – ***камен**ячос*, ***камен**ябоец*, ***ofiar**odawca* – ***ахвяр**авальнік*, ***kop**acz* – *земля**коп***, ***przyrod**nik* – ***прырод**азнаўца*, ***sad**ownik* – ***сад**авод*, ***smol**arz* – ***смал**акур*, ***chmiel**arz* – ***хмел**явод*, ***podat**nik* – ***падат**каплацельшчык*; з агульным суфіксам: *obłud**nik*** – *крывадуш**нік***, *ochot**nik*** – *добраахвот**нік***. Адзначаюцца пары, якія не маюць агульных элементаў структуры: *delikwent – правапарушальнік, drzeworytnik – разьбяр, kaznodzieja – прапаведнік, krótkodystansowiec – спрынтэр.* Апошніх у матэрыяле большасць.

Сярод карэліруючых пар слоў, абодва кампаненты якіх з'яўляюцца суфіксальна-складаным словам, выяўляюцца адзінкі цалкам матэрыяльна тоесныя: *radiosłuchacz – радыёслухач, brakarób – бракароб, sa-*

mozwaniec – самазванец, wolnodumiec – вальнадумец, gleboznawca – глебазнаўца; тоесныя па абедзвюх асновах, але ўскладненыя рознымі суфіксамі: *białogwardz**ista** – белагвардз**еец**, czyrwonogwardz**ista** – чырвонагвардз**еец**, bajkopis**arz** – байкапіс**ец**, gleboznaw**ca** – глебазнав**ец***; тоесныя па адной з частак складанага слова і з рознымі суфіксамі: ***dobro**czyńca – **добра**ахвотнік*; тоесныя толькі па суфіксу: *samolub∅–сябелюб∅*; лексемы, якія не маюць агульных элементаў кампазіта: *pasibrzuch – дармаед, bałwochwalca – ідалапаклоннік, obcokrajowiec – чужаземец, dziejopisarz – гісторыёграф*.

Статыстычныя падлікі сведчаць, што самай шматлікай сярод трох груп, у склад якіх уваходзіць суфіксальна-складанае слова, з'яўляецца група, у якой польскаму складанаму дэрывату адпавядае ў беларускай мове суфіксальна-складанае слова. Гэта можна растлумачыць тым, што складанне – характэрны працэс для ўтварэння слоў катэгорыі персанальнасці ў двух параўнаных мовах[4].

8. Невялікая па колькасці слоў група прадстаўлена адпаведнікамі, дзе адзін з карэлятаў выражаны субстантываваным прыметнікам ці дзеепрыметнікам: *robociarz – рабочы, stajenny – стайнік, skupujący – скупшчык, złotousty – златавуст, oracz – араты, lasowy – лясніk*; ці абодва карэліруемыя словы выражаны субстантываваным прыметнікам ці дзеепрыметнікам: *bezdomny – бездомны, budowniczy – будаўнічы, chorąży – харунжы, lowczy – лоўчы*. Сярод іх выяўляюцца пары, матэрыяльна тоесныя па аснове: *bez**dom**ny – бяз**дом**ны, **bud**owniczy – **буд**аўнічы, **chorąż**y – **харунж**ы, **las**owy – **ляс**нік, **lowcz**y – **лоўч**ы, **or**acz – **ар**аты*; нятоесныя па аснове, але з агульнай каранёвай марфемай: ***kroj**czy – **кра**вец, **lew**orączny – **ляў**ша, niedo**ros**ly – неда**рос**так, **niem**y – **нямк**о, **mier**niczy – на**мер**нік, prze**chodz**ień – пра**хож**ы, **ślep**iec – **сляп**ы*; рознакаранёвыя, рознаасноўныя адзінкі: *bagażowy – насільшчык, drużynowy – гарцэр, gorzełany – вінакур, majątny – багаты, myśliwy – паляўнічы, oprowadzający – экскурсавод, niepełnosprawny – інвалід, numerowy – каліморны, księgowy – бухгалтар, pozwany – адказчык, protegowany – пратэжэ, przysięgły – прасяжны, salowy – санітар, strajkujący – забастоўшчык, strażak – пажарны, narzeczony – жаніх, poplecznik – памагаты, przemądrzaly – разумнік, przewodniczący – старшыня*.

[4] I. Klemensiewiczówna, *Wyrazy złożone nowszej polszczyzny kulturalnej*, Kraków 1951, s. 111.

9. У некаторых выпадках можна гаварыць аб так называемай "элептычнай субстантывацыі"[5], калі кожнаму субстантываванаму слову абавязкова спадарожнічае сінанімічнае словазлучэнне: *bezpanstwowiec* – чалавек без грамадзянства, *bezwyznaniowiec* – чалавек без веравызнання, *bywalec* – бывалы чалавек, *chudziak* – худы чалавек, *męczydusza* – дакучны чалавек, *jaskiniowiec* – пячорны чалавек, *niechluj* – неахайны чалавек, *nerwus* – нервовы чалавек, *nudziarz* – нудны чалавек, *salonowiec* – свецкі чалавек, *cywilista* – спецыяліст па грамадскім праве, *cyzeler* – разьбяр па метале, *flirciarz* – ахвотнік пафліртаваць, *fotografik* – прафесійны фатограф, *hierarcha* – вышэйшая духоўная асоба, *hungarysta* – спецыяліст у галіне венгерскай філалогіі, *hrabicz* – сын графа, *dependent* – практыкант у адваката, *detalista* – рознічны гандляр, *dlugodystansowiec* – бягун на доўгія дыстанцыі, *dróżnik* – чыгуначны майстар, *druzynowy* – начальнік гарцэрскай дружыны, *wyzwoleniec* – вызвалены ад рабства, *wzrokowiec* – чалавек з пераважна зрокавай памяццю, *mięsożerca* – аматар мясных страў, *dominikanin* – манах дамініканскага ордэна, *funkcjonariusz* – службовая асоба, *kryminalista* – крымінальны злачынец, *knajpiarz* – гаспадар рэстарана, *kominiarczyk* – вучань камінара, *magazynier* – загадчык склада, *majsterkowicz* – аматар майстраваць, *poludniowiec* – жыхар поўдня, *spółdzielca* – член кааператыва, *sprzedawczyk* – здраднік, *strycharz* – рабочы на цагельным заводзе. Адзначаюцца варыянты апісальнага характару: *sygnatariusz* – асоба, якая падпісала дакумент (дамову); *sympatyk* – які сімпатызуе, ставіцца з прыхільнасцю, спачувальнік; *uprawniony* – які мае права; *wyzywający* – які вызывае; *zarobkiewicz* (разм) – чалавек, які ганяецца за заробкам; *nadgorliwiec* – чалавек, які праяўляе празмерную стараннасць; *niepalący* – чалавек, які не курыць; *nobilista* – нобелеўскі лаўрэат; *benedyktyn* – манах бенедыктынскага ордэна; альбо: *dolatywacz* – лётчык-выпрабавальнік; *perkusista* – музыка-ўдарнік.

Такі тып эквівалентаў можна лічыць у структурным сэнсе пераходным паміж простымі (аднаслоўнымі) і складанымі (прадстаўленымі атрыбутыўнымі словазлучэннямі) адпаведнікамі.

II. Акрамя апісаных падабенстваў і адрозненняў паміж польска-беларускімі эквівалентамі ў плане выражэння, у артыкуле аналізуюцца падабенства і разыходжанні ў плане зместу. Гэтыя адзінкі класіфікуюцца наступным чынам:

[5] В. Лопатин, *Субстантивация как способ словообразования в современном русском языке*, [в:] *Русский язык. Грамматические исследования*, Москва 1967, с. 225.

1. Намінацыі, значэнне якіх супадае поўнасцю.
2. Адзінкі, якія характарызуюцца больш шырокім аб'ёмам значэння ў параўнанні з беларускім карэлятам.
3. Пары слоў, дзе аб'ём значэння польскага дэрывата вузей адпаведнага беларускага варыянта.

Аналіз катэгорыі намінацыі, значэнне якіх супадае поўнасцю паказвае, што гэта адпаведнікі з агульнымі лексемамі і семемамі, г.зн. – дакладныя лексічныя адпаведнікі[6]: *tkacz – ткач, Ukrainiec – украінец, piekarz – пекар, trener – трэнер, aktor – акцёр, bileter – білецёр, bruchacz – брухач, chuligan – хуліган, diabetyk – дыябетык, dziwak – дзівак, fanatyk – фанатык, gigant – гігант, swat – сват, samozwaniec – самазванец.*

З другога боку можна выдзеліць і прыблізныя лексічныя адпаведнікі (другая і трэцяя катэгорыі) з тоеснасцю семем і лексем: *chitrus – хітрун, cieśla – цясляр, czytelnik – чытач, frontowiec – франтавік, geodeta – геадэзіст, ślepiec – сляпы, śmieszek – насмешнік, tybetańczyk – тыбецец, tynkarz – тынкоўшчык, japończyk – японец, kalwin – кальвініст*, а таксама дакладныя семантычныя адпаведнікі[7], дзе супадаюць семемы, а лексемы поўнасцю адрозніваюцца: *widz – глядач, wychodźca – эмігрант, wyznawca – паслядоўнік, zakonnik – манах, zbrodniarz – злачынец, żużlowiec – матагоншчык.*

Аднак да плану зместу разглядаемых намінацый належыць не толькі іх семантыка, але і стылістычная афарбоўка. Суадносіны адпаведнікаў па іх стылістычнай афарбоўцы даюць права зрабіць выснову, што большая частка польска-беларускіх эквівалентаў не адрозніваюцца стылістычна, як напрыклад, *grubas* (разм) – *маўстун* (разм), *kobieciarz* (разм) – *бабнік* (разм).

Стылістычна тоесным эквівалентам супрацьпастаўлены пары слоў, якія не супадаюць па стылістычнай афарбоўцы: *chitrus* (разм) – *хітрун* (нейтр), *mądrek* (разм) – *разумнік*, *mizerak* (разм) – *худы чалавек*, *męczydusza* (разм) – *дакучны чалавек*, *makaroniarz* (разм) – *італьянец*, *kotpan* (разм) – *калега*, *kanciarz* (разм) – *ашуканец.*

Такім чынам, адзінства лексіка-словаўтваральнай сістэмы назоўнікаў беларускай і польскай моў, якія абазначаюць выканаўцу дзеяння, праяўляецца як у плане выражэння, так і ў плане зместу.

[6] А. Е. Супрун, *Сопоставительно-типологический анализ лексики*, [в:] *Методы изучения лексики*, Минск 1975, с. 165.

[7] Тамсама, с. 165.

Што датычыць плану выражэння, даследаванне паказала па-першае, наяўнасць у супастаўляльных мовах пэўнай групы цалкам матэрыяльна тоесных эквівалентаў ва ўсіх суфіксальных групах аналізаваных дэрыватаў. Па-другое, як сярод простых (аднаслоўных), так і складаных адпаведнікаў выяўлены паралелі, якія характарызуюцца наяўнасцю аднолькавых славянскіх словаўтваральных элементаў, а менавіта, каранёў, асноў, суфіксаў. Па-трэцяе, для большасці простых (аднаслоўных) эквівалентаў, якія выражаны назоўнікамі, уласцівы аднолькавы спосаб словаўтварэння, так званая суфіксацыя (улічваючы і нулявую суфіксацыю).

Аднак у беларускай і польскай мовах можна адзначыць своеасаблівасці ў структурным плане. Адносна простых (аднаслоўных) эквівалентаў, што датычыць ужывання ў польскай мове ў якасці адпаведнікаў беларускім дэрыватам назоўнікаў з матэрыяльна нятоеснымі матываванымі асновамі, суфіксамі альбо адначасова і тымі, і другімі. У выніку словаўтваральнага даследавання польскіх суфіксаў-карэлятаў адносна дэрыватам беларускай мовы, іх суадносінам з матэрыяльна тоеснымі і матэрыяльна нятоеснымі асновамі выяўляецца, што ў большасці выпадкаў карэлятыўныя пары ўтвараюцца пры дапамозе адных і тых самых суфіксаў незалежна ад ступені структурнага падабенства/адрознення супастаўляльных слоў (гл. табл. 1 і 2).

Наяўнасць нятоесных асноў і суфіксаў для словаўтварэння найменняў ў разгледжаных парах слоў гаворыць аб запазычаннях з трэцяй мовы ў польскую мову і беларускую і розным шляху іх асіміляцыі і развіцця.

На падставе аналізу матэрыяльных сувязей польска-беларускіх карэлятыўных пар назоўнікаў можна зрабіць вывад, што чым большая складанасць адпаведніка, тым менш агульных элементаў будовы паміж імі. Адзінае выключэнне з гэтага правіла, калі паралелі, дзе састаўное найменне (суфіксальна-складанае слова, словазлучэнне) адпавядае простаму слову, тады ў найменнях большая верагоднасць аднолькавых элементаў будовы, якімі могуць быць тоесныя асновы, агульныя суфіксы, тыя ці другія разам.

Некаторыя разыходжанні могуць быць у плане зместу – сярод катэгорыі *намінацыі*, *значэнне якіх супадае поўнасцю*. Маюцца на на ўвазе простыя (аднаслоўныя) адпаведнікі, дзе адзначаецца пераважная большасць семантычных тоеснасцей. Праведзены аналіз сведчыць аб тым, што семантыка-стылістычныя разыходжанні ў парах эквівалентаў польскай і беларускай моў сустракаюцца значна радзей, чым адрозненні структурнага тыпу. Таксама і з пункту гледжан-

ня стылістычнай афарбоўкі карэліруючых польска-беларускіх пар не назіраецца істотных адрозненняў.

Складаная і разгалінаваная сістэма эквівалентаў, асабліва ў плане выражэння, сведчыць аб вялікіх магчымасцях сучасных польскай і беларускай моў у сферы ўтварэння найменняў са значэннем выканаўцы дзеяння.

STRESZCZENIE

Analiza rzeczowników będących nazwami wykonawców czynności, pokazała specyfikę słowotwórstwa polskich i białoruskich derywatów sufiksalnych osobowych nazw subiektów. Im bardziej skomplikowany sposób tworzenia jednego z ekwiwalentów, tym mniej wspólnych elementów budowy między derywatami. Semantyczno-stylistyczne różnice w parach rzeczowników występują rzadziej niż w planie strukturalnym. Przeanalizowany materiał na podstawie opisowego *Słownika polsko-białoruskiego* pod. red. H. A. Cychuna pokazuje, jak wiele istnieje derywacyjnych możliwości w obu językach.

STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE TOM 7, ROK 2007

Сняжана Асабіна
Гродна

Лексічныя варыянты фразеалагізмаў у творах Міхася Лынькова

Даследуючы стылістычныя функцыі, спосабы і прыёмы выкарыстання фразеалагізмаў у творах пісьменніка, неабходна размяжоўваць індывідуальна-аўтарскае і агульнанароднае ўжыванне гэтых моўных адзінак. Такой агульнанароднай, агульнамоўнай з'явай выступае варыянтнасць шмат якіх фразеалагізмаў, г. зн. іх магчымасць рэалізоўвацца ў маўленні ў дзвюх, а то і болей разнавіднасцях, узаемазамяняльных у любым кантэксце. Прычым і тут, як будзе паказана ў далейшым, можна бачыць спецыфічнае, характэрнае, відаць, толькі для творчай манеры М. Лынькова.

З'ява фразеалагічнай варыянтнасці не новая ў мовазнаўстве, яна шырока даследавалася ў працах рускіх фразеолагаў А. М. Бабкіна, А. І. Дзібровай, У. П. Жукава, В. М. Макіенкі, А. І. Малаткова і іншых.

У беларускім мовазнаўстве пытаннямі варыянтнасці фразеалагізмаў займаліся А. С. Аксамітаў, М. М. Аляхновіч, С. К. Берднік, М. А. Даніловіч, І. Я. Лепешаў, З. А. Рудакоўская, Ф. М. Янкоўскі. У манаграфічнай працы І. М. Хлусевіч[1] зроблена першая ў нашым мовазнаўстве спроба ўсебаковага, сістэмнага вывучэння фразеалагічнай варыянтнасці. Як паказана ў гэтым даследаванні, каля 31 працэнта фразеалагізмаў беларускай літаратурнай мовы ахоплена з'явай варыянтнасці. Прычынай узнікнення варыянтаў з'яўляецца *супярэчнасць паміж формай і зместам фразеалагізма. Ідэальна фразеалагіч-*

[1] Гл.: І. М. Хлусевіч, *Варыянтнасць фразеалагізмаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове*, Гродна 2002, с. 22.

нае значэнне, адпрацаванае і замацаванае моўнай традыцыяй, павінна адназначна перадавацца формай, але такая суадноснасць (ці адпаведнасць) пастаянна парушаецца. Справа ў тым, што значэнне фразеалагізма мае тэндэнцыю набываць розныя формы выражэння, і наадварот: адна і тая ж фразеалагічная форма імкнецца абслугоўваць розныя моўныя функцыі[2].

Звычайна вылучаюць 8 тыпаў фразеалагічнай варыянтнасці: лексічны, фанетычны, акцэнтны, акцэнтна-фанетычны, словаўтваральны, марфалагічны, канструкцыйна-колькасны, камбінаваны. Гэтыя тыпы варыянтаў вызначаюць на аснове таго, што змяняецца ў фразеалагізме: кампанент ці яго фармальны бок.

У манаграфіі І. М. Хлусевіч паказана, што сярод фразеалагізмаў, для якіх характэрна варыянтнасць, назіраецца шэраг апазіцый. *З аднаго боку, выступаюць выразы з лексічнай варыянтнасцю (з пераменным кампанентам у іх складзе), з другога – з фармальнай (з відазмяненнямі аднаго і таго ж кампанента). І тым, і другім фразеалагізмам, у якіх вар'іраванне заўсёды адбываецца ў межах адной сінтаксічнай канструкцыі, супрацьпастаўляюцца выразы з канструкцыйна-колькаснай варыянтнасцю, у якіх мяняецца колькасць кампанентаў і, значыць, канструкцыя. Што да фразеалагізмаў з камбінаванай варыянтнасцю, то яны знаходзяцца ў апазіцыі да ўсіх пералічаных вышэй выразаў, бо ўтрымліваюць у сабе розныя віды вар'іравання*[3].

Найбольш пашыраны – лексічны тып фразеалагічнай варыянтнасці. Лексічныя варыянты – гэта *слоўна-кампанентныя разнавіднасці фразеалагізмаў, якія адбываюцца ў межах адной і той жа сінтаксічнай канструкцыі і не ўносяць якіх-небудзь сэнсавых адценняў у зместфразеалагізма*[4].

Сярод названых тыпаў варыянтнасці у творах Лынькова пераважае лексічны. Зафіксавана 157 фразеалагізмаў з лексічнай варыянтнасцю, некаторыя з іх сустракаюцца па некалькі разоў, таму агульная колькасць ужыванняў складае 323 адзінкі. Для параўнання: словаўтваральных варыянтаў налічваецца 34, марфалагічных 54, фанетычных 19, акцэнтна-фанетычных 4.

[2] В. П. Жуков, *Семантика фразеологических оборотов*, Москва 1978, с. 103–104.
[3] І. М. Хлусевіч, с. 71–72.
[4] В. П. Жуков, *Русская фразеология*, Москва 1986, с. 168.

Пры лексічнай варыянтнасці могуць замяняцца кампаненты, суадносныя з рознымі часцінамі мовы, але ў большасці выпадкаў – з назоўнікам (54 фразеалагізмы, 90 ужыванняў) і дзеясловам (57 фразеалагізмаў, 144 ужыванні). Разгледзім спачатку фразеалагізмы, у якіх у якасці пераменных кампанентаў выступаюць назоўнікі. У палове выпадкаў яны з'яўляюцца сінонімамі: 1) абсалютнымі, якія супадаюць ва ўсіх сваіх значэннях: *з мінуты на мінуту – з хвіліны на хвіліну; на ўсю моц – на ўсю сілу; к чорту – к д'яблу; на злосць – на зло; ні кроплі – ні каплі*; 2) якія могуць супадаць толькі ў пэўных значэннях полісеманітычнага слова: *дзіўная рэч – дзіўная справа* (супадаюць у значэннях 'факт, з'ява рэчаіснасці,'; 'абставіны'); *з пункту гледжання – з пункту погляду; сам сабе гаспадар – сам сабе пан; пракладаць дарогу – пракладаць шлях – пракладаць сцежку*;

Узаемазамена кампанентаў-назоўнікаў адбываецца таксама на аснове тэматычных, гіпера-гіпанімічных (рода-відавых), метанімічных, метафарычных і сінекдахічных сувязяў, прычым паняцці "метафара", "метанімія" і "сінекдаха", якія азначаюць спосабы развіцця пераносных значэнняў у словах, у адносінах да фразеалагічных кампанентаў выкарыстоўваюцца ўмоўна.

У творах Лынькова сустракаем вар'іраванне: 1) на аснове метаніміі: *загнаць у магілу – загнаць у труну; мурашкі пабеглі па целе – мурашкі пабеглі па спіне* (перанос назвы з месца на тое, што ў ім знаходзіцца); *раскінуць розумам – раскінуць галавой; перабіраць у галаве – перабіраць у памяці* (перанос з назвы прадмета на яго накіраванасць); 2) на аснове сінекдахі: *глядзець смерці ў вочы – глядзець смерці ў твар; пападацца на кручок – пападацца на вудачку; сядзець на шыі – сядзець на карку; нагі не варты – падэшвы не варты* (перанос з назвы цэлага на яго частку); 3) на аснове метафары: *аблiваць граззю – аблiваць памыямі; пух ляціць – пер'е ляціць* (перанос назвы на аснове падабенства).

Сярод фразеалагічных варыянтаў з вар'іруемымі назоўнікамі варта вылучыць фразеалагічныя адзінкі, кампаненты якіх не накладваюцца па сваім значэнні на словы свабоднага ўжывання і асацыіруюцца са словамі рознага значэння, што аб'ядноўваюцца ў адно семантычнае поле. На думку У. П. Жукава, такія фразеалагізмы могуць быць вытлумачаны па-рознаму. *З аднаго боку, фразеалагізмы тыпу вынуть душу – вынуть сердце; как с неба свалиться – как слуны свалиться могуць з'яўляцца разнавіднасцямі адной і той жа фразеалагічнай адзінкі. З другога боку, такія фразеалагізмы можна кваліфікаваць як фразеалагічныя сінонімы, якія маюць*

*у сваім складзе адзін ці некалькі агульных кампанентаў. Нарэшце, такія ўтварэнні можна разглядаць як прамежкавыя (гібрыдныя) з'явы паміж варыянтнасцю і сінанімія*й[5].

У творах пісьменніка знаходзім 9 прыкладаў замены фразеалагічных кампанентаў *душа – сэрца*: *душа не ляжыць – сэрца не ляжыць; вялікага сэрца – вялікай душы; на дне душы – на дне сэрца; з адкрытай душой – з адкрытым сэрцам; душа ные – сэрца ные; душа крывёй абліваецца – сэрца крывёй абліваецца; душа гарыць – сэрца гарыць; адлягло на душы – адлягло на сэрцы; рваць душу – рваць сэрца.* На нашу думку, дадзеныя кампаненты з'яўляюцца варыянтамі, а не сінонімамі, бо супадаюць у значэнні 'сукупнасць характэрных рыс, уласцівых асобе'. Сэнсавая сувязь паміж кампанентамі і іх здольнасць узаемазамяняцца ў любым кантэксце паказвае, што гэта варыянты: *І страшна, аж млосна робіцца. І добра... на душы адлягае*[6]. *– Гінуць чорныя думы, адлягае на сэрцы*[7].

Па аналогіі з пералічанымі вышэй варыянтнымі назоўнікавымі кампанентамі *душа – сэрца* фразеалагізм *накіпела на сэрцы*, ужыты Лыньковым, можна лічыць магчымым варыянтам да выразу *накіпела на душы*, зафіксаваным фразеалагічнымі слоўнікамі. Параўнаем таксама магчымыя варыянты *каменем на душы, сушыць душу, набалела на сэрцы* з адпаведнымі агульнаўжывальнымі *каменем на сэрцы, сушыць сэрца, набалела на душы.* Дарэчы, на фразеалагічным узроўні кампаненты *душа – сэрца* валодаюць большай семантычнай блізкасцю, чым на ўзроўні слоў.

Падобнае можам сказаць і ў дачыненні да фразеалагізмаў *падцягнула жывот – падцягнула дух*, кампаненты якіх (*жывот – дух*) не супадаюць на лексічным узроўні, але, выкарыстоўваючыся ў фразеалагічных адзінках, набываюць роднасную семантыку і з'яўляюцца варыянтамі.

Вар'іраванне дзеяслоўнага кампанента налічваецца ў 57 фразеалагізмах (144 ужыванні). У большасці выпадкаў узаемазамяняльныя дзеясловы, як і назоўнікі, звязаны сінанімічнымі адносінымі. Кампаненты могуць быць абсалютнымі сінонімамі. Так, замену кампанента *пападаць – трапляць* (*папасці – трапіць*) назіраем у 6 фразеалагізмах з розным значэннем: *пападаць у рукі – трапляць у рукі* (15 ужыванняў); *папасці на вочы – трапіць на вочы* (6 ужыванняў);

[5] Тамсама, с. 172.

[6] Міхась Лынькоў, *Поўны збор твораў*, Мінск 1981–1985, т. 3, с. 34.

[7] Тамсама, с. 12.

папасці ў лапы – трапіць у лапы (4 ужыванні); *зуб на зуб не попадаў – зуб на зуб не трапляў* (4 ужыванні); *попадаць у пераплёт – трапляць у пераплёт; папасці пад руку – трапіць пад руку.* Супадаюць у семантычных і стылістычных адносінах наступныя фразеалагізмы і іх варыянты: *што ні кажы – што ні гавары; заглянуць у душу – зазірнуць у душу; вастрыць зубы – тачыць зубы; пакласці канец – палажыць канец* і інш.

Некаторыя кампаненты (калі іх разглядаць на ўзроўні слоў) супадаюць у адным ці некалькіх значэннях: *выбываць са строю – выходзіць са строю* (маюць агульнае значэнне ‘выйсці са складу чаго-небудзь’); *браць ⟨блізка⟩ да сэрца – прымаць ⟨блізка⟩ да сэрца* (*браць* у 6-ым значэнні – ‘умоўна прымаць, лічыць’); *браццa за жываты – хапацца за жываты* (*браццa* ў 1-ым значэнні – ‘хапацца рукамі за які-небудзь прадмет’). Ёсць выпадкі, калі кампаненты адрозніваюцца стылістычнай прыналежнасцю: *піць кроў – высмоктваць кроў – смактаць кроў – ссаць кроў*, дзе дзеяслоў *піць* – стылістычна нейтральны, а *высмоктваць, смактаць, ссаць* – размоўныя; *лезці на ражон – ісці на ражон* (*лезці* ў адным са значэнняў – размоўны адпаведнік дзеяслова *ісці*).

Большасць дзеяслоўных варыянтаў у творах пісьменніка ўтвараюць суадносныя трывальныя пары (вар’іруюцца ў форме закончанага і незакончанага трывання): *звальваць (скідаць) з плячэй – зваліць (скінуць) з плячэй; адыходзіць(адступаць) на задні план – адысці (адступіць) на задні план.* Ёсць выразы, у якіх назіраецца вар’іраванне дзеяслоўнага кампанента толькі ў форме закончанага трывання: *накладваць на сябе рукі – накласці (налажыць) на сябе рукі; хадзіць ходырам – пайсці (захадзіць) ходырам.* Лынькоў ужывае варыянты *налажыць на сябе рукі; захадзіць ходырам.*

У многіх фразеалагізмах пісьменнік выбірае толькі пэўны варыянт. Напрыклад, у выразе *дух выйшаў (вылецеў, выскачыў)* двойчы выкарыстоўваецца дзеяслоў *вылецеў*, у фразеалагізмах *не ўкладваецца (не месціцца, не тоўпіцца) у галаве, губляць (траціць, страчваць) галаву, вывесці (пусціць, спісаць) у расход* аўтар ужывае адпаведна варыянты *не месціцца, траціць, пусціць.* Ёсць прыклады, дзе Лынькоў выкарыстоўвае ўсе магчымыя варыянты, зафіксаваныя ў ФСБМ (*Фразеалагічным слоўніку беларускай мовы*): *соваць ⟨свой⟩ нос – сунуць ⟨свой⟩ нос – утыкаць ⟨свой⟩ нос.* У сувязі з гэтым узнікае пытанне: чым абумоўлены выбар таго ці іншага варыянта? Відаць, некаторыя варыянты былі больш вядомыя пісьменніку, шырока ўжываліся і ўжываюцца ў агульнанароднай мове і ў творах іншых аўтараў. Акрамя таго, у час напісання ранніх твораў Лынькова (20–30-ыя гг.) не

існавала ўнармаваных фразеалагічных даведнікаў, а з'ява варыянтнасці фразеалагізмаў, як і сама фразеалогія, пачала распрацоўвацца мовазнаўцамі ў 50–60-ыя гады XX стагоддзя. З розных варыянтаў, якія існуюць у мове, пісьменнік інтуітыўна выбіраў той, што здаваўся больш прыдатным у пэўнай моўнай сітуацыі.

Варыянтнасць кампанентаў, суадносных з іншымі часцінамі мовы, сустракаецца радзей.

Узаемазамену кампанента-прыметніка назіраем у 10 фразеалагізмах (19 ужыванняў). Пераменныя словы радзей з'яўляюцца сінонімамі, чым гэта назіралася ў назоўнікавых і дзеяслоўных кампанентах. Часцей прыметнікавыя кампаненты не супадаюць у сваім значэнні па-за межамі фразеалагізма: *глядзець іншымі вачамі – глядзець новымі вачамі; на голым месцы – на пустым месцы; з голымі рукамі – з пустымі рукамі.* Пра варыянт апошняга фразеалагізма ўжо ўпаміналася ў навуковай літаратуры: *У якасці пераменных кампанентаў толькі ў рэдкіх выпадках выступаюць словы, якія па-за межамі фразеалагізма не супадаюць у адным са сваіх значэнняў ці адценняў або не ўваходзяць у адну семантычную групу. Так, немагчыма знайсці пункт сутыкнення паміж узятым на лексічным узроўні словамі п у с т ы і г о л ы, але ў фразеалагізме з г о л ы м і (п у с т ы м і) р у к а м і яны ўзаемна замяняюцца і гэта не адбіваецца на вобразным стрыжні выслоўя*[8]. Часам этымалогія фразеалагізма дапамагае ўстанавіць прычыну ўзнікнення варыянтнасці таго ці іншага выразу. Так, фразеалагізм *на другі (задні) план* паходзіць з маўлення мастакоў, дзе ўжываюць у тэрміналагічным значэнні *першы (пярэдні) план* і *другі (задні) план*[9]. Лынькоў ужывае выраз *адысці на другі план* (у ФСБМ – *адысці на задні план*), які можна лічыць магчымым варыянтам, таму што ў агульнанароднай мове ўжо існуе апісаны вышэй фразеалагізм *на другі (задні) план).* Сустракаецца і аўтарская замена дзеяслоўнага кампанента – *адціснуць на задні план.*

Варыянтнасць лічэбнікавага кампанента назіраецца ў адным фразеалагізме: *да сёмага поту – да дзесятага поту.* Наогул, для пераменнага лічэбнікавага кампанента не характэрны сінанімічныя, метанімічныя, метафарычныя і іншыя сувязі, яго вар'іраванне даволі рэдкае і абмяжоўваецца толькі лічанымі адзінкамі, а менавіта такімі як *сем, тры, сто, сорак*[10].

[8] І. Я. Лепешаў, *Фразеалогія ў творах К. Крапівы*, Мінск 1976, с. 22.

[9] І. Я. Лепешаў, *Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў*, Мінск 2004, с. 235.

[10] Гл.: І. М. Хлусевіч, с. 37.

Займеннікавы кампанент вар'іруецца ў 4 фразеалагізмах (11 ужыванняў): *ад няма чаго рабіць – ад нечага рабіць; чаго граху таіць – што граху таіць; ва ўсякім разе – у кожным разе; няма чаго бога гнявіць – чаго бога гнявіць.*

Вар'іраванне прыслоўнага кампанента сустракаецца ў 6 фразеалагічных адзінках (8 ужыванняў), пры гэтым узаемазамяняюцца ў асноўным словы-сінонімы: *уздыхнуць вольна – уздыхнуць свабодна; бачыць наскрозь – бачыць навылёт; мякка сцеле ⟨ды мулка спаць⟩ – мякка сцеле ⟨ды жорстка спаць⟩; дагары дном – уверх дном.*

Сярод службовых часцін мовы ў 12 выпадках вар'іруюцца прыназоўнікавыя кампаненты (30 ужыванняў), якія выражаюць: часавыя адносіны (*ад цямна да цямна – з цямна да цямна*); мэтавыя (*мастацтва для мастацтва – мастацтва дзеля мастацтва*); меры і ступені (*на ўвесь дух – ва ўвесь дух*; *на ўвесь рост – ва ўвесь рост*); прычыны (*качацца са смеху – качацца ад смеху*). У большасці ўзаемазамяняльныя словы з'яўляюцца сінонімамі: *праз зубы – скрозь зубы; пятае праз дзесятае – пятае цераз дзесятае, цераз сілу – праз сілу* і інш. Па аналогіі з існуючымі ў мове варыянтамі прыназоўнікаў *праз – цераз* ужыты пісьменнікам выраз *пераступіць праз труп* (слоўнікавае – *пераступіць цераз труп*) можна лічыць магчымым агульнаўжывальным варыянтам.

Кампаненты-злучнікі вар'іруюцца ў 5 выпадках (8 ужыванняў): *што ні кажы – як ні кажы; як аршын праглынуў – нібы аршын праглынуў; разжоўваць і ў рот класці – разжоўваць ды ў рот класці*); часціцы – у адным (3 ужыванні): *аж пыл курыць – толькі пыл курыць*).

Назіраем таксама адначасовае вар'іраванне двух кампанентаў, суадносных з рознымі часцінамі мовы, найчасцей з назоўнікам і дзеясловам (*браць за душу – хапаць за сэрца; падаць на кручок – трапляць на вудачку; мароз па скуры прабягаў – мароз па спіне прайшоў*); з прыназоўнікам і злучнікам (*як праз сон – нібы скрозь сон*).

У адзінкавых выпадках узаемазамяняюцца кампаненты, суадносныя з неаднолькавай часцінай мовы. Напрыклад, у фразеалагізме *не жылец ⟨на белым свеце⟩* прыметнік *белы* замяняецца займеннікам *гэты*: *не жылец ⟨на гэтым свеце⟩*.

Лексічная варыянтнасць назіраецца і сярод камбінаванага тыпу: лексічнай і канструкцыйна-колькаснай варыянтнасці (*што ⟨і⟩ казаць – што гаварыць; каб ⟨і⟩ духу не было – каб паху не было; папасці ў нерат ⟨ні ўзад ні ўперад⟩ – трапіць у нерат*); лексічнай і марфалагічнай (*глядзець іншымі вачамі – глядзець другім вокам*); лексічнай

і словаўтваральнай (*загнаць у магілу – увагнаць у зямлю; калені дрыжаць – каленкі затрэсліся*); лексічнай, словаўтваральнай і канструкцыйна-колькаснай (*на ⟨адну⟩ мінуту – на хвілінку*) і інш.

Гаворачы пра фразеалагічныя варыянты лексічнага тыпу, У. П. Жукаў зазначае, што адны з іх *могуць быць уласцівы агульнанароднай мове, а другія індывідуальныя па сваім паходжанні*[11] і ілюструе гэта прыкладам індывідуальна-аўтарскага варыянта з рамана Г. Нікалаевай. З такой даволі частай з'явай сустракаемся ў творах Лынькова. Усе гэтыя індывідуальна-аўтарскія разнавіднасці фразеалагізмаў можна падзяліць на дзве групы: 1) магчымыя варыянты, не зафіксаваныя ў фразеалагічных слоўніках; 2) аўтарскія варыянты, ужытыя для разнастайнасці маўлення.

Разгледзім спачатку варыянты першай групы. Іх можна лічыць магчымымі лексічнымі разнавіднасцямі па той прычыне, што пераменныя кампаненты ўступаюць у сінанімічныя сувязі або з'яўляюцца падобнымі па семантыцы. Некаторыя фразеалагічныя варыянты сустракаюцца таксама і ў іншых аўтараў, не толькі ў Лынькова. Так, магчымай лексічнай разнавіднасцю агульнаўжывальнага фразеалагізма *на справе* можна лічыць выраз *на дзеле*, які зафіксаваны ў творах Якуба Коласа і Янкі Купалы. Рэдкаўжывальны лексічны варыянт *на скорую руку – на хуткую руку* назіраем ў П. Броўкі, Г. Далідовіча. Сэнсава блізкімі выступаюць дзеясловы *распраўляць – разнімаць* ў фразеалагізмах *распраўляць крылы – разнімаць крылы* (супадаюць у значэннях 'раскрыць што-небудзь самкнутае, сашчэпленае'; 'напружыўшы мышцы, выпрастаць, выцягнуць (часткі цела)'). Лынькоў ужывае таксама *распусціць крылы*. У фразеалагізме *пайсці ў дзела* замяняецца назоўнікавы кампанент – *пайсці ў работу*. Падобную замену маем і ў фразеалагічнай адзінцы *пусціць у дзела – пусціць у работу*. Пісьменнік у большасці выпадкаў нароўні з агульнаўжывальным лексічным варыянтам ужывае магчымыя заменнікі. Напрыклад, фразеалагізм *сэрца сціскаецца*, двойчы выкарыстаны аўтарам у сваёй звычайнай форме, 6 разоў ужываецца ў выглядзе *сэрца сцялася* (дзеясловы *сціснуць* і *сцяць*[2] маюць агульнае значэнне 'здушыць, сцясніць (горла, грудзі))' і 5 разоў у форме прошлага часу *сэрца сціснулася*. Нароўні з фразеалагізмам *дзе гэта відана* Лынькоў тройчы выкарыстоўвае *дзе гэта бачана*. Ёсць выпадкі, дзе аўтар аддае перавагу не агульнаўжывальнаму варыянту, а іншаму – магчымаму. Так, пісьменнік зусім не ўжывае

[11] В. П. Жуков, *Русская фразеология*, с. 177.

